Микола Давидюк



# ЯК ПРАЦУЕ ПУЦІНСКАЯ ПРАПАГАНДА

Микола Давидюк

# ЯК ПРАЦУЕ ПУЦІНСКАЯ ПРАПАГАНДА

На каго разлічаная пуцінская прапаганда і як яна працуе; што такое гібрыдная вайна і як яна звязаная з паняццем «рускага свету» («русского мира»); хто адказвае за прапаганду на тэхнічным узроўні і як менавіта дзейнічае прапагандысцкая журналістыка; хто з'яўляецца хаўруснікам Расіі ў пытаннях ідэалогіі і адкуль варта чакаць небяспекі; нарэшце, ці можна процістаяць інфармацыйнай вайне і якімі метадамі найлепш змагацца з гібрыдным сепаратызмам Крамля. Гэтыя і многія іншыя пытанні падымае ў сваім актуальным даследаванні ўкраінскі палітолаг Мікола Давыдзюк.

У нязмушанай, даступнай форме аўтар дзеліцца сваім досведам супраціву медыйнай прапагандзе, прыводзіць прыклады маніпуляцый свядомасцю, перасцерагае ад таго, як не ператварыцца ў марыянетак у небяспечным тэатры рускай гібрыднай вайны.

Кніга абавязкова спатрэбіцца ўсім, хто не абыякавы да сучаснай сітуацыі ва Украіне і інфармацыйнага поля, у якім жывуць яе грамадзяне, а таксама ўсім, хто цікавіцца палітыкай, не чакаючы, пакуль палітыка зацікавіцца імі.

*Кніга прысвячаецца звычайным героям, невядомым украінцам і прадстаўнікам іншых краін, якія сталі на абарону Украіны ў самы цяжкі момант сучаснай гісторыі, патрыётам, якія, усведамляючы няроўнасць сіл, пайшлі ў бой супраць акупантаў і тэрарыстаў, абараняючы мір, людзей і ўкраінскую дзяржаўнасць.*

*Добраахвотнікам, салдатам, валанцёрам і журналістам.*

*Расіянам, якія ніколі не скажуць «Крым наш» і «ва Украіне грамадзянская вайна», асуджаюць злачынствы рэжыму і ўсім сваім сэрцам імкнуцца да міру.*

# ЗМЕСТ

Прадмова . . . . . 5

Уступ . . . . . 7

**Раздзел І.** Ідэалогія . . . . . 11

Ці планаваў Пуцін нападаць на Украіну? Падрыхтоўка акцый . . . . . 11

Што такое «рускі свет»? . . . . . 14

Гібрыдны сепаратызм Крамля . . . . . 20

Што такое праблемныя тэрыторыі ў складзе постсавецкіх дзяржаў? . . . . . 24

Саюзнікі Пуціна — прадажныя эліты . . . . . 27

Ці працуе «рускі свет» за межамі РФ? Нерускамоўныя прарасійскія лабісты ў ЕС . . . . . 32

Германія, Чэхія і краіны Балтыі — еўрапейскі тэатр расійскай прапаганды? . . . . . 33

Крамлёўскі ўплыў у краінах Балтыі . . . . . 34

Падтрымка палітыкі Пуціна і дзейнасць прарасійскіх палітыкаў у краінах Балтыі . . . . . 36

Чэхія — рэшткі камунізму і крамлёўскага ўплыву . . . . . 38

Мэтавая аўдыторыя «рускага свету» . . . . . 39

**Раздзел ІІ.** Прапаганда . . . . . 41

Прапаганда і медыяманіпуляцыі — аналіз кейсаў . . . . . 41

Хто адказвае за прапаганду на тэхнічным узроўні? . . . . . 43

Хто яны — расійскія СМІ? . . . . . 45

LifeNews — канал вайны? . . . . . 47

Russia Today — міжнародны рупар Пуціна . . . . . 48

На каго разлічана прапаганда? . . . . . 50

Хто такія «гастралёры»? Трансфармацыя інфармацыйных пагроз у рэальныя фізічныя страты . . . . . 51

Хто такія эксперты? Або як усё можна растлумачыць хаця б пастфактум . . . . . 53

Маніпуляцыі ў дзеянні. Прыклад у Германіі. Фэйкавыя навіны — элемент гібрыднай вайны на прыкладзе «дзяўчынкі Лізы» . . . . . 56

Палітычныя шоу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
Інтэрнэт. Якая роля сацыяльных сетак
у падзеях 2014 — 2016 гадоў ва Украіне і Расіі? . . . . . . . . 64
Блакаванне карыстальнікаў у сетцы Facebook
і пошук баевікоў-сепаратыстаў праз сацыяльныя сеткі. . . 66
Фэйкі і боты. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
SMS як альтэрнатыва скінутым з паветра ўлёткам . . . . . . . . . 71
Праблема мабільных апаратараў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73

**Раздзел III.** Супрацьстаянне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75
Рэакцыя Украіны на расійскую прапаганду . . . . . . . . . . . . . . 77
Добраахвотніцкія батальёны
як своечасовая альтэрнатыва арміі. . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
Уздым духу праз інфармацыйныя акцыі. . . . . . . . . . . . . . . . 82
Стварэнне валанцёрскага руху . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
Хакеры і свабодныя інфармацыйныя платформы . . . . . . . . . . 87
OSINT і грамадзянская медыяактыўнасць . . . . . . . . . . . . . . . 89
InformNapalm. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
Bellingcat . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
Stopfake.org . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
Тэлевізійнае супрацьстаянне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Байкатаванне тавараў і паслуг агрэсара . . . . . . . . . . . . . . . . 99
Дэкамунізацыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
Пра важнасць дзяржаўнай самаідэнтыфікацыі
насельніцтва і мясцовых эліт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107

Аўтарскі слоўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109

Падзяка. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112

Пра аўтара . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113

# ПРАДМОВА

Я пісаў гэтую кнігу не толькі для ўкраінцаў, але і для беларусаў, казахаў, армян, азербайджанцаў, кіргізаў, туркменаў і ўсіх сяброў Украіны, з якімі мы былі ў Савецкім Саюзе і з якімі нам разам пратоптваць агульны еўрапейскі шлях каштоўнасцяў, тварыць гісторыю паспяховых незалежных дзяржаў. Мы вельмі цяжка праходзім вызваленне ад савецкасці і перыяд пуцінскай агрэсіі, з якой вам працей будзе змагацца, маючы досвед украінскіх нацыянальных перамог — перадусім над сабой. Гэтую кнігу я пісаў таксама для палякаў, эстонцаў, літоўцаў, латышоў, фінаў, нарвежцаў, датчан і шведаў — усіх нашых паўночных сяброў, якім, гэтак жа як і нам, хацелася б мець узаемавыгадныя адносіны з Расіяй, а не шукаць магчымасці для абароны ад «крамлёўскага мядзведзя».

На жаль, Украіна не змагла і не паспела цалкам пераняць грузінскі досвед процістаяння акупацыі расійскіх войскаў у 2008 годзе, з-за чаго панесла вялікія страты і не змагла адэкватна супрацьстаяць акупацыі Крыма. На жаль, Украіна не зрабіла патрэбных і карысных высноў з фінскай вайны, калі частка еўрапейскай тэрыторыі таксама была заваяваная імперыяй. Як палітолаг, як чалавек, які мае кандыдацкую ступень, працуе ў сферы медыя і палітыкі, я вырашыў сабраць і прааналізаваць найбольш значныя факты інфармацыйных маніпуляцый і прапаганды.

Бо неабходна не толькі паказаць інструментарый ворага, але і прадэманстраваць тое, што яму можна супрацьстаяць, менавіта таму фінальная частка кнігі — гэта паспяховыя гісторыі процідзеяння.

Наш досвед не з'яўляецца ўсёабдымным або эксклюзіўным, а хутчэй персаніфікаваным, але ад таго не менш карысным. Праца напісана на аснове рэальных практычных кейсаў, аналізу фактаў, падзей, маніпуляцый і супрацьстаяння. Кніга мае чыста асветніцкую мэту: стварыць поле для аналізу і разважанняў, даць інфармацыю для разумення падзей, якія адбыліся і працягваюцца дагэтуль.

Задача працы — даказаць, што можна змагацца супраць імперыі і яе грознай арміі, што машыну прапаганды можна перамагчы. Але не яе метадамі. Бо імперскім амбіцыям варта супрацьпастаўляць патрыятызм і самааддачу, прапагандзе — праўду і сумленную журналістыку, тэрарыстам і наймітам — добраахвотнікаў і валанцёраў. На полі бою ваююць не машыны, а людзі. Прапаганду ствараюць не камп'ютары, а грошы ад здабычы нафты і газу маюць уласцівасць вычэрпвацца.

Звярну вашу ўвагу, што ў кнізе няма гатовых кейсаў адносна будучага процістаяння пуцінскай Расіі, яе сатэлітам або любым іншым ворагам, якія могуць пагражаць мірнаму жыццю. Кніга больш пра тое, што трэба быць гатовым рэагаваць на ўсе магчымыя праявы агрэсіі — ад танкаў і цяжкага ўзбраення да процістаяння ў сацыяльных сетках, СМІ і на блогавых платформах. Гісторыі нападу і паспяховага супрацьстаяння з'яўляюцца ўнікальнымі і адказваюць на выклікі свайго часу і месца, іх не заўсёды можна лёгка скапіраваць і прайграць у іншых месцах.

Кніга больш пра тое, што варта інвеставаць у разумнае і абараназдольнае насельніцтва, а не будаваць умоўную крэпасць або фартыфікацыйную сцяну, якая ўжо лічыцца састарэлай у дзень старту будаўніцтва. Развіццё ваенных і інфармацыйных тэхналогій настолькі імклівае, што сёння трэба рэагаваць на выклікі заўтрашняга дня, таму прадказаць або спрагназаваць канкрэтныя кейсы немагчыма. Але падрыхтаваць базіс для процістаяння можна. Варта ведаць досвед таго, як Украіна супрацьстаяла прарасійскім тэрарыстам і сепаратыстам, каб не паўтараць нашых памылак, выкарыстоўваць толькі найлепшыя практыкі і быць больш моцнымі і падрыхтаванымі, чым мы ў 2014 годзе падчас раптоўнай інтэрвенцыі расійскіх войскаў у сонечны Крым і мірны Данбас.

# УСТУП

*Масква, аэрапорт Шарамецьцева.*
*2015 год*

Рыхтавацца да тэлевізійнага эфіру ў Маскве я пачаў за тры дні: сустракаўся з журналістамі, блогерамі, работнікамі медыясферы і палітолагамі. Я ведаў, што нельга схібіць, бо калі ехаць, то толькі па ідэалагічную перамогу! Я не рамантык і разумеў, што такое крамлёўскі абсурд, што такое прапаганда і з чым яе падаюць. Я назбіраў мноства фотафактаў, таму што разумеў, што словамі там нікога не пераканаць.

Я планаваў данесці свае мэсэджы аб тым, што:

• уяўная Наваросія — гэта не паўднёвы ўсход Украіны да Чорнага мора, а толькі па два-тры раёны ў Данецкай і Луганскай абласцях;

• закон аб дэкамунізацыі — гэта гісторыя пра аб'яднанне краіны і пра справядлівасць, а не забарона медалёў для ветэранаў;

• рэформы пачаліся, і ўжо праз год мэсэджы кшталту «Што там у хахлоў?» зменяцца на «Ну як там у іх у Еўропе?»;

• ці не здаецца расіянам, што «рускі свет» праваліўся, калі за яго бураты пачалі забіваць праваслаўных украінцаў на ўсходзе.

А яшчэ я ведаў, што спытаюць, дзе ваяваў мой дзед (ёсць у Расіі такая маніпуляцыя), каб паказаць, што мы няўдзячныя нашчадкі (калі дзед ваяваў за савецкую армію) або фашысты, калі сваякі ваявалі за Украінскую паўстанцкую армію. Але мае дзяды, дакладней прадзеды, ведалі пра магчымасць такога пытання, і таму адзін з іх быў ва УПА, а другі — у Чырвонай Арміі. І для мяне заўсёды было важным казаць пра гэта і аб'ядноўваць людзей з розных частак Украіны.

Я шмат размаўляў з нашымі вайскоўцамі з усходу Украіны і перачытаў усе блогі і артыкулы. Выпісаў усе ідэалагічныя фішкі Крамля.

Эфір быў напружаным, маніпулятыўным, вельмі эмацыйным і доўжыўся каля пяці гадзін. Хоць ім для відэа трэба рэальна хвілін 40 на кожную серыю. Здымалі толькі дзве. Тады я яшчэ не разумеў, навошта такі запас метра...

Пасля эфіру я пакідаў студыю вясёлы і задаволены, бо, як мне тады здавалася, усё прайшло выдатна. Мы данеслі правільныя мэсэджы, адстаялі праўкраінскую пазіцыю, прадэманстравалі факты прысутнасці расійскіх войскаў. Мой добры настрой заўважыў рэдактар і даволі нахабна заявіў: «Не радуйцеся, гэта наша шоу, як захочам, так і нарэжам». І толькі пасля я зразумеў, што ён меў на ўвазе: паказаны ў тэлевізары матэрыял не меў з адзнятым практычна нічога супольнага.

Я ішоў на Мясніцкую набярэжную, да месца забойства Барыса Нямцова. Чалавека, які быў сапраўдным расіянінам і адначасова сябрам Украіны, а не постсавецкім мадэрністам і ўкраінафобам, як гэта сёння прынята ў Маскве. Увогуле, увесь горад быў залеплены георгіеўскімі стужкамі — ад аэрапорта да пераходаў, ад дэпутатаў і да бамжоў на ўскраінах. Нейкі татальны парад смерці і абсурду. І гэта яшчэ больш нагнятала адчуванне паралельнай рэальнасці.

Доўга затрымлівацца і гуляць па Маскве я не меў жадання, бо мне гэта было неяк непрыемна, да таго ж, хацелася ўсё ж хутчэй прайсці мытны кантроль. З-за сказанага і заяўленага заставацца там я адназначна не хацеў.

Ужо ў аэрапорце, чакаючы свой самалёт, я прачытаў пост прэс-сакратаркі аднаго з галоўных апазіцыянераў РФ Аляксея Навальнага, Ганны Вядуты, якая ў сваім Facebook зарэпосціла Надзю Талаконнікаву, актывістку апазіцыйнага руху Pussy Riot, і гэта яшчэ больш дапоўніла ўбачаную расійскую карцінку:

(*) Хіба я магла падумаць у 2008 годзе, што пуцінскі ідэалагічны апарат развернецца на 180 градусаў і зменіць дэманстратыўную дэпалітызацыю, усвядомленую шэрасць «стабільнасці», знешне невыразны «план Пуціна» (пра які ніхто не ведае нічога, акрамя таго, што ён калісьці існаваў) на агрэсіўную, прапагандысцкую, мабілізацыйную палітыку?

Пуцін доўга размінаўся. Ён падбіраў ідэалогію, гуляў з канцэптамі. Спярша ўзяў рэлігію, разыграў карту Pussy Riot, зрабіў патрыярха Кірыла хэдлайнерам усіх ТБ-праграм 2012 года. Далей разыгрывалася спартыўная карта — Алімпіяда, або, калі заўгодна, «Алімпія» (1938, Лені Рыфеншталь). Цяпер вось — «рускі свет», «руская вясна», «нацыянал-здраднікі», «пятая калона»

і добраахвотная ізаляцыя. Я не ведаю, як усё гэта ўспрымаць, калі нават мая свядомасць, згвалтаваная і выпрабаваная абсурдам расійскай калоніі, адмаўляецца прымаць такую рэальнасць[1].

Там, у аэрапорце, я зразумеў тры рэчы:

• Страшнейшы за Пуціна, які сам сябе знішчыць, — рэванш маскоўскіх рэгіяналаў-януковічаў і нашы ўнутраныя звады, якія мы тут разводзім.

• Бяздзейнасць: мы нікога не пакаралі за злачынствы супраць Майдану, за трагічныя майскія дні ў Адэсе, за так званыя самагубствы рэгіяналаў. А гэта пажыва для рэваншыстаў.

• Заказчыкі і выканаўцы вядомыя, але ніхто нічога не кажа, ніхто нічога не робіць, кіеўская палітычная тусоўка думае, што ўсё так і застанецца, без канкурэнцыі, такі сабе пячэрскі міжсабойчык.

Не, сябры, рэгіяналаўскае кодла рыхтуе пераварот. У іх з'явілася «мы», якое ўжо не ідэнтыфікуе сябе з Партыяй рэгіёнаў, «Януковіч ім здрадзіў», яны ўсе ахвяры і чакаюць рэваншу. Вядома, пакуль што яны далей за Рублёўку і Садовае ў Маскве не сунуцца. Але воўчая зграя чакае зручнага моманту.

І грош нам цана, калі пасля Майдану, пасля дзясяткаў тысяч смярцей на ўсходзе Украіны здамо нашу краіну назад у рукі прарасійскіх пуцiністаў, якія будуць помсціць украінцам за сваю палітычную эміграцыю і скінуты рэжым Януковіча.

Занадта эмацыйна, але для сябе вырашыў, што, хоць я і раней дапамагаў хлопцам з АТА, з гэтага часу буду рабіць гэта ў дзесяць разоў больш. Калі я і крытыкаваў уладу за бяздзейнасць, то я буду рабіць гэта ў сто разоў больш актыўна. І калі я любіў сваю краіну і абараняў яе, то буду рабіць гэта ў мільён разоў мацней.

У нас няма варыянтаў для адступлення і шанцу на паразу, у нас адзін шлях — перамога. Нягледзячы на глабальныя планы, жаданні дыктатара Пуціна і ўнутраных здраднікаў, мы вымушаныя вырвацца з гэтай дэпрэсіўнай зоны і стаць багатай, шчаслівай, прававой краінай. Інакш — вечнае рабства і ярмо. Як было напісана на Мясніцкай набярэжнай: «Борись!».

Самалёт сеў у Барыспалі, і гэта было, напэўна, самае шчаслівае вяртанне дадому.

---

[1] Тут і далей цытаты з рускай мовы перакладзены на беларускую. Маркіроўка цытаты (*) — на пачатку цытаты.

Праз год пасля публікацыі гэтага тэксту ў сваім профілі Facebook і вяртання са здымак тэлеперадачы я вырашыў напісаць кнігу, якая змагла б перадаць убачаныя і прааналізаваныя мной кейсы інфармацыйных маніпуляцый Крамля, а таксама паказаць гісторыі паспяховага процістаяння вайсковай і інфармацыйнай агрэсіі.

Гісторыі перамогі, калі грамадзяне ў адзіночку ці разам давалі адпор агрэсару, не адмаўляючыся ад рабочых будняў, не прыпыняючы выхавання дзяцей і догляду бацькоў.

Веру і ведаю, што ў гэтых рэальных героях нашага штодзённага жыцця вы пазнаеце і сябе.

Аналізуйце і натхняйцеся!

# РАЗДЗЕЛ І. ІДЭАЛОГІЯ

## Ці планаваў Пуцін нападаць на Украіну? Падрыхтоўка акцый

Многія лічаць, што рэакцыя Пуціна ў выглядзе анексіі Крыма, эмацыйная і спантанная, абумоўлена глыбокім адчаем ад падзей, якія адбываліся ва Украіне ў пачатку 2014 года. Вядома, так думаць наіўна, бо вельмі сумнеўна, што для такога чалавека ўласцівыя падобныя пачуцці. Да таго ж, Расія даўно планавала акупацыю часткі Украіны ў выпадку страты татальнага кантролю над дзяржавай. Гэта пацвярджаецца вельмі многімі фактамі.

«У красавіку 2008 года падчас Бухарэсцкага саміту НАТО У. Пуцін заявіў прэзідэнту ЗША Дж. Бушу: "Украіна — гэта наогул не дзяржава. Частка яе тэрыторый — гэта Усходняя Еўропа, а частка, і значная, падораная намі... Калі Украіна пойдзе ў НАТО, то сыдзе без Крыма і ўсходу — яна проста распадзецца". Такія ўяўленні сталі асновай стратэгічнага бачання задач РФ на новым этапе экспансіі, што, імаверна, было сфармулявана на сумесным пасяджэнні Рады Бяспекі і Дзяржаўнага Савета РФ 25 снежня 2008 года», — Уладзімір Гарбулін, дырэктар Нацыянальнага інстытута стратэгічных даследаванняў Украіны, у сваім артыкуле на другую гадавіну расійскай агрэсіі[2].

Зразумела, што інфармацыя, прадстаўленая У. Гарбуліным, з'яўляецца закрытай, але яе вельмі лёгка праверыць па публічных рэтранслятарах думак Крамля — тэлевізійных шоу, якія тады працавалі менавіта ў рамках вышэйзгаданых ідэалагічных меркаванняў. Гэта і міф пра расколатасць Украіны, і расійская агрэсія ў Крыме ды на ўсходзе Украіны, і расійскі капітал, які прыйшоў ва Украіну не грошы зарабляць, а правіць палітычны баль[3].

І найлепшым пацвярджэннем можа стаць дакумент, апублікаваны 24 лютага 2015 года выданнем «Новая газета» (Масква), — план адчужэння ўсходніх абласцей Украіны. Верагод-

---

[2] http://texty.org.ua/pg/news/textynewseditor/read/65583/Gorbulin_dokladno_proanalizuvavJak_Rosija_rokamy_gotuvalasa

[3] https://www.youtube.com/watch?v=fiЮmJDxOQ

ным аўтарам выданне называе праваслаўнага бізнэсмена Канстанціна Малафеева, адрасатам — Адміністрацыю прэзідэнта Расійскай Федэрацыі. Газета лічыць, што дакумент быў пакладзены на стол Уладзіміру Пуціну ў перыяд паміж 4 і 12 лютага 2014 года. Гэта значыць, калі прэзідэнтам Украіны яшчэ быў Віктар Януковіч, стаўленік Масквы.

У дакуменце выразна апісаныя ўсе прагматычныя перавагі Крамля ў выпадку акупацыі тэрыторыі, ідэалагічныя перамогі і палітычныя бонусы[4].

Палітыка Крамля вядомая сваёй паслядоўнасцю. Заўсёды ўсё плануецца, пішуцца папкі з перспектыўнымі планамі, узгадняюцца, пераўзгадняюцца і зацвярджаюцца.

Дыскрэдытацыя перад нападам — усе напады спланаваныя, каб потым не было пачуцця віны перад сваім насельніцтвам, якое не любіць сюрпрызаў, а асабліва — калі яны выходзяць за рамкі чаканняў і традыцыйных сцэнарыяў.

Украінскі журналіст Ігар Салавей, які працаваў некалькі гадоў у Маскве ўласным карэспандэнтам «Укрінфарма», а цяпер у Кіеве ўзначальвае міжнародны аддзел інтэрнэт-выдання «Левы бераг» (LB.ua), распавядае, што Крэмль перад нанясеннем удару па нейкім з аб’ектаў звычайна загадзя пачынае «чорную кампанію» па дыскрэдытацыі сваёй мішэні. Так бы мовіць, легітымізуе далейшыя дзеянні супраць будучай ахвяры. І няма розніцы, ці гэта краіна, на якую было вырашана напасці, ці нафтавая кампанія, якую плануецца перадаць іншым уладальнікам. Сцэнары падобныя. Ствараецца простая і лагічная канструкцыя: своечасовая дыскрэдытацыя, удар і фармаванне правільнай думкі грамадскасці, напрыклад, што ўлада змагаецца супраць зла, аднаўляе справядлівасць і абараняе саміх расіян.

Калі прааналізаваць напад на Украіну, то, акрамя гэтага, можна заўважыць шырокамаштабныя кампаніі з разыгрываннем фашызму на тэрыторыі Украіны, фінансаванне ультраправых нацыяналістычных рухаў, правакацыйныя акцыі, газавую вайну, шэраг гандлёвых войнаў, закрыццё расійскага рынку для ўкраінскіх прадуктаў і магутнае медыйнае суправаджэнне. Вобразнага ўкраінца ператваралі ў «бяздумнага нацыяналіста», «фашыста»,

---

[4] http://www.novayagazeta.ru/politics/67389.html

«забойцу» і «русафоба». Ужо падчас расійскай інтэрвенцыі для апісання ўкраінскай улады, салдат-абаронцаў і добраахвотнікаў былі ўзятыя з палітычнага эпасу, а потым шырока выкарыстаныя ў СМІ такія вобразы: «хунта», «карнікі», «укропы». У ходзе самой ваеннай кампаніі ў медыя неаднаразова трапляліся загалоўкі накшталт:

• «А. Яцанюк (XV прэм'ер-міністр Украіны) ваяваў у Чачні і ўдзельнічаў у катаваннях і расстрэлах расійскіх ваеннапалонных»;

• «П'янага П. Парашэнку (V прэзідэнт Украіны), які рваўся да Пуціна, знялі з рэйса "Кіеў – Масква"»;

• «Тысячы ўкраінцаў радуюцца крушэнню самалёта з расіянамі ў Егіпце»;

• «Камбат "Дняпра-1" у эфіры ўкраінскага ТБ прызнаўся, як стаў фашыстам»;

• «Хлопчыка накалолі наркотыкамі і зрабілі мішэнню для ракет»;

• «Узялі 3-гадовага хлопчыка, як Ісуса, укрыжавалі на дошцы аб'яў, прымусіўшы маму дзіцяці глядзець, як яе дзіця сцякае крывёю»;

• «Кіраўнік СБУ асабіста кіраваў вызваленнем магчымага арганізатара тэракта ў Турцыі».

Падобныя сцэнарыі, якія папярэднічаюць інфармацыйнаму ўдару, можна прасачыць і ў самой Расіі на прыкладзе палітыкі, бізнэсу або нават чыноўніцкага быцця.

Стварыўшы негатыўны вобраз мішэні, вельмі лёгка апраўдаць агрэсію ў адносінах да яе. Бо ў самім грамадстве ўзнікае запыт на падзею, пакаранне і ўстанаўленне справядлівасці. Такім чынам, улада працуе ў межах грамадскіх чаканняў, якія, праўда, сама ж і фармуе. Але пераважная большасць насельніцтва гэтага не разумее і зразумець не спрабуе, бо нашмат камфортней жыць у свеце, дзе ўсё адбываецца ў рамках вядомых, зразумелых сцэнарыяў, дзе не трэба прымаць важных рашэнняў, — тыповае патрыярхальнае мысленне, якое ў сілу гістарычных падзей і ўзроўню развіцця краіны вельмі папулярнае ў Расіі. Што і выкарыстоўвае палітычнае кіраўніцтва.

І калі Пуцін зразумеў, што губляе кантроль над Украінай з-за свайго палітычнага васала Януковіча, ён прыняў рашэнне дзей-

нічаць паводле даўно падрыхтаваных планаў: разлом Украіны і акупацыя яе паўднёва-ўсходняй часткі. Адзінай яго памылкай была пераацэнка сваіх магчымасцяў, згуртаванасць украінскага насельніцтва ў процістаянні ворагу, наяўнасць грамадзянскай альтэрнатывы развалена на той час арміі і адзінства міжнароднай супольнасці ў процістаянні агрэсару. Але пра ўсё па парадку. Пачнём з афіцыйнай ідэалогіі.

## Што такое «рускі свет»?

*(*) Рускі свет — гэта праваслаўны ІДІЛ.*
*В. Гарбулін*

Пасля развалу Савецкага Саюза і старту дэмакратычнага хаосу, які запанаваў у Расіі і спрыяў зараджэнню алігархату, да ўлады на змену ўжо немаладому і трохі хвораму Барысу Ельцыну прыйшоў чэкіст з Пецярбурга Уладзімір Пуцін. Да таго ж, прыйшоў не сам, а пры садзейнічанні алігархічных груп і асабліва — Барыса Беразоўскага, які пасля стане найбуйнейшым публічным ворагам Пуціна і загіне пры загадкавых абставінах у выгнанні ў Лондане.

Пуцін, прыйшоўшы да ўлады, адразу ж ператасаваў усе карты і алігархічныя расклады, пачаўшы прыгнятаць СМІ і маніпуляваць тэрактамі, якія выгадна адцягвалі ўвагу насельніцтва ад эканомікі і галечы, выклікалі страх і жаданне мець абарону. Гэта ўдала ссоўвала акцэнты і падавала маладога палітыка ў «правільным» святле.

Аналітыкі, якія вывучалі псіхалогію і псіхатып Пуціна, адзначаюць, што Уладзімір Уладзіміравіч вельмі сентыментальна ставіцца да Савецкага Саюза. Аднойчы нават публічна заявіў, што яго развал — гэта найвялікшая трагедыя XX стагоддзя. Сем'і мільёнаў зняволеных, якія загінулі ў канцлагерах Сібіры, маюць зусім іншае меркаванне. Але працягнем пра Пуціна, які, атрымаўшы кіраўніцтва разваленай імперыяй, марыў яе рэанімаваць. Уласна, крамлёўскія ідэолагі, акрамя працы на ўнутраны палітычны рынак, павінны былі займацца пошукам правільнай і патрэбнай ідэалогіі, якая дапамагла б пашырыць экспансію імперыі, адрадзіць, так бы мовіць, даўнюю славу.

Такой ідэалогіяй стала ідэалогія «рускага свету» — «русского мира», якая перамагла ў нефармальнай бітве з іншымі распрацоўкамі, прапанаванымі палітолагамі, тэарэтыкамі, гісторыкамі, філосафамі і работнікамі спецслужбаў і Адміністрацыі прэзідэнта.

(*) Рускі свет (русский мир) — канцэпцыя міжнароднай трансдзяржаўнай і транскантынентальнай супольнасці, аб'яднанай прыналежнасцю да Расіі і прыхільнасцю да рускай мовы і культуры. На думку прыхільнікаў канцэпцыі, слова «русский» у назве паказвае на гістарычныя карані супольнасці, якая бярэ пачатак у Старажытнай Русі, а слова «мир» выкарыстана ў значэнні «ўвесь свет», «усе людзі».

Гэта вызначэнне «рускага свету» са свабоднай энцыклапедыі Вікіпедыя, напэўна, самае незаангажаванае і непалітызаванае з усіх, на якія вы можаце натрапіць у рускай літаратуры або ў друку. Напрыклад:

(*) На думку В. А. Цішкова, «рускі свет» — гэта ўнікальны феномен глабальнага маштабу, і такія «светы» маюць, акрамя Расіі, толькі Іспанія, Партугалія, Францыя, Кітай, а таксама Вялікабрытанія разам з Ірландыяй.

Ці менш эмацыйнае, аднак не менш ідэалагічнае:

(*) На думку А. М. Батанавай, паняцце «рускі свет» выкарыстоўваюць для абазначэння цывілізацыйнай, сацыякультурнай і аднацыянальнай прасторы, якая ахоплівае каля траціны мільярда рускамоўных людзей, ці амаль кожнага дваццатага жыхара планеты, якія маюць духоўныя і ментальныя прыкметы рускасці і не абыякавыя да лёсу і месца Расіі ў свеце. На думку навукоўцы, расце разуменне таго, што выкарыстанне гуманітарнага патэнцыялу «рускага свету» можа дапамагчы ва ўмацаванні этнакультурнай самабытнасці расійскага суперэтнасу і захаванні расійскай геапалітычнай і культурнай прасторы[5].

Да прасторы «рускага свету» адносяць Украіну, Расію і Беларусь. Гэтую ідэалогію прасоўвае спецыяльна створаны ў 2007 годзе аднайменны фонд, які цяпер працуе ў 45 краінах. Праз комплекс уласных праектаў ён папулярызуе рускую мову і культуру.

---

[5] https://ru.wikipedia.org/wiki/Русский_мир

Ідэалагічную аснову палітыкі «рускага свету», на думку паліттэхнолага Дзяніса Богуша, складае менавіта руская мова і галівудскія вобразы Расіі (гарэлка, аўтамат Калашнікава, матрошка, «руская душа»). Думку Д. Богуша дапаўняе палітолаг Вадзім Карасёў, які сцвярджае, што не менш важную ролю адыгрывае рэлігія, бо менавіта праваслаўе дапамагае распаўсюджваць частку ідэй і ідэалогіі ў цэлым за рамкі краін-носьбітаў рускай мовы: Грэцыі, Чарнагорыі, Сербіі, Сірыі і інш.

На маю думку, «рускі свет» заснаваны на рэштках ідэалагічных канструкцый, засвоеных Пуціным і добра вывучаных у эпоху СССР, калі ён быў кадэбістам. Гэта значыць, на старыя агентурныя сеткі спусцілі новыя тэмнікі, новыя мэсэджы і новую ідэалогію, а замест развіцця сеткі нацыянальных камуністычных партый заклікалі падкупляць нацыяналістычныя праекты ва ўсім свеце, а асабліва ў Еўропе, дзе на сённяшні дзень і адбываецца асноўны тэатр ідэалагічнай барацьбы. Агрэсія і ваенныя дзеянні перамешчаныя за межы ЕС у Сірыю і Украіну.

Але «рускі свет» не прадугледжвае бытавой ідэалогіі, таму на гэтым узроўні часцей за ўсё выкарыстоўваюць настальгію па СССР як асноўны прагматычны аргумент: маўляў, менавіта новая версія дапаможа вярнуцца ў найлепшыя часы Савецкага Саюза. Гэта значыць, прабелы ў ідэалогіі проста замянілі на сантыменты, блізкія частцы насельніцтва, удала выкарыстаўшы сацыялагічныя даследаванні аб чаканнях электарату.

Што да важнасці рэлігіі ў канструкцыі праваслаўнага свету, то, паводле ацэнак некаторых экспертаў, колькасць праваслаўных у Расіі меншая, чым ва Украіне, калі браць пад увагу Кіеўскі і Маскоўскі патрыярхаты Украінскай праваслаўнай царквы разам. Менавіта таму Масква спрабуе не дапусціць стварэння адзінай памеснай царквы (тады ідэалогія «рускага свету» цярпіць крах) або абапірацца толькі на моўны фактар. Бо, з пункту гледжання рэлігіі, у гэтай ідэалогіі мноства прабелаў. Напрыклад, тое, што Русь хрысцілі ў Кіеве, самыя вялікія святыні знаходзяцца ў Кіеве, Пячэрская лаўра — таксама ў Кіеве. Гісторыя на баку Украіны, але гісторыю перапісвалі і перапісваюць, спрабуючы аддаць перавагу Маскве.

Улетку 2016 года Масква нават паспрабавала зрабіць свой рэлігійны дэсант, умацаваць апошні бастыён крамлёўскага ўплыву на масы ва Украіне. Яна ініцыявала так званы хрэсны ход вернікаў УПЦ Маскоўскага патрыярхату на сталіцу Украіны. Дарэчы, рэлігійная акупацыя была адной з тэм ужо згаданага дакладу Канстанціна Малафеева ў Адміністрацыі прэзідэнта РФ, калі той спрабаваў пераканаць найвышэйшае палітычнае кіраўніцтва ў рацыянальнасці і важнасці анексіі Крыма і акупацыі ўсходу Украіны:

(*) Безумоўна, гэта адаб'ецца на макраэканамічнай стабільнасці і перспектыве росту яе эканомікі. Аднак з геапалітычнага пункту гледжання выйгрыш будзе неацэнным: наша краіна атрымае доступ да новых дэмаграфічных рэсурсаў, у яе будуць высокакваліфікаваныя кадры прамысловасці і транспарту. Акрамя таго, яна зможа разлічваць на з'яўленне новага славянскага міграцыйнага патоку, накіраванага з захаду на ўсход — у процівагу цэнтральнаазіяцкаму міграцыйнаму трэнду. Прамысловы патэнцыял усходняй Украіны, у тым ліку ваенна-прамысловы сектар, які ўваходзіць у ВПК Расіі, дазволіць больш паспяхова і хутка рэалізаваць праграму пераўзбраення ВС РФ.

Што не менш важна, канструктыўны, «згладжвальны» ўдзел Расіі ў працэсе высокаімавернай дэзынтэграцыі ўкраінскай дзяржавы не толькі зможа надаць новы імпульс інтэграцыйным праектам Крамля, але і дапаможа нашай краіне захаваць... кантроль над газатранспартнай сістэмай Украіны. А таксама — істотна змяніць геапалітычную сітуацыю ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, вярнуўшы тут Расіі адну з галоўных роляў[6].

Афіцыйная статыстыка замоўчвае, але ў РФ ёсць праблемы неадпаведнасці ідэалогіі асноўнаму палітычнаму курсу, рэальнай сітуацыі ў краіне. І міграцыйныя патокі з Азіі — яркае пацвярджэнне гэтаму. Таму Расіі, каб не страціць свайго славянскага аблічча, трэба арганізоўваць, па словах К. Малафеева, міграцыйныя патокі.

Што ж тычыцца мовы, то тут сітуацыя трохі іншая. Савецкі Саюз укладваў велізарныя сродкі ў русіфікацыю рэспублік,

---

[6] http://www.novayagazeta.ru/politics/67389.html

у стварэнне рускамоўнай і рускай культурнай прасторы. Вельмі часта яна называлася савецкай, але ў аснове ляжала парадыгма так званай тытульнай нацыі бальшавіцкай імперыі — рускай. Тая экспансія рускай мовы не абмяжоўвалася брацкімі савецкімі рэспублікамі. Напрыклад, большасць датацыйных краін, якія атрымлівалі рэсурсы на развіццё камунізму, адпраўлялі сваю моладзь у Маскву ў партыйную школу або на навучанне ў профільныя галіновыя навучальныя ўстановы, дзе навучанне адбывалася, вядома ж, на рускай мове. І гэта таксама спрыяла распаўсюджванню мовы.

Расія старанна спрабавала падтрымліваць старыя дасягненні, ствараючы сваё інфармацыйнае поле, якое распаўсюдзілася фактычна на ўсе савецкія рэспублікі. Выходзілі ў свет кнігі, адкрываліся кнігарні, максімальна папулярызаваўся рускамоўны шоу-бізнэс. Са слоў кіеўскага паліттэхнолага Дзяніса Богуша, за час прэзідэнцтва Пуціна было знята каля 5 тыс. рускамоўных серыялаў, якія прапагандавалі асноўныя прынцыпы «рускага свету», «правільныя» прататыпы герояў, дыктавалі патрэбныя паводзіны і стваралі адпаведны светапогляд. Усё гэта давала свае вынікі, у прыватнасці, распаўсюджвала палітычны ўплыў на тэрыторыі постсавецкіх рэспублік.

Але, як трапна заўважыў Каха Бендукідзэ, пачаўшы агрэсію супраць Грузіі, Расія страціла мільярды долараў, бо насаджэнне рускай мовы як мовы аб’яднання народаў пацярпела фіяска, а сам вобраз Расіі пачаў асацыявацца з вобразам агрэсара, каланіста і акупанта.

Але тым не менш. Прыдуманая Пуціным ідэалогія пра абарону рускамоўных ва ўсім свеце і заканадаўчая база, якая была падагнаная пад яе, на яго думку, дае яму права на агрэсію ў розных краінах свету.

Можна сказаць, што аснова «рускага свету» — гэта мікс рускай мовы, праваслаўя, рэшткаў левай ідэалогіі Савецкага Саюза і жадання адрадзіць старую імперыю. Ну і канечне, мара Пуціна — увайсці ў гісторыю Расіі заваёўнікам. І няважна, што ён дасягае яе, прыкрываючыся ядзернай зброяй і ігнаруючы нормы міжнароднага права, анексуючы тэрыторыі суседзяў і парушаючы паветраную прастору. Рэжым Пуціна вядзе інфармацый-

ную вайну, перыядычна ссоўваючы акцэнты ў сваёй ідэалогіі «рускага свету», аддаючы перавагу патрэбным элементам у адпаведнасці з сацыяльным статусам аўдыторыі, лакацыі і геапалітычных абставін.

З іншага боку, ідэалогія зусім не адпавядае дзеянням Пуціна ў тыя моманты, калі ён пагражае Усходняй Еўропе, знаходзячыся ў Фінляндыі, або калі ён пагражае спыніць пашырэнне НАТО. З-за гэтага «рускі свет» складана назваць ідэалогіяй, гэта больш падобна да апраўдання ўласнай агрэсіі і імперскіх рэваншысцкіх амбіцый. А сама ідэалогія больш падобная да хамелеона, які змяняе колер у залежнасці ад таго, дзе знаходзіцца.

Непрыманне «рускага свету» прасочваецца не толькі ва Украіне ці Грузіі, краінах, якія падвергліся агрэсіі Крамля, але і ў «балтыйскай тройцы» або скандынаўскіх краінах, над якімі навісае крамлёўская пагроза. Гэтая тэндэнцыя прыкметная таксама ў Беларусі, найбліжэйшай партнёрскай дзяржаве Пуціна. Яе прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў у звароце да парламента:

(*) Рускі свет — гэта не пра нас. Мы «рускія людзі», але гэта не значыць, што мы расіяне. Мы — беларусы. Дазвольце нам мець свой погляд на свет.

Гэта сведчыць аб тым, што краіна і яе палітычнае кіраўніцтва адчуваюць не проста небяспеку ад «рускага свету», а рэальную пагрозу. Прыклады гэтага яны ўбачылі на ўсходзе Украіны ў выглядзе арганізаванага Масквой тэрарызму і сепаратызму. Да таго ж, у неафіцыйных размовах беларускія вайскоўцы сцвярджаюць, што сёння ў штабах разглядаюць адразу два цэнтры варожага наступу: НАТО і РФ. Хоць яшчэ некалькі гадоў таму галоўным ідэалагічным ворагам і суб’ектам ваеннай пагрозы быў толькі Паўночнаатлантычны саюз.

Відавочна, рэальная ідэалогія Пуціна — гэта не «рускі свет», які працаваў як адказ Захаду на першых этапах інтэрвенцый. Цяпер ідэалогія Пуціна — гэта захоп тэрыторый і аднаўленне былых межаў СССР, Расійскай імперыі, а таксама вяртанне ваеннай міфічнай «велічы Расіі», нават цаной збяднення свайго насельніцтва і тэхнічнай адсталасці эканомікі. Таму гэта пагроза не толькі для былых савецкіх рэспублік, але і для іншых

тэрыторый, якія гістарычна былі звязаны з Расійскай імперыяй або Савецкім Саюзам.

Захоп тэрыторый у пэўнай ступені сакралізаваў вобраз Пуціна, ператварыўшы яго з прэзідэнта-цара ў імператара, які разважае і дзейнічае ў глабальных маштабах.

## Гібрыдны сепаратызм Крамля

Расія дастаткова ўмела маніпулюе прывідамі мінулага, каб не адпусціць былыя савецкія рэспублікі ў незалежную будучыню, у свабоднае эканамічнае плаванне, планаванне бяспекі. Масква загадзя штучна падагравала рэгіянальныя і міжэтнічныя канфлікты ў нацыянальных дзяржавах, былых рэспубліках і ўдала імі маніпулюе, заяўляючы, што спрабуе абараняць рускамоўнае насельніцтва і «рускі свет».

Для многіх падзеі ў Крыме, Асеціі і Прыднястроўі не сталі нечаканасцю, да таго ж, многія пракрамлёўскія палітолагі казалі пра гэта адкрыта і нават перасцерагалі. Таму, уласна, сепаратызм у Грузіі, Малдове і Украіне — выпадковасць ці ўсё ж частка прапісанага плана?

Адказ на гэта пытанне даюць расійскія журналісты Алег Кашын і Міхаіл Зыгар, прыўносячы ў публічную дыскусію ненавуковае паняцце «дактрына Лук'янава» (што балансуе на мяжы канспіралагічнай змовы, прыдуманай у Крамлі і апісанай у пачатку 90-х у эстонскіх СМІ, і рэальнай дарожнай картай, якую выкарыстоўвае кіраўніцтва Крамля для распальвання канфліктаў у некалі сяброўскіх савецкіх рэспубліках з мэтай узмацнення ўплыву і кіравання імі).

Вось што піша пра «дактрыну Лук'янава» А. Кашын:

(*) Пра «дактрыну Лук'янава» я неяк пытаўся ў самога Лук'янава, і ён быццам бы не прыкідваўся, калі адказаў, што не ведае. Затое (гэта было дзесяць гадоў таму), калі я спытаў пра тое ж у Віктара Алксніса, які ў той перыяд, што мяне цікавіць, быў адным з лідараў пралук'янаўскай фракцыі ў савецкім парламенце, ён адказаў не задумваючыся: так, вядома, была дактрына. Але гэта таксама нічога не значыць: магчыма, была, магчыма, не было. Класічны выпадак класічнай тэорыі змовы.

Сам тэрмін (Google наконт гэтага маўчыць) прыдумалі ці то апошнія заходнія саветолагі, ці то эстонскія публіцысты пачатку дзевяностых. У любым выпадку паходжанне тэрміна відавочна нярускае, «дактрына Лук'янава» — гэта як «кактэйль Молатава» ці нават «запавет Пятра Вялікага». Ідэя такая: 1990 год, верагоднасць распаду Савецкага Саюза набліжаецца ўжо да ста працэнтаў, і, хоць гарбачоўскі Крэмль пра гэта ўслых не кажа, недзе ў яго глыбінях нейкія думкі з гэтай сумнай нагоды самазараджаюцца і жывуць. Старшыня Вярхоўнага Савета СССР Анатоль Лук'янаў нібыта прапанаваў: ну што, калі некаторыя рэспублікі ўжо сапраўды настроеныя на адыход ад Масквы, расколем гэтыя рэспублікі на сепаратысцкі цэнтр і прасавецкія ўскраіны. Вось такая дактрына. Уласна, чутка пра яе з'явілася, калі сваю антысепаратысцкую палітыку пачалі аўтаноміі Грузіі і малдоўскае Левабярэжжа, якое абвясціла сябе Прыднястроўскай ССР. Калі гэта сапраўды прыдумаў Лук'янаў, то яго варта прызнаць, як у той песні, цудоўным майстрам, ідэя антысепаратысцкага сепаратызму — што магло быць больш дасціпным у той час? Зразумела, што флагманская з пункту гледжання сепаратызму кааліцыя краін Балтыі,

*Даведка*

**Анатоль Іванавіч Лук'янаў** (7 траўня 1930 года, г. Смаленск) — савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, расійскі палітык. Апошні старшыня Вярхоўнага Савета СССР (сакавік 1990 – верасень 1991), спачатку паплечнік першага і апошняга прэзідэнта СССР Міхаіла Гарбачова, затым яго апанент. Са жніўня 1991-га па снежань 1992 года знаходзіўся пад вартай па справе ГКЧП, абвінавачваўся ў змове з мэтай захопу ўлады і ў перавышэнні ўладных паўнамоцтваў, але пасля амніставаны разам з іншымі абвінавачанымі па гэтай справе. Дэпутат Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу РФ 1993–2003 гадоў ад КПРФ.

Доктар юрыдычных навук (1979), прафесар МДУ імя Ламаносава (з 2004 года), заслужаны юрыст Расійскай Федэрацыі (2012).

дзе на старонках газет я калісьці ўпершыню прачытаў пра «дактрыну», рэагавала на навіны з Сухумі і Ціраспаля вельмі нервова. У Эстоніі на ролю мясцовага Прыднястроўя цалкам маглі прэтэндаваць населеныя расійцамі Нарва і Кохтла-Ярве, у Літве быў Шальчынінкайскі раён з па-прасавецку настроенай польскай большасцю (над мэрыяй Шальчынінкая чырвоны сцяг вісеў, здаецца, да вясны 1992 года). Нават цяпер лёгка нафантазіраваць, што магло б адбыцца з гэтымі раёнамі, калі б гісторыя Савецкага Саюза завяршылася на год пазней — можа, і да гэтага часу дзесьці на нейтральнай тэрыторыі працягваліся б шматгадовыя перамовы пра «нарвенскае ўрэгуляванне» і гэтак далей. Але вось пашанцавала балтыйцам, а малдаванам і грузінам — не пашанцавала[7].

У канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя Масква расцэньвала жаданне саюзных рэспублік здабыць незалежнасць толькі як сепаратызм і планы разваліць імперскую дзяржаву. Таму, каб спыніць вялікі нацыянальны сепаратызм у «гордых рэспубліках» — Грузіі, Украіне і балтыйскіх дзяржавах, — Масква вырашыла дзейнічаць груба крэатыўным шляхам. Было вырашана спыніць буйны лясны пажар, пусціўшы яму насустрач маленькія пажары, — прыводзіць удалае параўнанне М. Зыгар.

Менавіта таму сепаратысцкія тэрыторыі з’яўляліся (а дакладней, іх наўмысна адшуквалі і разагравалі) як супрацьдзеянне параду незалежнасці нацыянальных дзяржаў, якія з усіх сіл спрабавалі вырвацца з палону Савецкага Саюза і пазбавіцца ад камуністычнага прыгнёту.

Але развалу Саюза было ўжо не пазбегнуць, таму распрацоўка спецслужбаў знайшла сваё прымяненне ўжо ў будучыні, калі Крамлю трэба было захаваць свае зоны ўплыву і навязаць палітыку, выгадную афіцыйнай Маскве. З-за гэтага з’явіліся Карабах, Прыднястроўе, Асеція і Крым.

Каб лягчэй патлумачыць «дактрыну Лук’янава», яе вельмі ўмоўна можна параўнаць, напрыклад, з працай Самюэля Хантынгтана «Сутыкненне цывілізацый» — прынамсі для пошуку пунктаў разлому на тэрыторыях асобных краін. Але калі Хан-

[7] http://svpressa.ru/politic/article/77794/

тынгтан прааналізаваў свет і пазначыў лініі культурных разломаў, то ў дактрыне крамлёўскіх кадэбэшнікаў фокус быў накіраваны не столькі на культурныя разломы, колькі на мінулы досвед ваенных канфліктаў у савецкіх рэспубліках, міжнацыянальную варожасць і пошук пунктаў будучых маніпуляцый. Менавіта таму працу Хантынгтана сусветная супольнасць прызнала грунтоўнай аналітычнай работай, а «дактрына Лук'янава» цяпер існуе на ўзроўні міфа, тыповай змовы і магчымай інструкцыі для стварэння плацдармаў для будучых ваенных дзеянняў. Да таго ж, факты даказваюць, што назва з'яўляецца ўмоўнай, аўтарскі склад — калектывам, а ў аснову дактрыны лёг так званы даклад «Пераадоленне нацыянальных супярэчнасцяў у рэспубліках СССР».

Паводле расійскіх СМІ, у гэтым дакладзе быў прааналізаваны нацыянальны склад Савецкага Саюза: хто, дзе і ў якой колькасці пражывае, як менавіта розныя народы ўжываюцца ў межах адной савецкай рэспублікі. У прыватнасці, як узаемадзейнічаюць у Латвіі ліб з латгальцамі, у Эстоніі — віру і сету, а ў Літве — куршы з жамойтамі. Этнічных рускіх таксама раскладвалі на малекулы — водзь, макшан і эрзян, украінцаў — на гуцулаў, лемкаў і палешукоў. Працавалі пад грыфам «зусім сакрэтна», таму нават членам Палітбюро складана было азнаёміцца з ёй.

Калі назва дактрыны, яе паходжанне і наогул існаванне яшчэ можна і варта паставіць пад сумнеў, то, напрыклад, матэрыку дзеянняў па правакаванні канфліктаў афіцыйнай Масквы аспрэчыць складана. Ужо цалкам відавочна, што сучасны Крэмль выразна бачыць карту канфліктаў на тэрыторыі былых савецкіх рэспублік і ўмела ёю карыстаецца. Хоць, на жаль, з-за недасведчанасці, страху, хаосу ў СМІ і празмернай эмацыйнасці большасці насельніцтва выпадкі выяўлення расійскай агрэсіі здаюцца выпадковымі і нечаканымі. І гэта наводзіць яшчэ большую паніку і выклікае неадэкватную рэакцыю.

Згодна з дактрынай, можна вылучыць наступныя патэнцыйна небяспечныя тэрыторыі:

– Грузія: Абхазія, Паўднёвая Асецыя і Аджарыя;

– Малдова: Прыднястроўе і Гагаузія;

– Украіна: Крым, Данбас;
– Азербайджан і Арменія: Нагорны Карабах;
– Казахстан: поўнач краіны;
– Эстонія: Нарва;
– Латвія: Латгалія.

Але варта адзначыць, што няма адзінай сістэмы кіравання канфліктамі. Да кожнага кейса Масква спрабуе прыдумляць асобную ідэалагічную легенду на базе абароны нацыянальных меншасцяў і далейшай інтэграцыі: для Абхазіі і Асеціі — незалежнасць, для Прыднястроўя — аўтаномію, для Крыма — далучэнне.

## Што такое праблемныя тэрыторыі ў складзе постсавецкіх дзяржаў?

Савецкія партыйныя кіраўнікі, ведаючы месцы культурных разломаў, міжэтнічных канфліктаў, моўных і рэлігійных разыходжанняў, спрабавалі зрабіць так, каб не было адзінства ні ў адной рэспубліцы, а замест гэтага былі пастаянныя звады і нявызначанасць.

«Сепаратысцкая бомба запаволенага дзеяння» ў савецкіх рэспубліках была закладзена яшчэ падчас вызначэння Масквой межаў рэспублік СССР. Напрыклад, у склад Казахстана ўмантаваныя тэрыторыі, дзе пражывалі этнічныя рускія, а ў Малдаўскую ССР увайшлі прыднястроўскія землі, заселеныя ўкраінцамі, а пасля і рускімі. Можна сцвярджаць, што савецкія кіраўнікі наразалі межы так, каб зрабіць немагчымым выхад са складу СССР. Падобная канструкцыя была ўведзена і ў эканоміку, калі элементы і часткі аднаго тавару выраблялíся ў розных рэспубліках. Гэта рабіла немагчымым імклівае развіццё рэспублік у выпадку незалежнасці і стварала ілюзію безальтэрнатыўнасці існавання за межамі бальшавіцкай імперыі і калектыўнай эканомікі.

Хоць выхад са складу Саюза быў гарантаваны яго Канстытуцыяй, на практыцы гэта мела б катастрафічныя наступствы для любой рэспублікі, якая пастанавіла б выйсці са складу бальшавіцкай дзяржавы раней за 1991 год.

Але ўрэшце камуністычная імперыя распалася — і ўтварылася 15 незалежных дзяржаў, кожная з якіх мела свой патэнцыйны «гарачы пункт» або патэнцыйна «сепаратысцкую тэрыторыю». Пераважна гэта месца пражывання рускамоўнага насельніцтва або перамешчаных рускіх. Такімі тэрыторыямі і людзьмі, якія іх засялялі, магла маніпуляваць непасрэдна Масква, ці гэта маглі выконваць лаяльныя палітычныя эліты. Напрыклад, ва Украіне з 1997 года дзейнічала Партыя рэгіёнаў, галоўным палітычным партнёрам якой былі «Адзіная Расія» і Камуністычная партыя Украіны. Базавы электарат — рускамоўнае насельніцтва. Кадравыя прызначэнні, ідэалагічная палітыка і палітычны курс пераважна былі вызначаныя Масквой ці ўзгодненыя з ёй. Пасля таго, як Партыя рэгіёнаў адышла ад улады, Расія здзейсніла акт анексіі Крымскага паўвострава, што выклікала міжнародныя санкцыі і імклівы скачок рэйтынгу Пуціна ўнутры РФ. Менавіта таму адмову ад прарасійскіх эліт Масква ўспрымае вельмі агрэсіўна.

На фоне такіх абставін пагрозай дзяржаўнасці становіцца заява Уладзіміра Пуціна прэзідэнту Казахстана 29 жніўня 2014 года:

(*) Нурсултан Назарбаеў зрабіў унікальную рэч — стварыў дзяржаву на тэрыторыі, на якой дзяржавы не было ніколі.

Маўляў, без яго краіны можа і не быць. Або іншы бок медаля: калі перад прэзідэнцкімі выбарамі Пуцін заклікае жыхароў Казахстана галасаваць за Назарбаева.

Вышэйзгаданыя прыклады даказваюць адзін просты факт: Расія з усіх сіл спрабуе выкарыстаць уласны рэсурс на постсавецкіх рэспубліках. І карупцыяй пры лаяльным рэжыме, і вайной у выпадку, калі краіна плануе змяніць свой знешнепалітычны курс.

У сепаратысцкіх канфліктах Крэмль заўсёды спрабуе сыграць на нацыянальнай прыналежнасці, адрозненнях у мовах, рэлігіі і падобным. Як бы штучна гэта ні выглядала звонку, РФ не грэбуе кожны раз новымі метадамі ў сваёй агрэсіўнай палітыцы.

Прааналізуем Прыднястроўскі канфлікт, які нават расійскія журналісты называюць самым штучным з усіх разыграных

Масквой пасля развалу Савецкага Саюза. Па іх версіі, гэта канфлікт, заснаваны на процістаянні рускамоўнай меншасці румына-малдаўскай большасці. А кожны першы візіт новаабраных кіраўнікоў ПМР адбываецца ў Маскву, дзе яны атрымліваюць указанні ад тамтэйшага кіраўніцтва.

На думку расійскага ліберальна настроенага журналіста М. Зыгара, акрамя прапаганды, новая рэспубліка нічога не атрымала. Эканоміка ўсё роўна звязаная з Малдовай, пра што сведчыць шалёная кантрабанда тавараў, якая ў вялікай ступені фармуе бюджэт непрызнанай рэспублікі.

Варта звярнуць увагу на тое, што жыхары Прыднястроўя двойчы праводзілі рэферэндумы для далучэння да Расіі. І ні разу РФ не адказала ўзаемнасцю і нават не спрабавала іх пачуць. Падобная гісторыя і з Данбасам, тэрарысты і сепаратысцкія групоўкі якога спадзяваліся стаць часткай тэрыторыі Расіі. Пра што гэта сведчыць? Пра тое, што яны не патрэбныя ў складзе федэрацыі. Іх роля вызначаная загадзя: быць увасабленнем праблемы, інструментам стварэння канфлікту — і толькі. Крым стаў выключэннем толькі з-за сваёй сакральнай місіі для імперскай кароны Пуціна, дзякуючы чаму ён змог раздзьмуць свой прэзідэнцкі рэйтынг.

Ці працягне Пуцін свае захопніцкія войны? Калі яго не спыніць — то так. Бо ўсе думалі, што Грузія — гэта прыкрая выпадковасць, а Украіна — гэта выключэнне з правіла. Але што Еўропа скажа пра Эстонію, Латвію ці Фінляндыю? Трэба і далей гандляваць, бо губляем рынкі збыту? Пытанняў шмат, і варта пачаць шукаць адказы. І калі ў еўрапейскіх краін яшчэ ёсць час, то Украіна ўжо цяпер павінна гэта рабіць у стане вайны і анексіі часткі тэрыторыі.

З іншага боку, савецкія распрацоўкі накшталт «дактрыны Лук’янава» сябе не апраўдалі, хоць і прынеслі тысячы смярцей. Украіна з Грузіяй узялі свой упэўнены курс на еўраінтэграцыю, заключыўшы пагадненне аб усёабдымнай зоне свабоднага гандлю, Малдова атрымала бязвізавы рэжым, краіны Балтыі ў ЕС і ў НАТО, а беларускія вайскоўцы ўжо сёння ўпотай галоўным ворагам лічаць не толькі Паўночнаатлантычны блок, але і свайго «стратэгічнага партнёра».

Імперскія амбіцыі Расіі не проста разбурылі некалі дружалюбныя адносіны паміж постсавецкімі рэспублікамі, а выразна вызначылі цывілізацыйныя межы і натхнілі частку з краін еўраінтэгравацца, а іншую частку — узмацніць нацыянальную свядомасць, а не балансаваць паміж уласнай дзяржавай і лаяльнасцю да Масквы.

І калі казаць пра «рускі свет», то не культурная, моўная або рэлігійная прыналежнасць з'яўляецца яго часткай, а менавіта апісаныя вышэй стратэгіі кіравання нацыянальнымі канфліктамі, моўнымі адрозненнямі і палітычнай кан'юнктурай.

## Саюзнікі Пуціна — прадажныя эліты

Як сведчыць міф «дактрыны Лук'янава», Пуцін не заходзіць на непадрыхтаваную глебу. Усе свае нападзенні ён рыхтуе з акадэмічнай дакладнасцю, вылічвае кожны крок, імкнучыся спрагназаваць усё наперад. Бо, як кажуць у Маскве, у Крамлі не любяць нечаканасцяў. Таму і стараюцца ўсё рыхтаваць загадзя. А хто можа быць больш адданы і адначасова больш падступны, чым агенты, якія дзясяткі гадоў чакалі прыходу новага «цара»; чым эліты, якія працавалі не на сваю краіну, а на імперскую Маскву, атрымліваючы па дзве заработныя платы, маючы магчымасць зарабляць мільёны, а то і мільярды, а самае галоўнае — магчымасць выслужыцца перад вышэйшым палітычным кіраўніцтвам?

Калі я быў студэнтам, то ўвесь час шукаў падпрацоўкі і часовую занятасць, каб забяспечыць сабе пражыванне ў сталіцы, бо, як і мільёнам маіх калег, стыпендыі не хапала. Звычайна гэта была нейкая офісная папяровая або камп'ютарная праца, пераклады тэкстаў або іншыя няхітрыя спосабы падзарабіць, якія можна было знайсці для студэнта стацыянара.

Неяк мне давялося працаваць у офісе аднаго бізнэсоўца, якому трэба было перакладаць дакументы на англійскую мову, каб падрыхтаваць дэлегацыю да паездкі ў замежную камандзіроўку. Я ўзяўся за сваю працу, адначасова падтрымліваючы кантакт з супрацоўнікамі, якія мне здаліся чамусьці вельмі дэпрэсіўнымі. Яны гэта тлумачылі тым, што найлепшыя часы

іх працадаўцы прайшлі, затое цяпер ён чапляецца за любую магчымасць. Бо ўвесь бізнэс-рэсурс і міні-імперыю яны ўжо праелі. І адбылося гэта пасля таго, як ён перастаў атрымліваць дапамогу з Масквы.

Я з цікавасцю перапытаў: маўляў, хіба ён не ўладальнік бізнэсу, а проста менеджар, а інвестары — маскоўскія? На гэта мне адказалі наступнае: ён — кіеўскі бізнэсмен, галоўны акцыянер і ўладальнік бізнэсу, але раней атрымліваў перыядычную фінансавую незваротную дапамогу з Расіі на куплю актываў (офісы ў сталіцы, металургічныя і сыравінныя камбінаты на ўсходзе, арэнда зямельных угоддзяў у цэнтральных абласцях і многае-многае іншае). Але ў нейкі момант адбыўся пералом, калі кіеўскі бізнэсмен адмовіўся ўзначаліць адну з расійскіх энергетычных кампаній, дакладней яе прадстаўніцтва ва Украіне. Чалавек горда заявіў, што ён — бізнэсмен, а не менеджар, таму не можа кіраваць чужым бізнэсам, а развівае свой. Пасля гэтага завяршылася казачнае маскоўскае фінансаванне, частку актываў «адціснулі», а бізнэсоўца выкінулі з прарасійскіх колаў зносін.

Праўда, ён туды яшчэ спрабаваў вярнуцца, калі зразумеў, што толькі яго асабістых талентаў на раскошнае жыццё не хапае, а на развіццё бізнэсу патрэбныя дадатковыя інвестыцыі. Таму некалькі разоў ён яшчэ прапаноўваў стварыць магутную прарасійскую партыю і падтрымаць Маскоўскі патрыярхат у Кіеве. Але ўжо так і не ўдалося працягнуць сяброўства і аднавіць страчаны давер.

Гэтая гісторыя мяне вельмі зацікавіла, і я мімаволі пачаў дашуквацца адказаў, навошта Масква раздае грошы грамадзянам Украіны на развіццё бізнэсу і палітычныя праекты. Высветлілася, што сапраўды Крэмль быў зацікаўлены ў прарасійскіх элітах ва Украіне, і не толькі эканамічных ці дзелавых, але і палітычных ды рэлігійных. Гэта лёгка можна растлумачыць тым, што Украіна да гэтага часу не мае сваёй паместнай царквы, нягледзячы на тое, што ўжо чвэрць стагоддзя з'яўляецца незалежнай дзяржавай.

Але, вяртаючыся да пытання лаяльнасці бізнэс-эліт, я выявіў відавочны факт, які ляжаў на паверхні, але да гісторыі з кіеўскім

бізнэсменам мяне не цікавіў. Вельмі многія бізнэсоўцы, у тым ліку і з сённяшняга спісу «Forbes – Украіна», развіваюць свой бізнэс менавіта на лаяльнасці Расіі. Многія атрымлівалі магчымасць гандляваць газам з Еўропай, набываючы газ па $50 і прадаючы яго па $100–120 у Еўропе, зарабляючы па $5–7 млрд у год. Расія быццам бы гэтага не заўважала. Тады як ва Украіне імкліва развіваўся клас украінскага алігархату, які шмат чым быў абавязаны свайму паўночнаму суседу. Некаторыя газавыя кампаніі, якія спецыялізаваліся на рэалізацыі расійскага газу ў Еўропу, зараблялі па некалькі мільярдаў долараў штогод, інвестуючы ў скупку актываў, палітыку, а часам проста выводзілі сродкі за мяжу ў выгадныя афшорныя зоны.

Другая катэгорыя — гэта бізнэсмены, якія выраблялі пэўныя тавары ці паслугі, а дружалюбны расійскі рынак прапаноўваў сябе як рынак збыту. Гэта на самай справе было вельмі выгадным, бо расійскі рынак у тры разы большы за ўкраінскі, а разам яны складаюць каля 200 млн насельніцтва.

Трэцяя ўмоўная катэгорыя — гэта бізнэсмены, якія кіравалі расійскім бізнэсам ва Украіне ці куплялі, а часам і проста захоплівалі рэйдарскім шляхам актывы для больш магутных расійскіх алігархаў. Часам будавалі штосьці ва Украіне, а потым перапрадавалі расіянам па больш выгадных цэнах.

Асобна можна гаварыць пра палітыкаў і чыноўнікаў. Бо Украіна не пайшла па шляху сваіх усходнееўрапейскіх суседзяў, якія вызваленне з палону сацлагера падсумавалі правядзеннем люстрацыі, выкінуўшы ўсіх камуністычных агентаў з шэрагаў высокапастаўленай эліты. З Украінай такога, на вялікі жаль, не адбылося. Да таго ж, працягнулася савецкая ганебная традыцыя, калі большасць чыноўнікаў на адказныя палітычныя пасады ў Кіеве прызначала Масква. А ўсе прэзідэнты, за выключэннем Парашэнкі, спачатку з афіцыйным візітам абавязкова наведвалі сталіцу РФ.

Мноства чыноўнікаў розных узроўняў працавала адразу на дзве краіны. Часта на адказныя пасады ва Украіне прызначалі расійскіх грамадзян, у прыватнасці ў сферы абароны, у спецслужбах і ў органах міліцыі. Нармальнай практыкай было і ўзгадненне намеснікаў у міністэрствах, службах і камітэтах

з Масквой, калі Кіеў проста падаваў кандыдатуры, а іх зацвярджалі ў Белакаменнай.

Дарэчы, ходзяць нават такія чуткі, што Масква ўзгадніла і правапераемніка Леаніда Кучмы, які вырашаў, каму ж перадаць краіну. Чаму тады ніхто не ставіў пытанне знешняга кіравання краінай? Адбіліся перажыткі савецкіх палітычных традыцый, тады гэта лічылася нармальным.

Лаяльныя прарасійскія эліты Украіны спрабавалі ва ўсім выслужыцца перад Масквой. Вельмі дзіўна выглядалі вяселлі дзяцей украінскіх чыноўнікаў, палітыкаў ці бізнэсоўцаў, на якіх амаль не запрашалі для выступу ўкраінскіх спевакоў. Як правіла, гэта быў рускі дэсант. Бо было б дурным тонам, калі б на такое святкаванне прыляцеў маскоўскі высокапастаўлены госць, а выступалі б невядомыя яму ўкраінскія артысты. Смешна, але такія рэчы калісьці былі нормай і так выяўлялася непаўнавартасць тагачасных украінскіх псеўдаэліт.

Будучы ў Маскве ў тэлевізійным эфіры, я стаў сведкам таго, як мой калега — палітычны эксперт, дырэктар Інстытута глабальных стратэгій Вадзім Карасёў — апелюючы расійскаму спікеру, на рэпліку «калі Масква вас карміла цягам усёй незалежнасці» адказаў вельмі прафесійна і трапна: «Не нас і не карміла — Крэмль мэтанакіравана падкупляў украінскія бізнэс- і палітычныя эліты».

І ў гэтым — сутнасць працэсаў, якія прасочваліся ва Украіне і Расіі ў 1990-х і 2000-х гадах, калі РФ будавала свае адносіны толькі праз лаяльныя палітычныя эліты, гатовыя выконваць амаль усе пастаўленыя Масквой задачы. Прыняць закон аб мовах — калі ласка. Падоўжыць тэрмін базіравання расійскага флоту ў Крыме — без пытанняў. Расія не хоча, каб Украіна інтэгравалася ў Еўропу, — добра, сказаў Януковіч Пуціну. Праўда, пасля гэтага ён перастаў быць украінскім прэзідэнтам і страціў уладу над краінай. Расія захацела занадта многа, а ўкраінскі палітычны клас перайграў сам сябе, што прывяло да далейшай рэвалюцыі і акупацыі Расіяй украінскага Крыма ў адказ на жаданне нашай дзяржавы праводзіць уласную дзяржаўную палітыку. Аднак менавіта ў той момант Украіна ўпершыню за свае 25 гадоў незалежнасці пачала сама прызна-

чаць чыноўнікаў, сілавікоў і вайскоўцаў. Вычышчаліся сілавыя органы і міліцыя, што стала крытычнай неабходнасцю пасля трагічных травеньскіх падзей у Адэсе 2014 года, калі ўкраінскія міліцыянеры бралі ўдзел у мерапрыемствах па абодва бакі барыкад — з украінскага і сепаратысцка-прарасійскага. Хоць гэта было зразумела і раней, калі ў акупаваным Крыме частка вайскоўцаў і сілавікоў пачала супрацоўнічаць з расійскімі акупантамі. З такімі кадрамі весці вайну было немагчыма, асабліва супраць краіны, якой яны прынеслі прысягу на вернасць.

Постсавецкім краінам, якія цяпер уваходзяць у арбіту Крамля і дагэтуль спадзяюцца, што РФ — іх надзейны партнёр, а не воўк у авечай шкуры, варта звярнуць увагу на свае палітычныя і бізнэс-эліты, якія ў крытычны момант агрэсіі або пачатку ваенных дзеянняў могуць выбраць не нацыянальную, а сепаратысцкую або прарасійскую пазіцыю.

А яшчэ варта звярнуць увагу, што Крэмль пэўным чынам змяніў стратэгію, паскорыўшы вынік. Масква пачала засылаць сваіх алігархаў у краіну прызначэння, каб тыя ўціраліся ў давер да «першай асобы». Бо Пуцін перастаў верыць, напрыклад, украінскім алігархам, з-за чаго камандзіруе больш верных сабе мільярдэраў. Прычыны такіх камандзіровак розныя, мэта — адна: рука Крамля, якая мае ўплыў на прэзідэнта і на сітуацыю ў краіне ў цэлым.

Не менш актуальнымі з’яўляюцца старыя савецкія закладкі ў парламентах еўрапейскіх краін, якія маюць камуністычнае мінулае ці энергаарыентаваную на Расію эканоміку. Або, напрыклад, маюць завербаваных лаяльных чыноўнікаў, якія гадамі не праходзяць дзяржправерку. А гэта з’яўляецца абавязковым патрабаваннем закона, які могуць і не выконваць. Напрыклад, так робяць некаторыя высокапастаўленыя чыноўнікі з адміністрацыі прэзідэнта Чэхіі.

Уласна, Крэмль гадамі, дзесяцігоддзямі павялічваў сваю агентурную сетку, падкупляў нацыянальныя эліты і спрабаваў сфармаваць лаяльных да сябе ўплывовых асоб, матывуючы іх рознымі спосабамі: ад банальнай карупцыі да выхаду на маланканкурэнтны расійскі рынак. За гэта з Масквы выстаўлялі адно патрабаванне — палітычную лаяльнасць.

## Ці працуе «рускі свет» за межамі РФ? Нерускамоўныя прарасійскія лабісты ў ЕС

«Лабісты, ад якіх пахне газам», — жартуе з намі дзяўчына-стажор у Еўрапарламенце, абмяркоўваючы нядаўняе выступленне аднаго з іх, энергічнага англамоўнага італьянца, які пераконваў дэлегацыю маладых непарламенцкіх палітыкаў з краін былога Савецкага Саюза (Грузіі, Арменіі, Азербайджан і Украіны) у нявыгаднасці іх інтэграцыі ў ЕС.

Лабіст раздаў кожнаму з нас добра падрыхтаваную, выкананую з дарагіх матэрыялаў брашуру са справаздачай, у якой даказваў нам, прадстаўнікам краін, якія хочуць вырвацца з палону саветчыны, быццам бы ў Еўропе нас не чакаюць і нам не месца сярод еўрапейскіх краін. Што наша жаданне вызваліцца з цянётаў Расіі перашкаджае яго роднай Італіі прадаваць «парміджано» на неабсяжным расійскім рынку. Гэта наштурхнула на разважанні і аналіз дзейнасці такіх лабістаў, НДА і ў цэлым — палітычных партый у Еўропе, якую Пуцін ужо не першы год спрабуе раз’яднаць, радыкалізуючы палітычную сітуацыю, ствараючы атмасферу страху і хаосу. Успомніўся пастаянны паток сірыйскіх бежанцаў, якіх выкарыстоўваюць як інструмент ціску на еўрапейцаў, на іх камфортнае жыццё, што, на жаль, стварае значныя праблемы шматлікім урадам краін Еўропы. А што ўжо і казаць аб фінансаванні радыкальных палітычных нацыяналістычных партый, якія крытыкуюць слабую пазіцыю ўласных урадаў. Гэта дадае ім папулярнасці і ў той жа час уносіць шмат дэструктыву ў палітычны дыялог ЕС.

На самай справе ўсе актыўнасці Пуціна сведчаць пра тое, што ён баіцца моцнай і адзінай Еўропы і значна вальней адчувае сябе, калі кантынент падзелены на сацлагер і прыхільнікаў капіталізму. Калі светам можна маніпуляваць і выкарыстоўваць слабасць раз’яднанай Еўропы. Пуцін з усіх сіл спрабуе раз’яднаць палітычны партнёрскі саюз ЕС і ЗША, перацягнуўшы на свой бок мацерыковых суседзяў, часта заганяючы ў свае абдымкі сілай.

## Германія, Чэхія і краіны Балтыі — еўрапейскі тэатр расійскай прапаганды?

Праблемы, а дакладней, напружаныя адносіны паміж Пуціным і Меркель, кіраўнікамі дзвюх дзяржаў, якія гістарычна бывалі як партнёрамі, так і ворагамі, існавалі заўсёды. Аднак сітуацыя стала яшчэ складанейшай у 2014–2015 гадах, калі Пуцін здзейсніў акт агрэсіі супраць свайго суседа Украіны, анексаваўшы частку яе тэрыторыі.

Прэса і грамадзяне многіх краін памятаюць, як Пуцін спрабаваў прадэманстраваць Ангеле характар, запускаючы ў пакой перамоваў свайго лабрадора Коні, выдатна ведаючы, што ў нямецкага канцлера фобія ў дачыненні да сабак. Гістарычна адносіны дзвюх краін складваліся кардынальна па-рознаму, ад блізкіх саюзаў, узаемавыгаднага супрацоўніцтва і садружнасці да войнаў з мільёнамі ахвяр. Але гэта ніколі не перашкаджала пражыванню немцаў у Расіі, а рускіх — у Германіі. Аднак цяпер нас больш цікавіць этап сучаснага развіцця адносін і факты, якія на гэта паўплывалі.

(*) 250 гадоў таму каля 30 тысяч немцаў у пошуках лепшага жыцця эмігравалі ў Расію. Многія нашчадкі тых перасяленцаў у канцы XX ст. вярнуліся ў Германію, утварыўшы там адну з найбуйнейшых груп імігрантаў. Іх прынята называць рускімі немцамі.

З Савецкага Саюза і новых дзяржаў, якія ўтварыліся пасля яго распаду, на радзіму продкаў прыехала 4,5 млн чалавек. Большасць ведала Германію толькі з кніг і фільмаў. Цалкам інтэгравацца яны не змаглі і, застаўшыся ў нявызначаным стане — не будучы ні рускімі, ні немцамі, стварылі спецыфічную субкультуру[8].

Уласна, гэтая субкультура рускіх немцаў, якія так і не выкарысталі ўсіх магчымасцяў сучаснай Германіі, не змаглі і не захацелі вывучыць нямецкую мову, стала асновай прасоўвання ідэй «рускага свету» ў Германіі. Менавіта яны з'яўляюцца галоўнымі гледачамі расійскага канала глабальнага вяшчання

[8] https://birdinflight.com/ru/vdohnovenie/20160425-ira-thiessen-privet-germaniya.html

Russia Today і мітынгоўцамі, якія выходзяць на вуліцы нямецкіх гарадоў падчас акцый падтрымкі прарасійскіх ідэй і супраць палітыкі мясцовых уладаў.

У Нямеччыне таксама дзейнічае шэраг прарасійскіх і асобнага тыпу арганізацый, якія альбо радыкалізуюць палітычную сітуацыю, альбо падыгрываюць палітыцы Крамля. Як гэта было са спробай распаліць інфармацыйны скандал з «дзяўчынкай Лізай» (падрабязней гл. ніжэй).

Але магутная эканоміка і медыйнае поле Германіі не так часта падвяргаюцца нападам і маніпуляцыям, хутчэй пад такі ўплыў трапляюць краіны са слабай эканомікай і арміяй. Краіны, якія знаходзіліся пад значна большым уплывам Крамля.

## Крамлёўскі ўплыў у краінах Балтыі

Каб лепш зразумець сітуацыю ў краінах Балтыі, я шмат кантактаваў з Мартам Саонікам, выкладчыкам Public Relations у Талінскім універсітэце, а таксама журналістам з Літвы Віктарам Чарнішуком. Апошні, уласна, даў вычарпальную інфармацыю, якую я прывяду ніжэй, адносна ўплыву расійскіх медыя на ўнутраныя інфапрасторы тройкі краін і дзейнасць прарасійскіх партый.

Віктар Чарнішук адзначае: «Найбольш стабільнай па ўплыве расійскіх СМІ з'яўляецца Літва, найбольш уразлівай лічыцца Латвія, больш ці менш спакойна ў Эстоніі. На гэта ўплывае як колькасць жыхароў рускага паходжання і ў цэлым рускамоўных людзей, так і шчыльнасць гэтай групы насельніцтва на пэўную плошчу ў краіне. Калі ў Літве амаль няма рэгіёнаў кампактнага пражывання рускамоўных груп, то ў Латвіі і Эстоніі такія рэгіёны сфармаваліся гістарычна. Напрыклад, край Латгалія (60% усяго насельніцтва — рускія) і Рыга (40%) — у Латвіі або Талін (37%), павет Хар'юмаа (38%), Нарва (95% складаюць рускія) і павет Іда-Вірумаа (75%), рэгіён Тарту (14%). Адзіны «рускамоўны» горад у Літве — невялікі дваццацітысячны горад Вісагінас (56% яго насельніцтва — этнічныя рускія, але разам з беларусамі, украінцамі, малдаванамі, татарамі і палякамі доля рускамоўных дасягае ў горадзе 84%). Другое месца

па колькасці рускамоўнага насельніцтва заняла Клайпеда (з 200 тысяч насельніцтва этнічныя рускія складаюць 20%). У Вільні доля рускіх не перавышае 15%. Сталіца Літвы адрозніваецца ад сталіц іншых краін Балтыі тым, што Вільнюс — літоўска-польскі горад, а не напалову рускі, як Рыга і Талін. Зрэшты, у Літве існуе анклаў польскага насельніцтва ў Віленскім краі (да 80% ад усяго насельніцтва краю). У самой сталіцы каля 20% насельніцтва — палякі. Традыцыйна пераважная большасць літоўскіх палякаў пад уплывам расійскіх медыя з'яўляецца прыхільнікамі Расіі. Пераважная большасць польскага насельніцтва Літвы жыве на мяжы з Беларуссю, з тэрыторыі якой прымаюцца ўсе каналы РФ. І сігнал значна лепшы, чым з Вільні. Можна сцвярджаць, што глядзець расійскія каналы стала звычкай, таму сімпатыі да палітыкі Крамля і асабіста Пуціна сярод польскага насельніцтва нават большыя, чым сярод этнічных рускіх. З тых жа прычын вялікімі прыхільнікамі расійскай палітыкі з'яўляецца большасць этнічных беларусаў Літвы. Акрамя таго, па сцверджаннях службы бяспекі Літвы, найбольш папулярныя рускамоўныя выданні Літвы («Літоўскі кур'ер», «Агляд» і інш.)ператварыліся ў крамлёўскія філіялы і прасоўваюць ідэі Пуціна і «рускага свету».

У краінах Балтыі ўжо пачалі разыгрываць план «рускага свету». Пра гэта сведчаць з'яўленне вялікай колькасці прарасійскіх партый у Даўгаўпілсе і Рызе, выступленні мэраў Рыгі і гарадоў Латгаліі (Рэзэкнэ, Даўгаўпілс, Краслава, Зілупэ), якія выказваюцца за сяброўства з пуцінскай Расіяй, а таксама з'яўленне атрадаў і лагераў, у якіх рыхтуюць салдат для абароны «рускіх Данбаса».

Рускамоўныя СМІ Латвіі амаль усе працуюць у фарватары Крамля. Фактычна ў Латвіі ўмацоўваецца пятая калона з этнічных рускіх Латгаліі і Рыгі. Ідэя «рускага свету» ў гэтых рэгіёнах становіцца ўсё больш папулярнай. Уплыў на людзей расійскіх СМІ, асабліва тэлебачання, надзвычай вялікі.

Некалькі разоў на ўзроўні Сейма Літвы (парламент) былі прынятыя санкцыйныя рашэнні па абмежаванні трансляцыі альбо цэлых каналаў РФ, альбо іх палітычных перадач. Акрамя таго, як нязначную, але ўсё роўна — процівагу ў Літве разгля-

даюць існаванне на нацыянальным тэлеканале грамадскага вяшчання праграм на рускай, украінскай, польскай і беларускай мовах, навіны на рускай мове на Першым канале нацыянальнага радыё, інфармацыйныя спецпраекты. Але ўсяго гэтага недастаткова, бо Масква кідае на прапаганду шалёныя грошы. Некаторыя каналы былі заблакаваныя, але гэта малаэфектыўна ва ўмовах інфармацыйнай прасторы, якая з'яўляецца адкрытай дзякуючы інтэрнэту і спадарожнікавай сувязі. Але абмежаванні на вяшчанне каналаў «Расія», Першы канал, НТВ да гэтага часу існуюць».

### Падтрымка палітыкі Пуціна і дзейнасць прарасійскіх палітыкаў у краінах Балтыі

«Этнічныя рускія і беларусы Латвіі і Эстоніі традыцыйна падтрымліваюць любыя дзеянні Расіі. Рускае насельніцтва Літвы трохі адрозніваецца ад рускіх у суседніх краінах. Гэта абумоўлена яшчэ і ступенню інтэграцыі, і грамадзянствам. А сітуацыя з гэтым у кожнай краіне свая.

У 2015 годзе ў краінах Балтыі пражывала больш за 1 млн рускіх, у прыватнасці, у Латвіі — 515 тыс. (26% ад 1,9 млн насельніцтва), у Эстоніі — з 1,3 млн насельніцтва краіны — 325 тыс. (26 %), у Літве — 173 тыс. (каля 6%). У Латвіі і Эстоніі на працягу апошніх гадоў існуе праблема масавага безграмадзянства — каля 400 тыс. жыхароў Латвіі і больш за 110 тыс. жыхароў Эстоніі з'яўляюцца асобамі без грамадзянства. У Літве амаль няма рускіх ці рускамоўных жыхароў без грамадзянства. Выключэннем з'яўляюцца тыя, хто атрымаў палітычны прытулак. Акрамя таго, Вільнюс стаў галоўным замежным цэнтрам расійскай і беларускай палітычных апазіцый, тут дзейнічаюць замежныя цэнтры апазіцыйных партый, медыярэсурсы, адбываюцца палітычныя форумы, канферэнцыі.

Сярод моладзі можна вылучыць два тыпы. Першы — гэта інтэграваная моладзь, моладзь сталічных рэгіёнаў, горада Вісагінаса, невялікая частка моладзі паўночнага ўсходу Эстоніі і Латгаліі. У параўнанні з іншымі, у гэтай групе максімальная доля мае грамадзянства краіны пражывання, а таксама самы высокі

ўзровень валодання дзяржаўнай мовай. Гэта звязана з тым, што большасць з іх нарадзілася ўжо ў незалежных балтыйскіх дзяржавах. Акрамя таго, уся нелітоўская па паходжанні моладзь і насельніцтва Літвы сярэдняга ўзросту валодаюць дзяржаўнай мовай. А вось на ўсходзе Эстоніі і ў латвійскай Латгаліі сітуацыя іншая. Нежаданне вывучаць дзяржаўную мову становіцца прынцыповым і перарастае ў пракрамлёўскія палітычныя погляды. Гэтаму вельмі спрыяюць тэлевізійныя праграмы, якія транслююцца з РФ, а таксама мясцовыя рускамоўныя СМІ.

Акрамя таго, інтэграваная група адрозніваецца самым высокім міграцыйным патэнцыялам. Аднак напрамкі міграцыі розныя. Сталічная моладзь арыентуецца на ад'езд з краіны, прычым пераважна ў еўрапейскія дзяржавы, а не ў Расію. Міграцыйныя перавагі трохі адрозніваюцца ў рускамоўнай моладзі перыферыйных раёнаў, частка якой арыентуецца на пераезд або ў сталіцу сваёй краіны, або ў Расію, але большасць, як і ў сталіцах, хацела б з'ехаць у заходнюю частку ЕС.

Другі тып — гэта неінтэграваная моладзь, большая частка моладзі паўночнага ўсходу Эстоніі і Латгаліі. Існаванне гэтай групы абумоўлена сацыяльнай нявызначанасцю. Для гэтай моладзі таксама характэрная праблема наркаманіі і п'янства. Адна з галоўных прычын гэтага — цяжкасці з навучаннем на няроднай мове, з-за чаго яны часта кідаюць вучобу ў школе, трапляюць у злачынныя групы. Сярод іх папулярныя ваенныя лагеры, якія арганізуе для іх Расія, прапуцінскія моладзевыя арганізацыі дзесьці ў глыбінцы РФ. Ужо другі год запар такія напаўвайсковыя спартыўныя цэнтры дзейнічаюць для школьнай рускамоўнай моладзі Літвы, Латвіі і Эстоніі на тэрыторыі РФ.

Ва ўсіх трох краінах Балтыі ёсць прарасійскія партыі. У Эстоніі гэта цэнтрысцкая партыя на чале з мэрам Таліна і былым прэм'ерам Эстоніі Савісаарам, у Латвіі — магутная кааліцыя партый «Цэнтр згоды» на чале з колішнім мэрам Рыгі Нілам Ушаковым. У Літве — польска-расійскі палітычны альянс на чале з еўрадэпутатам Тамашэўскім. Усе яны з'яўляюцца прыхільнікамі і палітычнымі хаўруснікамі прапуцінскіх сіл у РФ. Толькі той факт, што Савісаара і Ушакова некалькі разоў запар абіралі мэрамі сталіц, а іх партыі прадстаўленыя ў парламентах

краін, сведчыць пра падтрымку іх ідэй пэўнай часткай насельніцтва. Абранне Вальдэмара Тамашэўскага (Літва) у Еўрапарламент, а прадстаўнікоў яго палітычнай сілы (аб’яднаная сіла «Выбарчая акцыя “Салідарнасць”» і «Рускі альянс») — у гарсавет Вільнюса і парламент Літвы таксама сведчыць пра існаванне дастатковай колькасці прыхільнікаў. Акрамя таго, у Літве, Латвіі і Эстоніі існуюць непарламенцкія нацыянальныя левыя палітычныя сілы, якія адкрыта дэманструюць свае сімпатыі курсу Пуціна», — разгорнута паясніў сваё бачанне журналіст Віктар Чарнішук падчас нашай гутаркі.

## Чэхія — рэшткі камунізму і крамлёўскага ўплыву

Не меншы ўплыў прапагандыстаў і палітыкаў РФ існуе ў Чэхіі, якая мае даўнія палітычныя кантакты з Расіяй і была цэнтрам прыцягнення для чэшскіх камуністаў у гады росквіту Савецкага Саюза. Цяпер таго сяброўства даўно няма, але нават рэшткі мінулага ўплыву ўражваюць, бо гэта — і немалое прадстаўніцтва камуністаў у парламенце, і лаяльнасць прэзідэнта ды яго галаслоўныя палітычныя прарасійскія заявы, дзейнасць расійскіх банкаў на тэрыторыі Чэхіі, розных асацыяцый, таварыстваў, НДА і расійская дыяспара ў Карлавых Варах.

Дарэчы, з гэтым звязаная адна вельмі цікавая гісторыя, якую мне распавёў чэшскі журналіст Яраслаў Пешак. Калі ў курортным мястэчку Карлавы Вары добраўпарадкавалі парк і разважалі, чыё імя яму прысвоіць, руская дыяспара, якая вельмі любіць гарадок яшчэ з царскіх часоў, хутка мабілізавалася і прапанавала назваць яго імем Пятра І, у гонар якога ўжо быў мемарыял у горадзе. Але паводзіны рускіх былі настолькі самаўпэўненымі і нахабнымі, што складвалася адчуванне, быццам яны ў сябе дома. Такія дзеянні выклікалі адваротную рэакцыю: парк назвалі ў гонар забітай расійскай апазіцыйнай журналісткі Ганны Паліткоўскай. І адбылося гэта па ініцыятыве Марэка Свабоды, кіраўніка Цэнтра дэмакратыі і абароны правоў чалавека People in Need.

То-бок супраціў ёсць, да таго ж вельмі крэатыўны і дзейсны. Але ўсё роўна частка палітычных эліт да гэтага часу верная

Крамлю і расійскім спецслужбам. Гэта дазваляе Расіі ствараць інфармацыйныя прэцэдэнты, як, напрыклад, адкрыццё нікім не прызнанага «дыпламатычнага прадстаўніцтва ДНР» або неаднаразовае блакаванне ў парламенце галасавання за гандлёвую асацыяцыю з Украінай.

Расія спрабуе канвертаваць рэшткі ўплыву Савецкага Саюза ў любой краіне, не грэбуючы ідэалогіяй. З-за гэтага нават франтысцкая ідэалогія «рускага свету» з'яўляецца вельмі расплывістай і неабгрунтаванай. Бо яе мэта — не мабілізаваць, а прынамсі не абмяжоўваць. Інакш кажучы, калі ў Сірыі засталіся старыя кантакты з сям'ёй Асадаў, то пад гэтае старое сяброўства ўжо можна планаваць спецаперацыі, прыкрываючыся барацьбой супраць ІДІЛ і абаронай праваслаўных хрысціян. І гэта ўпісваецца ў рамкі ідэалогіі «рускага свету».

Гэтак жа адбываецца супрацоўніцтва з чэшскімі камуністамі, нямецкімі рускімі, аргенцінскімі левымі, грэцкім духавенствам і многімі іншымі групамі ва ўсім свеце, дзе засталіся старыя напрацоўкі Савецкага Саюза або рэлігійныя кантакты Расійскай імперыі. Дзіўнае спалучэнне, у якім амаль няма ідэалогіі, а ёсць толькі жаданне стварыць уласную сетку палітычнага і сацыяльнага ўплыву ва ўсім свеце, стварыць міф пра супердзяржаву, вярнуцца ў старыя часы халоднай вайны і лакальных ваенных канфліктаў.

## Мэтавая аўдыторыя «рускага свету»

Мэтавай аўдыторыяй «рускага свету» за мяжой, за межамі былога Савецкага Саюза, у краінах ЕС з'яўляюцца людзі, якія не змаглі знайсці сябе ў сацыяльнай іерархіі ўласных краін. Пераважна гэта людзі, якія пакінулі СССР пасля яго развалу і пераехалі ў еўрапейскія дзяржавы, маючы там родныя сувязі. Але яны так і не вывучылі мову краіны на ўзроўні, дастатковым для высокааплатнай пасады, не змаглі прыняць традыцый краіны і яе сацыяльных законаў і сацыяльнай дамовы. Гэтыя людзі падзяляюць грамадства на «мы» і «яны», жывуць тэрытарыяльна ў Германіі, Эстоніі, Чэхіі, а ментальна ўсё адно застаюцца ў Расіі. Змяніўшы тэрыторыю жыцця, яны не змянілі прасторы

свайго знаходжання, і далей жывучы па старых звычках, глядзячы расійскае ТБ і сочачы за расійскай палітыкай, якая ўжо даўно не ўплывае на іх жыццё. Пад гэтую катэгорыю трапляе сярэдняя і старэйшая ўзроставыя групы.

Моладзь, наадварот, хутка інтэгравалася ў сучасны свет і грамадства краіны пражывання. Атрымала высакаякасную адукацыю, мае годныя працоўныя месцы і выдатныя эканамічныя і сацыяльныя перспектывы. Выкарыстоўваць апошніх у прасоўванні ідэі «рускага свету» амаль немагчыма, маніпуляваць, запалохваць або выводзіць на сантыменты — таксама. Гэта людзі, якія ўжо перарэзалі пупавіну Савецкай Расіі і рускасці, стаўшы паўнапраўнымі паспяховымі грамадзянамі свету.

Калі даследаваць аўдыторыю завербаваных у ІДІЛ маладых людзей і апісаную вышэй старэйшую ўзроставую групу, то пабачым шмат падобных рыс з мэтавай аўдыторыяй «рускага свету»: адчуванне несправядлівасці, немагчымасць стаць часткай грамадства, у якім пражываеш, нянавісць да гэтага грамадства, непрыманне каштоўнасцей і жаданне вярнуць гістарычную справядлівасць. Адзіная розніца — ідэалогія Ісламскай дзяржавы больш радыкальная, менш сентыментальная, больш маладая і пасіянарная.

У Расіі ўся агрэсія сканцэнтраваная ў руках уладаў, яны стаяць за падзеямі ў Грузіі, Украіне, Сірыі, правакацыямі на тэрыторыі балтыйскіх краін. Тады як ІДІЛ ваюе па сеткавай стратэгіі. Таму адзінае, на што цяпер здольныя прыхільнікі крамлёўскай ідэалогіі, — маўклівая падтрымка і гатоўнасць прызнаваць праўдзівасць крамлёўскай хлусні. Аўдыторыю характарызуе высокі ўзровень тэлевізійнай залежнасці і надзвычайная пасіўнасць. Хоць апошняя акалічнасць, на жаль, з часам можа змяніцца.

# РАЗДЗЕЛ II. ПРАПАГАНДА

*Мэта гэтай вайны — не пераканаць, як у класічнай прапагандзе, а зрабіць інфармацыйнае поле брудным. Яе мэта — каб ніхто нікому не давяраў.*

*Яны кажуць: ты не павінен нам верыць, але і тое, і другое — таксама прапаганда, і там няпраўда. Нікому не вер. Калі інфармацыйнае поле забіта, усё, што працуе, — страх, паніка, апатыя. Гэта такая тэрарыстычная атака на інфраструктуру розуму*[9].

*Пітэр Памяранцаў —*
*брытанскі журналіст*

## Прапаганда і медыяманіпуляцыі — аналіз кейсаў

Акрамя ваеннай і палітычнай дэстабілізацыі Украіны, прарасійскія сілы вельмі шырока выкарыстоўваюць інфармацыйную дэстабілізацыю, прыцягваючы ўсе віды камунікацыі, не грэбуючы ні старымі, ні новымі формамі. Ад тэлебачання, газет, радыёсувязі — да прапаганды і распаўсюджвання панікі праз інтэрнэт, радыё, раздачу ўлётак, бясплатных друкаваных СМІ і нават SMS-рассылкі.

Кожная з форм знаходзіць новыя і крэатыўныя праявы ў залежнасці ад таго, на якую аўдыторыю арыентаваны кантэнт. Падрыў стабільнасці ўнутрыпалітычнай сітуацыі — адзін з метадаў Крамля. Калі незадаволенасць украінскай нацыянальнай уладай падаецца як татальная дзяржаўная здрада, гэта сведчыць аб працы расійскіх тэхнолагаў.

Каб як мага лепш зразумець сутнасць расійскага знешняга інфармацыйнага ўплыву на тэрыторыі Украіны, Грузіі, краін Балтыі, варта разгледзець уплывы ўнутраныя: як менавіта ўнутры самой Расіі адбываецца маніпуляцыя свядомасцю, кіраванне масамі, як фармуецца, уласна, сама прапаганда.

[9] http://www.pravda.com.ua/articles/2015/03/31/7063251/, «Українська правда», 31 березня 2015 року.

Такая палітыка дае высокі рэйтынг Пуціну, забяспечвае бачнасць палітычнай стабільнасці, спрыяе адводу вачэй у народных масах. У іншых краінах пры такіх умовах ужо рашыліся б на ваенны пераварот, рэвалюцыю або шырокамаштабны мірны пратэст.

Расійскі прэзідэнт Уладзімір Пуцін цалкам кантралюе расійскае інфармацыйнае поле, усе медыя і ўсе тэлевізійныя каналы. Асабліва тэлевізійныя каналы. Дзякуючы гэтаму яму ўдалося выбудаваць эфектыўную інфармацыйную машыну, якая заўсёды выкарыстоўвалася для ўнутранай электаральнай палітыкі, для таго, каб можна было заставацца пры ўладзе, нягледзячы ні на што, нават на канстытуцыю. Такая палітыка пачала прыносіць свае плады падчас знешніх ваенных аперацый — спачатку ў Грузіі, а затым і ва Украіне.

Украінскі журналіст Ігар Салавей вылучае наступныя ***прыклады медыяманіпуляцый расійскімі сродкамі масавай інфармацыі***:

• падмена фактаў;

• падача невядомага інфармацыйнага рэсурсу (блог, фіктыўныя СМІ і да таго падобнае) як крыніцы інфармацыі;

• цытаванне неіснуючых або малавядомых спікераў і экспертаў;

• наўмыснае пазбяганне думкі сапраўды аўтарытэтных каментатараў, якія змогуць грунтоўна растлумачыць рэальны сэнс падзеі;

• «спасылка на аўтарытэт»: калі не спецыялісты, а, напрыклад, вядомыя спевакі, акцёры, спартсмены каментуюць палітычныя падзеі, у якіх яны не разбіраюцца, пры гэтым на ТБ іх словы падаюцца як сенсацыйнае і экспертнае меркаванне, бо выкарыстоўваецца высокі статус каментатара гэтай падзеі, незалежна ад яго спецыяльнасці;

• няпоўная і наўмысна недакладная падача цітраў, выкарыстанне каментароў асоб з выдуманымі і разадзьмутымі пасадамі і статусам для стварэння пазітыўнага іміджу РФ;

• вырыванне з кантэксту;

• спасылкі на старыя навіны, якія да моманту публікацыі набываюць новае значэнне;

• штучнае ўвядзенне ў інфармацыйную прастору тэм, напрыклад, праз пастаноўку пытання вядомаму спікеру ў прысутнасці СМІ.

Асобна варта сказаць пра наўмысна скажоныя пераклады замежных матэрыялаў, што спрыяе штучнай маніпуляцыі фактамі з боку расійскага медыяпрама ў пытаннях спраў у Еўропе. Перыядычна еўрапейскія журналісты з усмешкай раскрываюць дэталі расійскай прапаганды, якая тонка выкарыстоўвае вучэнне не толькі Гебельса, але і іншых вядомых хлусоў і маніпулятараў[10].

## Хто адказвае за прапаганду на тэхнічным узроўні?

Асвятленнем тэмы вайны ў структуры расійскіх СМІ займаюцца аддзелы надзвычайных здарэнняў (рус. «отделы происшествий»), якія амаль на 90% укамплектаваныя або кадравымі сілавікамі, або выхадцамі з сілавых органаў — яны як ніхто разбіраюцца ў тэме вайны, маюць медыйную падрыхтоўку і могуць забяспечваць «правільнае» інфармацыйнае суправаджэнне. Журналістыка для іх не спецыяльнасць, а інструмент забеспячэння баявых дзеянняў. З-за гэтага ў іх няма ні згрызотаў сумлення, ні пэўных стандартаў паводзін, ні жадання працаваць у інтарэсах грамадства — няма ўсяго таго, што павінна быць у прафесійнага журналіста. І менавіта людзі такой прафесіі адказваюць за інфармацыйнае і маніпулятыўнае напаўненне медыйнага поля.

Не заўсёды ангажаваны сам журналіст — часта вялікую ролю адыгрывае яго рэдактар: менавіта ён пасылае ў патрэбныя месцы журналіста з наборам пытанняў, тэм або проста для фіксацыі падзей, якія будуць мець патрэбны ўплыў на медыйнае поле, бо самі па сабе нясуць ідэалагічную нагрузку.

Такая сістэма ў Расіі вядзе свой пачатак яшчэ з часоў СССР, але новае дыханне атрымала пасля чачэнскіх кампаній.

Тады шмат каго з ветэранаў перакваліфікавалі ў журналістаў і адпраўлялі працаваць у СМІ, дзе яны працавалі на два ведам-

---

[10] http://news.liga.net/video/world/10857774-oni_vse_vydumali_krupneyshiy_tv_kanal_frantsii_dokazal_lozh_smi_rf.htm

ствы — афіцыйнае і вайсковае. Гэта сапраўды вельмі зручна для палітычнай сістэмы з пункту гледжання менеджменту, бо складана знайсці кагосьці больш вымуштраванага і гатовага выконваць каманды, чым вайскоўцы ў Расіі. А пытанне журналісцкага гонару там наогул ніхто не падымае, бо ўсе яны — вайскоўцы, работнікі спецслужбаў і сілавікі. У прадстаўнікоў гэтых прафесій загады не абмяркоўваюць, а інфармацыю бачаць толькі як інструмент выканання задач свайго кіраўніцтва. Імітацыя журналісцкіх стандартаў для іх — вымушанае дзеянне, чымсьці падобнае да маскіроўкі на чужой тэрыторыі.

Дарэчы, пошук таленавітай моладзі вельмі часта адбываецца на ваенных кафедрах пры журналісцкіх факультэтах. Адабраных кандыдатаў затым могуць суправаджаць ужо пасля працаўладкавання або прыцягваць да працы ў інфармацыйных кампаніях для выканання кропкавых заданняў.

Усе дзяржаўныя і шэраг прыватных СМІ ператварыліся ў інфармацыйныя падраздзяленні забеспячэння суправаджэння рэальных баявых дзеянняў. Журналісты выконвалі ролю ваенкараў, калі меліся здымаць матэрыялы ў месцах запуску ракет. Вельмі часта сам журналіст не разумеў сваёй ролі і верыў, што выконвае прафесійную задачу. Але з цягам часу, з досведам журналіст здагадваецца, дзе і калі яго выкарыстоўвалі, маніпулявалі ім і давалі быццам бы незаангажаваныя заданні, якія мелі прапагандысцкую мэту.

Па словах Ігара Салаўя, асобную працу ўладныя органы праводзяць на ўзроўні галоўных рэдактараў пэўных выданняў.

Каманды звычайна даюць на аснове вусных пажаданняў, забароны ў дачыненні да асобных спікераў і дазволу патрэбных тэзісаў. Хоць пра «тэзіснікі», або, як яшчэ іх любяць называць, «тэмнікі», пішуць журналісты і блогеры, але знайсці пацверджаныя факты складана.

Аналізуючы расійскую інфармацыйную прастору і прарасійскую медыяактыўнасць ва Украіне, у прыватнасці на акупаваных тэрыторыях, можна заўважыць кіраванне інфармацыйнымі плынямі і спосабам каментавання і асвятлення падзей. Прапаганда і маніпуляванне праўдай, падзеямі і фактамі — гэта не столькі журналісцкая тэхніка выканання, колькі правільна

спланаваныя сцэнары, умела расстаўленыя акцэнты і ўдала падабраныя ці нават зрэжысіраваныя падзеі. Для многіх да гэтага часу з'яўляецца загадкай, хто ж, уласна, выконвае гэтую інтэлектуальную працу. Хто за гэта адказвае?

Існуе міф, што гэтым займаецца ледзь не сам Пуцін, бо крамлёўскія кампаніі проста дзівяць сваёй бязлітаснасцю, жорсткасцю і цынізмам. Але гэта, хутчэй за ўсё, няпраўда: Пуцін персанальна не заклапочаны інфармацыйным напаўненнем, прынамсі на тэхнічным узроўні. Хоць зразумела, што менавіта Пуцін задае тон, бо выступае галоўным заказчыкам гэтага прадукту.

***Аляксей Громаў*** (былы прэс-сакратар Пуціна) з камандай, паводле крыніц, цяпер адказвае за ўсю інфармацыйную палітыку на ўзроўні Адміністрацыі прэзідэнта РФ. Менавіта яны «фармуюць сэнсы», задаючы агульны трэнд і кірунак інфармацыйнага асвятлення падзей. Частка напрацовак перадаецца галоўным рэдактарам СМІ, частка — набліжаным экспертам, палітолагам і проста асобам, да меркаванняў якіх прыслухоўваецца грамадскасць. Яны для многіх журналістаў і рэдактараў з'яўляюцца інфармацыйнымі маркерамі, падказваючы, у якім кірунку будзе мяняцца палітычны, медыйны парадак дня, што менавіта плануе адміністрацыя і якую менавіта карцінку хочуць бачыць у Крамлі.

## Хто яны — расійскія СМІ?

Унутраны рынак — Першы канал, «Расія 1», ТНТ, НТВ, СТС, ТВЦ, РЕН ТВ і мноства іншых каналаў — стварае карціну рэальнасці для расійскага грамадзяніна і не толькі. Бо для многіх грамадзян постсавецкіх краін гэтыя каналы з'яўляюцца аўтарытэтнымі. І нават калі расійскія грамадзяне выязджаюць за мяжу, то вельмі часта іх не адпускае родная медыяпрастора, і ў гатэлях Турцыі, Егіпта, Тайланда яны таксама глядзяць любімыя тэлевізійныя каналы.

Але ў цэлым названыя тэлеканалы фармуюць карцінку, якая вызначае светаўспрыманне людзей. Адны з іх больш папулярныя, іншыя — менш, але ўсе разам яны ствараюць уражанне разнастайнасці і даюць адчуванне магчымасці выбару. Бо ў мно-

гіх расіян галоўны аргумент у абарону праўдзівасці атрыманай інфармацыі гучыць так: «я гляджу розныя каналы».

***Феномен Дзмітрыя Кісялёва*** да канца не зразумелы, бо гэта журналіст, які прыязджаў ва Украіну ледзь не ў статусе палітычнага ўцекача. У Расіі ў яго не было магчымасці свабодна займацца любімай справай, быць сумленным журналістам, з-за чаго ён быў вымушаны пераехаць у Кіеў і працаваць на адным з мясцовых каналаў. Але малыя бюджэты, адсутнасць буйнога заказчыка і вялікія тэлевізійныя перспектывы РФ прымусілі яго вярнуцца ў Маскву, дзе з часам ён знайшоў сваё месца, стаўшы цэнтральнай фігурай у крамлёўскай агітацыйнай прасторы.

Па словах Дзяніса Богуша, Кісялёў аказаўся ўніверсальным медыяменеджарам, які змог прапанаваць Крамлю якасны прадукт, які быў якраз да часу: папулярны сярод насельніцтва, упісваецца ў ідэалагічныя рамкі і не патрабуе кансультацый адносна праўдзівасці. Гэта таксама вельмі важна пры рэалізацыі ваенных праектаў.

Дзмітрый Кісялёў вядзе ледзь не самую папулярную тэлеперадачу ў расійскай медыяпрасторы — «Весткі тыдня з Дзмітрыем Кісялёвым», дзе ён дае сваю ацэнку бягучым падзеям. Прафесійна, дакладна, але не вельмі аб’ектыўна.

Брытанскі часопіс The Economist піша: «Новы стыль прапаганды, што паўстае ў асобе Кісялёва, накіраваны на ўзбуджэнне і мабілізацыю аўдыторыі, распальванне нянавісці і страху. Гэты стыль нагадвае оруэлаўскія двуххвілінкі нянавісці працягласцю больш за паўгадзіны».

У снежні 2013 года было абвешчана, што на базе РІА «Навіны» будзе створана новая структура — «Міжнароднае інфармацыйнае агенцтва “Россия сегодня”». Гэта, па сутнасці, быў момант прызнання прапагандысцкага таленту Кісялёва і яго патрэбнасці Крамлю. Згодна з прэзідэнцкім указам, галоўнай задачай новага агенцтва стала «асвятленне за мяжой дзяржаўнай палітыкі Расійскай Федэрацыі і расійскага грамадскага жыцця». Заява Кісялёва была больш сентыментальнай: маўляў, яго місія і місія агенцтва — фармаванне справядлівага стаўлення да Расіі і дэманстрацыя яе добрых намераў. І гэта напярэдадні анексіі Крыма. Дарэчы, інфармацыя аб няшчырасці слоў Кісялёва і сапраўдная мэта яго прызначэння прасачыліся праз узламаныя ха-

керамі акаўнты мэйлаў і мэсэнджараў журналіста. Там гаворка ідзе пра куплю навуковых званняў і артыкулаў для жонкі, кватэры плошчай 200 квадратных метраў у цэнтры Масквы і да таго падобнае. Пра гэта чамусьці маўчыць галоўны рупар Крамля.

## LifeNews — канал вайны?

Расійскі рынак ніколі не вылучаўся празмернымі рэкламнымі бюджэтамі або наяўнасцю СМІ, якія працавалі б за падпіску ці мелі б любую іншую недзяржаўную або неалігархічную форму існавання. Галоўным заказчыкам медыябізнэсу з’яўляецца дзяржава. Нават алігархі маюць тут відавочна другасную ролю, бо яны не маюць ніякага права выкарыстоўваць медыя супраць дзяржапарату, асабліва калі гэта тычыцца Крамля. Чаго не скажаш пра Украіну, дзе нацыянальныя каналы могуць не толькі крытыкаваць дзейную ўладу любога перыяду, але і нават адкрыта паліваць брудам. У Расіі гэта строга забаронена. Вядома, алігархам можна выкарыстоўваць СМІ ў вайне адзін супраць аднаго, для абароны або нападу, для прыслужвання палітычным вярхам, але ні ў якім разе не супраць яе. Гэта строга караецца. І прыклады лёсаў Гусінскага, Беразоўскага і шэрагу іншых ярка захаваліся ў свядомасці кагорты найбагацейшых расіян, якіх прынята называць алігархамі.

Адначасова расійскі рынак медыя жывы і вельмі прафесійны дзякуючы вялікаму бюджэту, хоць і дзяржаўнаму. Уласна, адным з такіх СМІ, якія спатрэбілася дзяржаве і якія былі актуальныя ў перыяд ваеннай агрэсіі ва Украіне, стала выданне LifeNews. З-за празмернай ангажаванасці, хлусні, прапаганды і маніпуляцый неўзабаве ў прафесійным асяроддзі, а пасля і ў шырокіх колах яго пачалі называць LieNews. СМІ, якое першае пачало асвятляць вайну, у прыватнасці, у гарачых пунктах. Журналісты практычна суправаджаюць салдат, атрымліваюць максімальны доступ да патрэбнай інфармацыі і кантэнту вайны. Зразумела, што для аднабокага асвятлення падзей на Данбасе, Крыме ці ва Украіне ў цэлым. Амаль усе журналісты і медыяэксперты, з якімі я меў зносіны на працягу напісання кнігі, сцвярджалі, што ўсё гэта з-за камерцыйнага фактару. Нават без усялякай ідэалогіі. Бо

на грошы Канстанціна Малафеева, напрыклад, была забяспечана інфармацыйная і фінансавая падтрымка вайны. Хоць красамоўным з’яўляецца і сам факт таго, што заснавальнікам і кіраўніком LifeNews з’яўляецца Арам Габралянаў, у партфоліа якога — шэраг скандальных выданняў і жаданне атрымаць вялікія бюджэты.

## Russia Today — міжнародны рупар Пуціна

Працуючы з унутраным электаральным рынкам і з краінамі былога Савецкага Саюза, якім таксама навязваецца расійская медыяпрастора, палітычная кан’юнктура, вобразы герояў, стаўленне да ворагаў, Расія да гэтага часу спрабуе ўплываць і на рынак знешні, даносячы патрэбныя ёй мэсэджы.

Спачатку канал Russia Today (RT) стваралі як крыніцу пазітыўных навін пра Расію. Але ён не змог зацікавіць гледача ў свеце, таму канал пераарыентавалі на тэму сусветных змоў і крытыку Злучаных Штатаў. Таму цяпер на RT ужо не распавядаюць пра тое, якая добрая Расія. Яны больш кажуць пра тое, які дрэнны Захад, што вельмі часта адпавядае настроям еўраскептыкаў або тых, хто ненавідзіць ЗША, напрыклад, у Лацінскай Амерыцы, у некаторых краінах Азіі, дзе могуць захоўвацца антыамерыканскія настроі.

Але магутнага сігналу і палітычнага ўплыву ў галоўнага замежнага рупара Крамля няма. Усе рэйтынгі — у рамках хібаў сацыялагічных апытанняў. Да таго ж, актыўныя журналісты ўжо даўно падымаюць пытанне мэтазгоднасці інструмента, які не адпавядае сваёй заяўленай публічнай місіі. Нават на міжнароднай арэне ён вельмі часта ўспрымаецца як інструмент прапаганды, а больш за ўсё праглядаў у яго ў самой Расіі.

Такі канал патрэбны для самаўсведамлення імперскасці і як дарагая цацка, якую маюць заможныя краіны, але якой у РФ да гэтага часу не было. Вось і ідуць дзясяткі мільярдаў расійскіх рублёў не на сацыяльную абарону насельніцтва, дарогі ці заробкі настаўнікам і медыкам, а на цацкі для палітыкаў для імітацыі адчування палітычнага ўплыву ў свеце[11].

[11] https://noodleremover.news/russia-today-информационная-война-и-миллиарды-просморов-откуда-берутся-цифры-5265a94d0b6f#.ct2mbq9ed

Варта таксама адзначыць і крэатыўнасць расійскай прапаганды, якая, акрамя афіцыйных каналаў, спрабуе шукаць і новыя формы ўплыву і прапаганды за мяжой. У прыватнасці, пачынаючы з 2014 года зафіксаваны шэраг выпадкаў, якія дазваляюць казаць не пра супадзенні, а хутчэй пра тэндэнцыю, калі расійскія журналісты і медыяменеджары з ліку былых, а часам і дзейных сілавікоў пачалі пераязджаць на Захад (у асноўным у краіны Еўропы) і адкрываць там уласныя прадакшэн-студыі. Там яны наймаюць мясцовы персанал, і выраблены імі інфармпрадукт дэманструецца на мясцовых СМІ ўжо не як расійскі, а як чэшскі, польскі, нямецкі і да таго падобнае. Знешне ўсё выглядае як натуральны працэс міграцыі інтэлектуальных кадраў. Але паходжанне гэтых людзей, іх прафесійная падрыхтоўка і асаблівасць інфармацыйных матэрыялаў дазваляюць зрабіць здагадку, што рэалізацыя такой схемы не абышлася без удзелу спецслужбаў РФ.

Ігар Салавей сцвярджае: «Незалежныя СМІ ў Расіі немагчымыя па многіх прычынах, але магчымыя асобныя праблiскі накшталт «Новай газеты», NewTimes, «Дождя», OpenRussia. Вельмі часта гэта больш падобна да гераізму, чым да штодзённай прафесійнай журналістыкі. Але самае галоўнае — у Расіі ёсць ідэалагічна адэкватныя і вельмі прафесійныя журналісты, нават нягледзячы на дзяржаўны ціск і ангажаванасць у СМІ.

У гэтым кантэксце варта адзначыць матэрыялы Паўла Каныгіна, Алега Кашына і ўласнае расследаванне Барыса Нямцова па асвятленні агрэсіі РФ на Данбасе. Гэтыя матэрыялы шмат у чым сталі пераломнымі падчас інфармацыйнай вайны. У той жа час мелі адваротнае дзеянне ў самой Расіі, часта і трагічнае. Напрыклад, забойства Барыса.

Вельмі няправільна казаць, што ў Расіі няма журналістыкі або сумленных журналістаў. Яны ёсць, прычым вельмі і вельмі прафесійныя. Але ўмоў і запыту на сумленную журналістыку няма».

Дзейнасць расійскіх журналістаў таксама мае ўплыў на падзеі ва Украіне. Як станоўчы, так і адмоўны, якога, зразумела, больш. Уплыў прарасійскіх СМІ ва Украіне рэалізуецца праз шэраг інтэрнэт-выданняў, ТБ, радыё і друкаваную прэсу, аўта-

рытэтных асоб, палітолагаў, палітыкаў і чыноўнікаў. Прынамсі гэта ўсё працавала да акупацыі Крыма і Данбаса. Але пасля гэтая піраміда паваліліся, хоць і не перастала функцыянаваць цалкам, фармуючы ўласную інфармацыйную палітыку праз кабельныя сеткі, інтэрнэт і роднасныя сувязі ўкраінцаў і расіян.

## На каго разлічана прапаганда?

Прапаганда апошніх гадоў з'яўляецца больш ваеннай, чым унутрыпалітычнай ці нават электаральнай. Бо будуецца на страху, паніцы і пастаянным адчуванні небяспекі. Паліттэхнолаг Дзяніс Богуш вылучае чатыры ўзроўні кантэнту, разлічаныя на розныя сацыяльныя групы, тэрыторыі і эмацыйна-інтэлектуальнае ўспрыманне:

*1. Інстынктыўна-эмацыйны (страх, трывога, шок)*

Неабходны для любога інфармацыйнага ўздзеяння. Таму забойства, шок і страхі — галоўныя акцэнты тэлевізійных і медыйных сюжэтаў аб сітуацыі ва Украіне. Тут важную ролю адыгрываюць абстрэлы мірных кварталаў і сістэма чутак. Важна трымаць як мага большую частку насельніцтва на гэтым узроўні, на ім крытычнае мысленне мінімальнае.

*2. Рацыянальны (аргументацыя, карцінка)*

Спецыяльная аргументацыя і інтэрпрэтацыя кожнай падзеі гэтай вайны. Для тых, хто спрабуе рацыянальна думаць у карціне свету расійскай прапаганды, ёсць свая аргументацыя кожнай падзеі. Хаця староннім назіральніку ўсё гэта можа здацца трызненнем, але ў мэтавага гледача (спажыўца) усё складваецца ў сваю карцінку і мае сваю логіку. На гэтым узроўні нават сваякі не могуць зразумець адзін аднаго, калі адзін з іх з'яўляецца спажыўцом расійскай прапаганды, а другі — не.

*3. Семантычны (новыя стэрэатыпы, маніпуляцыя гісторыяй)*

Трэці ўзровень для тых, каму не дастаткова простых тлумачэнняў, — яны чытаюць кнігі і самі могуць зрабіць аналітычныя высновы. Для гэтай мэтавай аўдыторыі і перапісваецца гісторыя Расіі ад эпохі Пятра I да сённяшніх «новых гісторый Крыма» і «рускага народа Данбаса» і гэтак далей.

Варта сказаць, што для гэтай мэтавай аўдыторыі выдаецца вялікая колькасць кніг і здымаюцца сотні фільмаў і серыялаў.

*4. Архетыпічны (групавыя інстынкты, культура)*

На чацвёртым узроўні — канкурэнцыя культур або вайна ідэнтычнасці «Украіна – Расія», «Расія – Захад». Гэта ўзровень архетыпаў, культурнай барацьбы, групавых інстынктаў і стэрэатыпаў, на якім і прымяняюцца маніпулятыўныя тэхналогіі.

## Хто такія «гастралёры»? Трансфармацыя інфармацыйных пагроз у рэальныя фізічныя страты

У чым жа рэальная небяспека «рускага свету»? У тым, што ён шырыцца гібрыднымі метадамі, спачатку ствараючы ідэалагічныя прэцэдэнты, якія пасля наносяць рэальны фізічны ўрон. І прыкладаў тут мноства. Подкуп дэпутатаў мясцовых саветаў, якія робяць заявы ў прэсе пра тое, што тэрыторыя хоча аддзяліцца, арганізуюць рэферэндум, а затым уводзяць войскі і арганізуюць паўстанне ўзброеных імі ж сепаратыстаў. Вынік — тысячы забітых, крах эканомікі рэгіёну, два мільёны перасеыленых асоб.

Самае галоўнае ў канцэпцыі «рускага свету» — гэта кіраванне хлуснёй. Для гэтага ствараюцца інфармацыйныя нагоды, якія трапляюць у СМІ, што, уласна, іх легалізуюць. Пасля гэтага Крэмль на іх рэагуе ў рамках зададзенай адэкватнасці, у рамках чаканняў расіян, якімі ўмела маніпулюе прэса. І ўсё роўна, ці былі насамрэч гэтыя інфармацыйныя прэцэдэнты, таму што з моманту легалізацыі і паказу іх на ТБ яны «пачынаюць жыць сваім жыццём», і ці існавалі яны насамрэч, ужо нікога не хвалюе. Звычайна такія кейсы — тыповыя шакуючыя «інфармацыйныя бомбы».

Напрыклад, распяцце маленькага хлопчыка, якое ўкладваецца ў культурны і рэлігійны код часткі рускага насельніцтва. Яно з'яўляецца праваслаўным, і менавіта такое варварства для іх — ці не самая абуральная праява злачыннасці, з-за чаго яны даюць нефармальны мандат уладзе на любы жорсткі адказ. Забойствы, здзекі, разбурэнні і абстрэлы — на ўсё гэта насельніцтва дае дазвол, бо лічыць адказ на «распяцце маленькага хлопчыка»

святым. Гэта нешта накшталт крыжовых паходаў і спальвання ведзьмаў, калі пад прыкрыццём святасці чыняцца ці не самыя жорсткія злачынствы ў гісторыі чалавецтва. Адзіная праблема, што і паходы, і вогнішчы былі ў эпоху Сярэднявечча, а не ў XXI стагоддзі, калі светам кіруюць інфармацыйныя тэхналогіі, аднаўляльная энергетыка і дэмакратычныя грамадскія трэнды.

Даючы ўладзе мандат на гвалт, насельніцтва чакае, што ўлада і дзяржава будуць абараняць іх саміх ад такога гвалту на іх тэрыторыі. Гэта і стала апраўданнем для палітыкі Крамля: маўляў, нашы войскі там толькі для таго, каб не дапусціць такой сітуацыі ў нас. Зразумела, што такія пакты і дамоўленасці не з'яўляюцца публічнымі, пра іх ніхто не кажа ўслых, але ўсе з імі згаджаюцца. Маем нейкую «інфармацыйна-ваенную дамову» паміж грамадствам і дзяржавай, калі галоўным сэрвісам дзяржавы з'яўляецца не забеспячэнне высокага ўзроўню жыцця, медыцыны, адукацыі і бяспекі, а стварэнне атмасферы страху для насельніцтва з мэтаю, каб потым быццам бы абараняць насельніцтва ад нібыта рэальных наступстваў гэтага страху.

Каб ствараць яркія «інфармацыйныя бомбы», крамлёўскаму медыйнаму прадакшэну патрэбныя якасныя прафесійныя крыніцы. Бо трэба ствараць сенсацыі кожны дзень. Неабходна шакаваць насельніцтва, каб яно не пачало асуджаць выкарыстанне войскаў, бяздумнае расходаванне бюджэтных сродкаў і смерць сваіх суайчыннікаў на тэрыторыі некалі брацкай дзяржавы. Для гэтага былі запушчаныя прафесійныя медыйныя гастралёры ў так званыя «палі», на месцы патэнцыйных сепаратысцкіх тэрыторый, дзе яны павінны былі рэалізаваць, прапрацаваць атрыманы ад заказчыка сцэнарый.

Але калі правесці невялікі кантэнт-аналіз, можна адзначыць вельмі цікавы факт: адны і тыя ж асобы выступаюць у розных іпастасях. Сёння гэта настаўніца ў Адэсе, якая выступае за «рускі свет», заўтра гэта медсястра з Марыупаля, якая пацярпела ад «хунты», яшчэ праз месяц гэта ўдава, якая страціла мужа, які абараняў Данецк ад «укропаў». Заўсёды эмацыйна, заўсёды са слязамі і крыкамі, пераканаўча і жаласліва. У такое вельмі лёгка паверыць. Асабліва калі не адыходзіць ад тэлевізара і спажываць кантэнт толькі з адной крыніцы, нават калі

гэта дзясяткі розных ТБ-каналаў, інтэрнэт-СМІ і друкаваная прэса. Бо застаецца факт: крыніцай з’яўляецца палітычнае кіраўніцтва Крамля, якому патрэбна менавіта такая маніпуляцыя ўласным насельніцтвам.

Тэхнічна ўсё арганізаваць вельмі проста, бо для гэтага патрэбныя толькі невядомыя публіцы прафесійныя акцёры правінцыйных тэатраў. Яны за ганарары гатовыя граць любыя ролі, нават падыгрываць ваеннай агрэсіі, будучы салдацікамі інфармацыйнай кампаніі. Ім даюць тэзісы на вычытку і адпраўляюць у патрэбнае месца, дзе яны кантактуюць з апаратарам і журналістамі, здымаюць патрэбны сюжэт і мяняюць лакацыю, а затым атрымліваюць новую ролю. Медыяпрам мае патрэбу ў дынаміцы і эмоцыях, якія ў рэальным жыцці забяспечыць вельмі цяжка, менавіта таму і патрэбныя такія персанажы, якія змогуць прафесійна сыграць ахвяр і сведак. І галоўнае, усе яны гатовыя легалізаваць любую хлусню, прыдуманую ў крамлёўскім цэнтры, каб стварыць інфармацыйны плацдарм для наступлення рэальных войскаў і рэальных танкаў.

## Хто такія эксперты? Або як усё можна растлумачыць хаця б пастфактум

Нельга сказаць, што ангажаваныя, ілжывыя і фэйкавыя эксперты сталі інавацыяй крамлёўскай прапаганды апошніх гадоў, але менавіта яны запусцілі гэты інструмент у прамысловых маштабах і на міжкантынентальным узроўні. З-за гэтага эксперты-каментатары расійскіх СМІ сталі легендамі журналістыкі ва ўсім свеце, прыкладам таго, чаго нельга рабіць у прафесійнай журналістыцы, і прадметам кпінаў многіх грамадзян, чые краіны вышэйзгаданыя эксперты абмяркоўваюць на расійскіх каналах.

Вельмі цяжка аспрэчыць той факт, што каментатары, лаяльныя да Крамля і яго СМІ, сталі інструментам прапагандысцкага ўплыву і выкарыстоўваюцца для абароны ўласных міфаў або інфармацыйных нападаў на патрэбныя аб’екты (замежныя ўрады, асобных палітыкаў, падзеі ці нават цэлыя краіны). Таму, калі няма відавочных доказаў, калі патрэбна ўдалая і дакладная маніпуляцыя, калі трэба на чорнае сказаць белае, журналісты крамлёўскіх

медыя звяртаюцца да так званых «незалежных экспертаў», якія сталі надзейнай крыніцай інфармацыйнай бязглуздзіцы, антыамерыканскіх сенсацый і заклікаў на карысць Расіі.

Паводле стандартаў журналістыкі, ствараючы матэрыял, журналіст павінен абапірацца на рэальныя, праўдзівыя і наяўныя факты. Складаючы аналітычны матэрыял, журналіст мае поўнае права звяртацца да меркавання эксперта, калі той мае адпаведную кампетэнцыю, рэпутацыю ў аўдыторыі і з'яўляецца незаангажаваным. Але ці заўсёды расійскія журналісты адпавядаюць гэтым стандартам? На гэтае пытанне вельмі дакладна адказаў былы галоўны рэдактар сайта inosmi.ru (РІА «Навіны»), заснавальнік і аўтар блога «Лапшеснималочная» (https://noodleremover.news) Аляксей Кавалёў у інтэрв'ю для birdinflight.com.

(*) Усё вельмі хутка змянілася. Гэта супала з пачаткам Еўрамайдану ў Кіеве, Крымам і поўнамаштабнай вайной на Данбасе. 9 снежня 2013 года Уладзімір Пуцін падпісаў загад аб расфармаванні РІА «Навіны» (на яго базе стварылі міжнароднае інфармацыйнае агенцтва «Россия сегодня»), а ў сакавіку 2014-га ўжо канчаткова змянілася кіраўніцтва. Яно было заточана пад максімальную лаяльнасць да Крамля. Прафесіяналізм і журналісцкая этыка аказаліся другаснымі.

У стужцы РІА «Навіны» пачалі з'яўляцца немагчымая раней рэчы, якія супярэчаць прынятым журналісцкім стандартам. Напрыклад, за экспертаў пачалі выдаваць тых, у каго ці не было для гэтага падстаў, ці хто як эксперт сядзеў на зарплаце. На RT і цяпер ёсць набор людзей, якія качуюць з перадачы ў перадачу. Кожны раз яны называюцца інакш: журналіст, аналітык, эксперт, пісьменнік. На самай жа справе яны ні першае, ні другое, ні трэцяе. Гэта можа быць чалавек, які ні разу ў жыцці не выязджаў са штата Мінесота, спявае ў мясцовым пабе, але яго альтэр-эга — эксперт па геапалітыцы. І вось ён выступае на Russia Today, разважаючы, як уладкаваць планету[12].

У сваім блогу «Лапшеснималочная» Аляксей Кавалёў прыводзіць некалькі гісторый так званых экспертаў, раскрываючы іх супярэчлівую рэпутацыю. Як прыклад — гісторыя Скота Бэ-

[12] https://birdinflight.com/ru/media-2/aleksej-kovalyov-esli-rossiyanm-nachnyot-zadumyvatsya-chto-proishodit-emu-budet-proshhe-utopitsya.html

нета (Scott Bennett), якога называюць у расійскіх СМІ «адстаўным афіцэрам арміі ЗША і экспертам па барацьбе з тэрарызмам», што дае каментары ў стылі: «Пуцін — гэта найлепшае, што здарылася з Расіяй за апошнія сто гадоў» і да таго падобнае.

А. Кавалёў адзначае:

(*) На самай справе Бэнет — не ветэран і тым больш не эксперт у барацьбе з тэрарызмам, а махляр з багатай фантазіяй. У 2011 годзе Бэнет быў асуджаны да трох гадоў зняволення за тое, што паспяхова выдаваў сябе за кадравага афіцэра і нават атрымаў жалаванне і кватэру на вайсковай базе ў Фларыдзе. У рэшце рэшт Бэнета ў нецвярозым стане і з багажнікам, поўным зброі, затрымалі на КПП. Суддзя, якая абвяшчала прысуд, сказала, што Бэнет, «відавочна, не разумее розніцы паміж праўдай і сваімі выдумкамі, у якія сам верыць». Бэнету далі тры гады, а ў 2014 годзе ён выйшаў — і адразу пачаў з’яўляцца на Sputnik і ў эфіры RT як «эксперт па барацьбе з тэрарызмам»[13].

Падобная гісторыя і ў Аляксандра Меркурыса (Alexander Mercouris), «юрыста, эксперта па міжнародным праве», а таксама многіх экспертаў з ЗША, Польшчы, Украіны і іншых краін, у якіх Расія спрабуе асвятляць падзеі з атрыманнем палітычнай і электаральнай карысці для кіраўніцтва Крамля.

Расійскі агітпрам навучыўся маніпуляваць медыйнымі плынямі, выкарыстоўваючы навінны хаос, надзвычайную заінфармаванасць грамадства, якое толькі вучыцца жыць у новых інфармацыйных рэаліях. З-за гэтага можна ў рэжыме 24/7 маніпуляваць інфармацыйнай прасторай не толькі сваёй краіны, але і шэрагу іншых, якія ўваходзяць у пул інтарэсаў, нават захоўваючы пры гэтым бачнасць самых высокіх журналісцкіх стандартаў.

Менавіта інстытуцыя так званых экспертаў дазваляе крамлёўскаму агітпраму згладжваць інфармацыйныя куты, правільна расстаўляць акцэнты і каментаваць у правільным рэчышчы падзеі, якія ўжо адбыліся. І калі дыскрэдытацыя перад нападам — гэта інструмент, які папярэднічае пэўным дзеянням, то эксперты-каментатары звычайна акцэнтуюць увагу на патрэбных заказчыку момантах, каментуючы падзеі, якія ўжо адбыліся.

---

[13] https://noodleremover.news/rutv-crooks-53d90c88411a#.%20d05gad84k

## Маніпуляцыі ў дзеянні. Прыклад у Германіі. Фэйкавыя навіны — элемент гібрыднай вайны на прыкладзе «дзяўчынкі Лізы»

Расійскія маніпуляцыі і скажэнні фактаў сталі тыповай зброяй Крамля не толькі супраць украінскага насельніцтва і жыхароў акупаваных тэрыторый Абхазіі, Паўднёвай Асеціі, Прыднястроўя, Крыма, Данбаса, але і саміх расіян. Дэманізуючы Украіну, прадстаўляючы яе ў вобразе «фашысцкай краіны», яе кіраўніцтва — у вобразе «хунты», а патрыётаў і добраахвотнікаў — у выглядзе батальёнаў карнікаў, Крэмль апраўдвае сваё ўварванне на чужыя тэрыторыі, ваенную агрэсію і мільярдныя выдаткі на вайну.

Разгледзім кейс «згвалтаванай у Германіі рускай дзяўчынкі Лізы», пра якую распавядаў кіраўнік МЗС РФ Сяргей Лаўроў, гісторыю якой падхапілі прарасійскія СМІ ў студзені 2016 года. Гэта адбылося не на тэрыторыі так званага расійскага ўплыву. Гісторыя мае свае прапагандысцкія задачы і з'яўляецца сродкам маніпуляцыі ў гібрыднай вайне. Яна пашырае геаграфію абароны «рускага свету» за межы яго класічных рамак, ставячы пад пагрозу інфармацыйную бяспеку Германіі.

Кароткі змест гісторыі можна даведацца з некалі ліберальнага выдання «Лента.ру».

(*) Гісторыя 13-гадовай берлінскай дзяўчынкі, выкрадзенай і згвалтаванай мігрантамі, ужо некалькі дзён не сыходзіць з першых палос айчынных газет і эфіраў тэлеканалаў. Руская дыяспара (пацярпелая сям'я — перасяленцы з Расіі) на мітынгах патрабуе знайсці і пакараць вінаватых, абвінавачваючы паліцыю ў тым, што яна пакрывае забойцаў і гвалтаўнікоў. Паліцыя Нямеччыны заяўляе, што дзяўчынку ніхто не выкрадаў і не гвалтаваў, а нямецкія СМІ абвінавачваюць расійскіх калег у развязванні прапагандысцкай вайны і нагнятанні нянавісці[14].

Расійскае выданне Meduza, створанае ў кастрычніку 2014 года на тэрыторыі Латвіі пасля таго, як творчы калектыў страціў магчымасць працаваць на вышэйзгаданы сайт «Лента», разглядае гісторыю больш аб'ектыўна, даючы версіі розных бакоў.

---

[14] https://lenta.ru/artides/2016/01/20/girl/

(*) ***Версія пракуратуры Берліна***

У 13-гадовай Лізы былі праблемы з вучобай. Калі бацькоў выклікалі ў школу, дзяўчынка адправілася да свайго 19-гадовага сябра (немец турэцкага паходжання) і засталася ў яго начаваць. Вярнуўшыся дадому, яна прыдумала гісторыю аб згвалтаванні, каб растлумачыць сваю адсутнасць, лічаць у пракуратуры.

Асобу маладога чалавека, у якога заставалася Ліза, устанавілі, вывучыўшы паведамленні на мабільным тэлефоне дзяўчынкі. Дома ў яго знайшлі асабістыя рэчы дзяўчынкі. Падчас допыту юнак і яго маці паведамілі, што 11 студзеня Ліза папрасілася да іх пераначаваць.

Сябар Лізы фігуруе ў справе як сведка, паколькі ў пракуратуры няма доказаў таго, што ў ноч з 11 на 12 студзеня ў дачыненні да дзяўчынкі былі здзейсненыя якія-небудзь сэксуальныя дзеянні. Версію аб згвалтаванні адкінулі пасля медыцынскага агляду: на целе не было пашкоджанняў, што адпавядалі б расказу аб згвалтаванні. Тэлефон Лізы разбіты, у дзяўчынкі выявілі сінякі, пацвярджаюць у пракуратуры; пры гэтым следства не змагло даказаць, што траўмы нанёс ёй нехта іншы.

Улады Германіі шукаюць двух іншых выхадцаў з Турцыі, з якімі ў дзяўчынкі магла быць сэксуальная сувязь, прычым да дня яе знікнення. Мужчын, з якімі Ліза мела зносіны на працягу некалькіх месяцаў, падазраюць у цяжкім сэксуальным гвалце над дзіцём. Па нямецкіх законах узрост згоды надыходзіць у 14 гадоў — для кантактаў з партнёрам, якому менш за 18 гадоў, у 16-гадовым узросце — для кантактаў з партнёрамі, старэйшымі за 18 гадоў. Нават калі сэксуальны кантакт адбываўся пры ўзаемнай згодзе, гэтыя выпадкі будуць расследаваць як крымінальнае злачынства.

***Версія бацькоў***

Пасля таго, як прайшло больш за тыдзень, маці дзяўчынкі Святлана Ф. упершыню дала інтэрв'ю журналістам (да гэтага пра гісторыю Лізы распавядалі яе цётка, дзядзька і стрыечная сястра). Паводле яе слоў, 25 студзеня дзяўчынку змясцілі ў стацыянар на псіхіятрычнае лячэнне, паколькі ёй было «вельмі дрэнна».

Святлана Ф. заявіла, што яна па-ранейшаму ўпэўненая ў тым, што яе дачку выкралі і згвалтавалі. Па словах яе дачкі, гэта зра-

білі людзі, якія не размаўлялі па-нямецку. Жанчына распавяла, што пасля 30-гадзіннай адсутнасці дзяўчынка прыйшла дадому напаўраспранутай і без асабістых рэчаў. На ёй былі толькі бюстгальтар, штаны, чаравікі і куртка. Заплечнік, кашалёк і пярсцёнкі зніклі. «Яна плакала, у яе быў падрапаны твар, скрываўленыя вусны і сіняя пляма ад удару на носе», — сказала маці Лізы.

На наступны дзень пасля медыцынскага агляду Лізу запрасілі на допыт у паліцыю, аднак маці не змагла прысутнічаць на гэтай размове, хоць прасіла пра гэта (у ведамстве сцвярджаюць, што Святлана Ф. дала дазвол на допыт). У паліцыі паведамілі, што падчас працэдуры Ліза блыталася ў паказаннях, але ў канцы прызналася, што згвалтавання не было, а кантакты з двума мужчынамі ў яе адбыліся да 11 студзеня — пры ўзаемнай згодзе.

***Рэакцыя***

Гісторыю 13-гадовай Лізы ўжо каментуюць высокапастаўленыя чыноўнікі Расіі і Нямеччыны. Кіраўнік МЗС РФ Сяргей Лаўроў заявіў, што «дзяўчынка абсалютна дакладна не добраахвотна знікала на 30 гадзін», і абвінаваціў нямецкія ўлады ў спробе «паліткарэктна залакіраваць» праблемы з мігрантамі[15].

*Рэакцыя нямецкіх СМІ*

(*) Прадстаўнік гарадской пракуратуры Марцін Штэльтнер (Martin Steltner). Паводле яго слоў, на працягу 30 гадзін адсутнасці дзяўчынкі не былі здзейсненыя «ні згвалтаванне, ні наогул якія-небудзь сэксуальныя дзеянні». Штэльтнер дадаў таксама, што высветліць усе абставіны гэтай гісторыі ўдалося на падставе звестак сотавага тэлефона Лізы[16].

*Афіцыйная рэакцыя Германіі*

(*) Міністр замежных спраў Германіі Франк-Вальтэр Штайнмаер (Frank-Walter Steinmeier) у надзвычай рэзкай форме адказаў свайму расійскаму калегу Сяргею Лаўрову з нагоды «справы рускамоўнай дзяўчынкі Лізы» і абвінаваціў яго ва ўмяшанні ва ўнутраныя справы ФРГ. «Няма ніякіх апраўданняў для таго,

---

[15] https://meduza.io/feature/2016/02/02/iznasilovannaya-russkaya-devochka-prodolzhenie

[16] http://www.dw.com/ru/прокуратура-дело-девочки-лизы-из-берлина-раскрыто/a-19011517

каб выкарыстоўваць гэтую справу для палітычнай прапаганды і ўмешвацца ў без таго складаную дыскусію ўнутры Нямеччыны аб мігрантах, а таксама распальваць яе», — заявіў кіраўнік нямецкага МЗС у сераду, 27 студзеня, у Берліне.

Паводле слоў міністра, нямецкія ўлады робяць усё магчымае, каб высветліць, што здарылася. «Я магу толькі параіць расійскім уладам улічваць вынікі расследавання», — заявіў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Германіі.

Міністэрства замежных спраў ФРГ ужо ў сераду перадасць расійскаму паслу ў Берліне ўсю неабходную інфармацыю, падсумаваў Штайнмаер, не ўдаючыся ў падрабязнасці[17].

Калі падсумаваць, то выглядае так, што ёсць дзве паралельныя гісторыі: адна ў Германіі, для еўрапейцаў і астатняга цывілізаванага свету, другая — версія для Расіі, «рускага свету» і расійскіх эмігрантаў, рускага насельніцтва. Што самае цікавае, кожны застаецца пры сваім меркаванні.

Варта адзначыць, што гэтая гісторыя адбылася не на тэрыторыі былога Савецкага Саюза. Гэта гісторыя амаль з сэрца Еўрапейскага саюза. Што значыць, нешта падобнае можа быць выкарыстана ў любой з краін ЕС, але ўзнікае пытанне: ці кожная з гэтых краін зможа супрацьстаяць такому інфармацыйнаму ціску так, як гэта зрабіла Германія? А цяпер уявіце, што рэакцыя свету адносна адной з такіх краін будзе такой самай, як рэакцыя на вайну ў Грузіі, якую назвалі правакацыяй М. Саакашвілі, унутранымі «разборкамі», казалі пра «зоны ўплыву Крамля». Аб вайне з Грузіяй цяпер ніхто не гаворыць, яе перакрыла акупацыя Данбаса і анексія Крыма. Гэта значыць, мы ўстаём перад праблемай нявырашаных пытанняў процідзеяння расійскай прапагандзе, калі Крамлю даруюць папярэднія злачынствы, а ў медыя разыгрываюцца новыя сцэнарыі.

Ніхто не хоча займацца праблемамі (а тым больш — вырашаць іх), звязанымі з расійскай прапагандай, думаючы, што іх гэта абміне. Большасць грамадзян краін Еўропы альбо не надаюць належнай увагі інфармацыйнай і ваеннай пагрозам з боку пуцінскай Расіі, альбо лічаць гэта неістотным.

---

[17] http://www.dw.com/ш/мид-фрг-жестко-ответил-лаврову-по-де-лу-о-девочке-лизе^-19008001

Гісторыя «дзяўчынкі Лізы» нарабіла шуму ў Германіі і Еўропе ў цэлым. Але такіх гісторый ва Украіне ледзь не штодня здараецца па 2–3, і краіне трэба з імі змагацца, не маючы ўплывовых сусветных СМІ і магчымасці жорстка адсякаць праявы расійскай гібрыднай агрэсіі на сваёй тэрыторыі.

### Палітычныя шоу

«Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым», «Спіс Норкіна», «Палітыка», «Час пакажа» і дзясяткі іншых крыклівых, пафасных назваў — усё гэта вячэрнія палітычныя шоу, крамлёўскія інфармацыйныя прадукты, якія павінны растлумачыць шараговаму грамадзяніну «рэальнае значэнне падзей, якія адбываюцца», стварыць яму паралельную рэальнасць і падмацаваць веру ў цара, Расію і ўласную правату. Фармат палітычнага шоу стаў для мільёнаў расіян заменнікам серыяла, зносін з сябрамі і нават уласнага аналізу бягучых падзей. Па сутнасці, для многіх гэта і ўласныя вочы, і бясспрэчная ісціна, і найлепшы варыянт правесці вольны час. Менавіта палітычныя мыльныя оперы сталі галоўнымі для тлумачэння мэсэджаў і карэкціроўкі светапогляду. Галоўнае тут — стварэнне правільных эмоцый і падтрымка патрыятычнага патрыярхальнага духу, які, з аднаго боку, умацоўвае ўнутрыпалітычныя пазіцыі Пуціна, з другога — апраўдвае ўсе яго злачынствы за мяжой.

У Расіі ёсць СМІ і журналісты, якіх можна назваць героямі прафесіі, якія сапраўды спрабуюць быць незаангажаванымі і прафесійнымі. Але іх аўдыторыя штучна абмежаваная. Замест гэтага мільённая аўдыторыя ў руках «Астанкіна» і Крамля, палітыканаў, паліттэхнолагаў, маніпулятараў і прапагандыстаў. Але ні ў якім выпадку не ў руках сумленных журналістаў. Варта прызнаць, што без гэтага рэжым у такім выглядзе, у якім мы яго сёння ведаем, існаваць бы не змог. Менавіта таму рэжым навучыўся вельмі спрытна маніпуляваць меркаваннем насельніцтва дзеля сваёй карысці і самазахавання.

Зразумела, што ў Расіі даўно існуе фармат палітычных шоу, якія стваралі імітацыю палітычнай канкурэнцыі і амаль заўсёды аддавалі перавагу праўладным кандыдатам. І гэта нікога не здзіўляла, і ніхто не задаваў лішніх пытанняў.

Але гэты фармат у расійскай медыяпрасторы дасягнуў свайго апагею, калі Расія анексавала ўкраінскі Крым у 2014 годзе і праз некалькі месяцаў акупавала ўсход Украіны. Палітычныя шоу сталі мегапапулярнымі. Бо трэба было насельніцтву данесці мэсэджы і думкі, якія было цяжка данесці шляхам звычайных навін, у прыватнасці, на старонках газет. Трэба было данесці эмоцыі, апраўдаць памылку «лідара», даць факты для спрэчак з украінскімі сваякамі і проста свядомымі рускімі.

(*) Самы папулярны від спрэчкі ў апошнія два гады выклікае магутныя воплескі: «мы — Еўропа, а вы — саўковая вата» супраць «мы — народ-пераможца, а вы — няўдзячныя здраднікі і дзеці калабарантаў». Гэта спрэчка адметная тым, што з'яўляецца абсалютна невырашальнай і будзе актуальнай, пакуль бабуля з Ніжнявартаўска і дзядуля са Львова не сыдуцца ў халівары на нябёсах», — распавёў ананімны расійскі журналіст у інтэрв'ю для радыё «Свабода».

Тэмы выбіраюць так, каб у любым выпадку пазіцыя «супраць Пуціна» выглядала слабай і хлуслівай, затое выйгрышнай была пазіцыя «Расія — заўсёды вялікая і магутная» або «Украіна — няўдзячны нашчадак Савецкага Саюза, які безвынікова грукаецца ў дзверы ЕС».

Набор шаблонаў супраць Украіны ўжо можна назваць класічным, хоць і ён існаваў не заўсёды і вельмі часта мяняўся ў залежнасці ад гістарычнага перыяду адносін паміж дзвюма дзяржавамі. Але ў гады, калі Украіна вырашыла канчаткова парваць з савецчынай, тэзісы змяніліся і крышталізаваліся. Дадатковую порцыю аргументаў на сваю карысць крамлёўскія спікеры атрымалі пасля анексіі Крыма, якую яны былі вымушаныя апраўдваць, і акупацыі Данбаса, дзе зняпраўджвалі забойствы з боку тэрарыстаў і адначасова павінны былі праслаўляць усё расійскае на акупаванай украінскай тэрыторыі. Усё імкненне Украіны да еўраінтэграцыі — абсмяяна, перакручана і пастаўлена пад сумнеў.

Расійскае тэлебачанне, а асабліва палітычныя шоу, не прадугледжваюць класічнага інфармавання. Адзіная мэта — на ўзроўні эмоцый данесці, хто мае рацыю, а хто не.

Галоўная мэта такіх медыяпрадуктаў — паралельнае інфармацыйнае і кантэкстуальнае суправаджэнне ваенных дзеянняў. Асабліва, калі зразумелі, што дзеянні памылковыя, прапаганда

стала асноўным інструментам адцягнення ўвагі ўласнага насельніцтва, якое панесла значныя эканамічныя страты, ад унутранай палітыкі.

Алеся Яхно — украінскі палітолаг і часты госць на такіх шоу, дзе яна супрацьстаіць расійскай прапагандзе і спрабуе адстойваць дзяржаўныя і нацыянальныя інтарэсы ўкраінскага боку.

*Гаворачы пра тэхнічныя дэталі, яна прыводзіць цікавыя факты са свайго досведу:*

• у крамлёўскіх палітычных шоу ёсць сцэнарый, але ўкраінскім экспертам яго не паказваюць;

• існуе паняцце перадзапісу, калі экспертаў просяць сфармуляваць сваю пазіцыю, каб зарыентавацца ў поглядах эксперта на пэўныя пытанні, часта гэта робяць нават пасля запісу шоу, каб планаваць наступныя падзеі;

• роля ахвяры шоу — чалавек будзе ў крайняй правай пазіцыі, калі яго меркаванне не ўспрыме расійская аўдыторыя;

• расійскі бок заглушае спікера, перабівае або правакуе на неадэкватныя паводзіны;

• дыскрэдытацыя спікера — часта такой дыскрэдытацыі падвяргаюцца ўкраінскія палітолагі праз дзеянні пераважна ўкраінскіх журналістаў, палітыкаў ці нават калег, якія калісьці тэрытарыяльна працавалі ва Украіне;

• асобнай з'яўляецца роля сцэнарыстаў, самае галоўнае — усё прапісаць так, каб праграма мела рэйтынг, што часам нават важней за пэўныя забароны, але рэйтынг не для рэкламадаўца, гэта канкурэнцыя за палітычную нішу і за грошы, якія вылучаюць на палітыку;

• нярэйтынгавыя праекты могуць закрыць, тады адразу з'яўляюцца новыя;

• амаль у кожным шоу з расійскага боку ёсць «галоўны герой» (Жырыноўскі ці хто-небудзь іншы, набліжаны да першых асоб), які задае тон і стылістыку шоу;

• вядучыя такіх шоу звычайна ставяць правакатыўныя пытанні, выкарыстоўваюць маніпулятыўныя і сумнеўныя выказванні, напрыклад: «так званы прэзідэнт Украіны» ці «Расія як самая моцная краіна», але іх галоўная задача як мадэратараў — не даваць слова ўкраінскім спікерам.

Лаяльнасць вядучых вельмі шчодра аплачваецца — як фінансава, так і палітычна. Тут у якасці прыкладу можна назваць шоу «Палітыка з Пятром Талстым» на Першым канале. Яго вядучы Пётр Талстой выйграў праймерыз ад партыі «Адзіная Расія», што ўжо не дазваляе казаць пра яго аб'ектыўнасць і бесстароннасць. Хоць у той жа час шмат гасцей шоу, у тым ліку і дзейных расійскіх палітыкаў, цяпер баяцца атрымаць клішэ прапагандыста. Бо гэта можа прывесці да санкцый супраць іх.

Са слоў Алесі, шмат у каго з вядучых і вядомых дзейных асоб палітычных шоу, так званых VIP-спікераў, ужо даўно ёсць жаданне сысці з «цягніка прапаганды», бо гэта прыносіць дыскамфорт, маральную стомленасць і магчымыя міжнародныя праблемы. Гуляючы ў такую гульню, ніхто не мог падумаць, што гэта зацягнецца надоўга. Бо зразумела, што па-сапраўднаму вераць толькі адзінкі. У цэлым усе ставяцца да такой дзейнасці як да таго, што трэба сыграць ролі і адпрацаваць грошы. Затое адпачываюць у Штатах і Еўропе, якія быццам бы з'яўляюцца іх галоўнымі ворагамі. У гэтым украінскі палітолаг і бачыць галоўную перавагу і прычыну пройгрышнасці іх пазіцыі: яны ў гэта не вераць і не праніклібся тэмай, а проста адпрацоўваюць кэш. Тады як для многіх украінскіх спікераў гэта справа гонару, патрыятызму і абароны сваёй краіны.

Фактар спікераў-замежнікаў на крамлёўскіх палітычных шоу спрацоўвае вельмі добра. Калі паляк пагражае РФ, што Данбас для яе падасца «кветачкамі», калі галандзец агітуе супраць пагаднення з Украінай ці нават самі ўкраінцы (па пашпарце) крычаць на поўныя грудзі, што Украіну захапілі «бандэраўцы», «хунта» і «фашысты» – карцінка для гледача простая, зразумелая і на 100% пераканаўчая. Пра ролю экспертаў мы ўжо згадвалі. Магу проста адзначыць, што спікеры, палітолагі і эксперты на палітычных шоу нічым не адрозніваюцца ад тых, хто каментуе бягучыя палітычныя падзеі для сюжэтаў у выпусках навін. Гэта значыць, выкарыстоўваецца нацыянальны, а не экспертны фактар, як павінна было б быць.

У той жа час Алеся Яхно сцвярджае, што стаўка на тое, каб пераканаць еўрапейскае грамадства з дапамогай прапаганды, не спрацавала. Аднак варта прыняць да ўвагі асобныя выпадкі

галасавання мясцовых парламентаў, зняцце санкцый, хаця яны больш прадыктаваныя матывацыяй паспрыяць уласнаму бізнэсу.

Асобна варта звярнуць увагу і на ўкраінскіх палітычных эмігрантаў, якія пасля зверажэння рэжыму Януковіча ўцяклі ў РФ. Як аказалася пасля, частка з так званых украінцаў — гэта расійцы па пашпарце, і яны ўжо ніколі не вернуцца ва Украіну. Увогуле, пастаўленая перад імі задача выканана (ці правалена), але магчымасці працягваць і вяртацца ўжо няма. Частка з іх не мае расійскага пашпарта, але ад гэтага не менш лаяльная да Крамля, у той жа час дазваляючы сабе жыць у Еўропе або ў цёплых, пляжных краінах. Але гэта хутчэй лаяльныя бізнэсмены і карупцыянеры. Палітыкі, напрыклад, усё яшчэ спадзяюцца, што вернуцца ва ўкраінскую палітыку, таму ствараюць сабе імідж за кошт удзелу ў згаданых намі тэлевізійных шоу.

Яшчэ частка разумее, што ўкраінская палітыка ім ужо не свеціць, таму праз знаходжанне ў медыяпуле яны хочуць атрымаць магчымасць аднавіцца палітычна хоць бы на акупаваным Данбасе або ў Крыме, улічваючы, што медыйнае поле апошніх цяпер фармуюць расійскія СМІ.

Праўда, ёсць і група, якая адчувае шчырую нянавісць да ўкраінцаў, бо пры прэзідэнцтве Януковіча і лаяльнасці Крамля яны раскошна жылі ва Украіне, а пасля ўцёкаў у Расію значную частку сваёй маёмасці страцілі.

## Інтэрнэт. Якая роля сацыяльных сетак у падзеях 2014 — 2016 гадоў ва Украіне і Расіі?

Тэлебачанне — гэта галоўны рэсурс прапаганды Крамля часоў Пуціна, магутны, бясспрэчны і безальтэрнатыўны. І нават інтэрнэт і сацыяльныя сеткі, што набылі нябачаную раней папулярнасць у свеце, так і не змаглі стаць канкурэнтамі тэлебачанню ў Расіі і агрэсіі Расіі ва Украіне.

Аднак немагчыма аспрэчыць важнасць сацыяльных сетак ва ўнутранай палітыцы Крамля ў самой Расіі і інфармацыйных, ваенных кампаніях за яе межамі.

Продаж сацыяльнай сеткі «ВКонтакте» спярша здаваўся вельмі дзіўным, бо яе заснавальнік, малады айцішнік з Пецярбурга

Павел Дураў, не планаваў пакідаць свой паспяховы бізнэс. Да таго ж, ён кіраваў кампаніяй і меў давер інвестараў, галасуючы на сходзе адразу 52% акцый.

На першы погляд усё было выдатна, але праблема была ў тым, што падчас Рэвалюцыі годнасці ва Украіне кіраўнік сацыяльнай сеткі П. Дураў не блакаваў на сваім сайце суполкі ўкраінскіх дэмакратычных актывістаў па патрабаванні ФСБ, не выдаваў кантактаў і персанальных звестак карыстальнікаў, якімі цікавіліся ў спецслужбах (у прыватнасці, кантактаў членаў Еўрамайдану).

Да таго ж, Крэмль памятаў, што П. Дураў не быў палітычна лаяльным да ўлады і падчас пратэстаў у Маскве, калі яго таксама заклікалі закрываць суполкі і выдаваць карыстальнікаў. Не здолеўшы дамовіцца з ім, у Крамлі прынялі рашэнне купіць «ВКонтакте», каб мець магчымасць цэнзуры і маніпулявання. Дакладная цана здзелкі не называецца, але, па звестках прэсы, вагаецца ад некалькіх сотняў мільёнаў долараў да паўмільярда долараў. Многія скажуць, што гэта таго не варта, прасцей было б закрыць сайт і забыцца ўсю гісторыю. Аднак сацыяльныя сеткі загадам прэзідэнта РФ з жыцця маладых людзей не выкінеш. Калі закрыюцца «Вконтакте» або «Одноклассники», усе мігруюць у Facebook і Instagram. Мадэраваць іх расійскім уладам і спецслужбам было б немагчыма. Менавіта таму было прынята рашэнне купіць сацыяльная сеткі, а зрабіў гэта фонд, як вынікае з прэсы, набліжаны і лаяльны да структур Крамля.

Поўны фінансавы кантроль і лаяльны менеджмент развязалі рукі людзям Пуціна і спецслужбам, якія маглі карыстацца сацыяльнымі сеткамі ў сваіх інтарэсах, не асцерагаючыся таго, што патрэбныя суполкі могуць быць заблакаваныя адміністрацыяй за агрэсію. Таксама яны атрымалі магчымасць закрываць самім суполкі або блакаваць непажаданых карыстальнікаў. Але гэтым інтэрнэт-тэхнолагі не абмежаваліся, прапанаваўшы мноства розных інфармацыйных паслуг свайму галоўнаму заказчыку.

## Блакаванне карыстальнікаў у сетцы Facebook і пошук баевікоў-сепаратыстаў праз сацыяльныя сеткі

Палітызаванасць сацыяльных сетак — з’ява распаўсюджаная ў свеце, бо сацыяльныя медыя — вельмі зручны інструмент палітычнага дыялогу, дыскусіі, піяру і прасоўвання інфармацыйных кампаній. А карыстальнікі ў сацыяльных сетках адчуваюць сябе больш расслаблена і менш насцярожана, чым, напрыклад, калі глядзяць навіны ці палітычную рэкламу. Бо яны спрабуюць там знайсці кантэнт пазнавальны, забаўляльны ці проста забіваюць свой час. Тут ні Украіна, ні Расія не сталі выключэннем. Як там, так і ў нас пляцоўкі ў сацыяльных сетках выкарыстоўваюцца для данясення патрэбных палітычных мэсэджаў, ацэнкі падзей і стварэння палітычнай шуміхі.

І калі расійская палітычная эліта пераважна для публічнай інтэрнэт-камунікацыі выкарыстоўвае Twitter і ўласную сетку «ВКонтакте», то галоўнай пляцоўкай дыскусіі ва Украіне з’яўляецца ўсё ж Facebook. У ім украінскія лідары меркаванняў, сярод якіх блогеры, міністры, парламентарыі і вайскоўцы, валанцёры, інфармуюць насельніцтва пра дэталі працы, інсайды, свежыя навіны і аспекты палітычных інтрыг і скандалаў. Узровень папулярнасці большасці з іх высокі, у іх могуць быць сотні тысяч фалавераў, што ў маштабах Украіны вельмі нядрэнны вынік. Да таго ж, гэта аўдыторыя цікавіцца палітыкай, мае актыўную грамадзянскую пазіцыю, жаданне ўкараняць пазітыўныя змены ў дзяржаве і змагацца супраць агрэсіі.

Уплыў лідараў грамадскай думкі значны, асабліва калі ўлічыць, што акаўнты ў сацыяльных сетках, акрамя распаўсюджвання публікацый на сваю базавую аўдыторыю, набываюць папулярнасць у інтэрнэце, СМІ, ТБ і на радыё, стаўшы крыніцай навін для вышэйпералічаных медыя. Таму аўдыторыя можа пашырацца ў сотні разоў. Калі матэрыял пакажа адзін з нацыянальных каналаў, спасылаючыся на акаўнт палітыка або грамадскага актывіста, аўдыторыя аўтаматычна павялічваецца ад некалькіх сотняў тысяч да 5–10 мільёнаў.

Актыўнасць і палітычную ўплывовасць у Facebook заўважылі не толькі ўкраінскія карыстальнікі. Падчас інфармацыйных кам-

паній многія з вядомых інтэрнэт-актывістаў былі заблакаваныя. Яны не мелі магчымасці кантактаваць з аўдыторыяй.

Звычайна ў блакаванні вінаватыя самі ўладальнікі акаўнтаў. Бо вельмі часта яны не абмяжоўваюць сябе ў рыторыцы і выказваннях, хоць іх можна зразумець. Занадта цяжка быць ветлівым і выконваць правілы Facebook, калі ў тваёй краіне забіваюць людзей.

Звычайна ўсё адбываецца вельмі празаічна і проста: спецыяльны софт сканує старонку кандыдата на заблакаванне, пасля чаго ў ручным або аўтаматычным рэжыме шукаюцца забароненыя палітыкай Facebook словы (этнічныя, расавыя і рэлігійныя абразы, нелітаратурныя/нецэнзурныя выказванні, надзвычай эмацыйныя сказы). Пасля чаго з розных акаўнтаў накіроўваецца мноства скаргаў у Facebook. Гэта прыводзіць да блакавання карыстальніка.

Тэхнічна ўсё выглядае чыста і правільна. І з пункту гледжання глабальнай або рэгіянальнай статыстыкі Facebook гэта незаўважна. Але з палітычнага пункту гледжання ва Украіне статыстыка ўражвае: знікаюць з Facebook-прасторы вядомыя блогеры, палітыкі, грамадскія актывісты, праваабаронцы і валанцёры — на тыдзень, на месяц, што ва ўмовах надзвычай інтэнсіўнага і дынамічнага інфармацыйнага поля выглядае проста катастрофай.

Праблема атрымала такую агалоску, што стала тэмай выпускаў навін, стварэння метадычных рэкамендацый, як не стаць ахвярай блакавання. Нават дайшло да таго, што ўкраінскія чыноўнікі звярталіся да кіраўніцтва Facebook з просьбай умяшацца ў сітуацыю, а яшчэ лепш — адкрыць офіс ва Украіне, які мог бы мадэраваць пасты, якія падлягаюць блакаванню. Бо такую мадэрацыю выконвала асоба з расійскім грамадзянствам, у зону адказнасці якой уваходзіла і Украіна. Гэта на самай справе насцярожвала многіх украінцаў з-за расійскай ваеннай і інфармацыйнай агрэсіі[18].

Дыпламатычны і тэхнічны адказ кіраўніка сацыяльнай сеткі Марка Цукерберга на запыты з Украіны не задаволіў ні паліты-

[18] http://www.pravda.com.ua/news/2015/05/15/7067949/

каў, ні заблакаваных блогераў, бо гэта аператыўна не вырашала самой праблемы. Таму выхады пачалі шукаць у культуры вядзення допісаў, пераглядзе і выдаленні старых публікацый, за якія можна было атрымаць бан, у блакаванні каментароў ботаў і троляў, з-за якіх можна было таксама быць заблакаваным. Метадычныя напрацоўкі дапамагаюць, але, зноў жа, праблему не вырашаюць[19].

І праца сацыяльных сетак па разглядзе скаргаў на блакаванне магла б быць больш аператыўнай і ўважлівай. Таму што часам атрымліваецца, што скаргі на наяўнасць на старонцы карыстальніка фота аголеных частак цела не адпавядаюць рэчаіснасці, але тым не менш карыстальніка блакуюць. Для разблакавання і праверкі фактаў патрабуецца час. Карыстальнік не можа публікаваць навіны, таму тактычна перамагае бот і яго заказчык.

Сацыяльныя сеткі сталі важнай пляцоўкай інфармацыйнай вайны, дзе палітыкі ў Twitter робяць істотныя, сенсацыйныя заявы, вядомыя людзі выказваюць свае меркаванні адносна падзей, а карыстальнікі могуць на ўсё гэта рэагаваць. Гэта набыло такія маштабы, такое распаўсюджванне сярод аўдыторыі, што зацікавіла прапагандыстаў як мажлівасць для патэнцыйных маніпуляцый, блакавання і пошуку ўласных рашэнняў для ўплыву на насельніцтва як у самой Расіі, так і ва Украіне, на мірных і акупаваных тэрыторыях. Менавіта таму новым медыя трэба надаваць асаблівую ўвагу як месцу знаходжання і дзейнасці вядомых асоб, так і магчымасці нанясення інфармацыйнага ўдару па насельніцтве краіны, што можа прывесці да дэстабілізацыі палітычнай сітуацыі.

*Юрый Карын* — адзін з каардынатараў няўрадавага праекта «Інфармацыйны супраціў», які займаецца процідзеяннем у інфармацыйным полі знешнім пагрозам, якія ўзнікаюць для Украіны ў ваеннай, эканамічнай і энергетычнай сферах, а таксама ў сферы інфармацыйнай бяспекі. Ён распавёў пра вельмі цікавы факт: «Амаль усе буйныя суполкі “Антымайдану” ва ўсходняй Украіне пасля Рэвалюцыі годнасці, з пачаткам расій-

---

[19] https://www.youtube.com/watch?v=WHNYqKYhPjc

скай агрэсіі ў Крыме і Данбасе былі перакваліфікаваныя ў групы мабілізацыі сепаратыстаў і наймітаў».

Прычым вельмі часта колькасць лайкаў на старонках накручвалася штучна, каб паказаць асноўнай масе карыстальнікаў, што яны не адзіныя, хто будзе ўдзельнічаць, напрыклад, у захопе раённай адміністрацыі або аддзялення СБУ. І гэта давала свой эфект і вынік, бо была частка людзей, якая вагалася, а масавасць акцыі ў інтэрнэце давала ўпэўненасць у калектыўнай безадказнасці і шырокай падтрымцы, нават калі такой не было. Гэта значыць, атрымліваецца, што сацыяльныя сеткі выкарыстоўваліся не толькі для замбавання насельніцтва, прапаганды і інфармацыйных маніпуляцый, а таксама як HR-рэсурсы для набору баевікоў, сепаратыстаў і актывістаў для мерапрыемстваў, накіраваных супраць дзяржаўнасці.

## Фэйкі і боты

Напісаўшы нешта супраць расійскай агрэсіі ў Крыме, супраць Пуціна ці вайны на ўсходзе Украіны, тыповы карыстальнік інтэрнэту і сацыяльных сетак атрымлівае хвалю негатыву ад калег па сетцы: маўляў, ёсць жа мільёны доказаў адваротнага, усё сказанае няпраўда, а толькі суб’ектыўнае меркаванне аўтара допісу. З-за гэтага сам аўтар губляе жаданне каментаваць у далейшым ці ўвогуле займае пазіцыю сваіх крытыкаў з-за адсутнасці контраргументаў.

Часам нават спрабуючы спрачацца, аўтар каментара сустракае шквал эмоцый, асабістых абраз і заклікаў папрасіць прабачэння. На жаль, большасць людзей успрымае гэта як рэальную і натуральную рэакцыю асяроддзя, з-за чаго можа абмежаваць сваю актыўнасць у выказваннях.

Працу фэйкавых акаўнтаў і ботаў я, як і мільёны ўкраінцаў, пастаянна адчуваю на сабе, прычым адразу з двух франтоў. Першы — гэта ўкраінскі палітычны. Калі я публікую свае калонкі ў інтэрнэт-СМІ ці пішу крытычныя публікацыі ў сацыяльных сетках супраць улады ці апазіцыі, я часта атрымліваю шчодрую порцыю крытыкі пра сябе як палітолага, палітычнага аглядальніка, а вельмі часта — і як чалавека. На жаль, але і гэта

варта прызнаць, што ў супрацьстаянні агрэсару ўкраінскія чыноўнікі, топ-палітыкі, алігархі, а дакладней — каманды іх піяршчыкаў і рэкламшчыкаў, чамусьці спрабуюць выкарыстоўваць метады ворага, часта забываючы, на якім баку мы ўсе ваюем. Дарэчы, цікавы факт: для некаторых быццам бы празаходніх палітыкаў ва Украіне паслугі па працы фэйкаў і ботаў выконваюць менавіта расійскія спецыялісты[20].

Другі фронт увагі з боку ботаў, вядома, рускі. Напрыклад, калі пасля чарговага выпуску тэлевізійнай перадачы «Грамадзянская абарона» або «Антызомбі», якія раскрываюць дэталі расійскай хлусні, злачынстваў на ўсходзе Украіны і адарванасці расійскай улады ад свайго насельніцтва, эксперты атрымліваюць мноства пагроз, абраз і заклікаў у асабістыя паведамленні, як і каментароў ад незнаёмцаў. Асабліва актыўнымі з’яўляюцца карыстальнікі расійскіх сацыяльных сетак.

Эфектыўнасць такой працы вельмі нізкая, таму што нікога такім чынам не пераканаць. Але для арганізатараў гэтага віду бізнэсу эфектыўнасць не мае значэння. Бо справаздачы для атрымання чарговага траншу яны здаюць не ў выглядзе колькасці перакананай аўдыторыі, экспертаў, лідараў меркаванняў ці журналістаў, а толькі праз скрыншоты колькасці адпраўленых паведамленняў.

Звычайна брыгады такіх тэхнолагаў працуюць у расійскіх правінцыйных гарадах, дзе сабекошт паслугі значна зніжаецца для заказчыка, што надзвычай важна, бо праекты аказаліся доўгатэрміновымі.

Вельмі часта прарасійскія прапагандысты практыкуюць стварэнне фальшывых акаўнтаў нібыта ўкраінскіх карыстальнікаў, якія выказваюць надзвычай радыкальныя, агрэсіўныя погляды і заклікаюць да гвалту. З часам яны маюць ужо інфармацыйную падтрымку, а затым атрымліваюць крытыку ў афіцыйных расійскіх СМІ за фашызм, нашызм і распальванне варожасці. Хоць вельмі часта гэта не рэальныя, а прыдуманыя акаўнты, якія мадэруюцца з Расіі.

Дэманстраваць прыклады дзейнасці ботаў і наёмных каментатараў няма сэнсу, бо іх праца звычайна нізкааплатная, ад

[20] http://www.radiosvoboda.org/content/article/27042051.html

чаго няякасная, яе лёгка можна выкрыць, у ёй шмат паўтораў і грубай агітацыі за пэўны бок. Хоць прынамсі адну задачу яны выконваюць — адбіваюць жаданне свядомых адукаваных грамадзян выказваць сваё меркаванне ў сацыяльных медыя, пісаць каментары ці адстойваць свае погляды. Яны ствараюць у сацыяльных медыя атмасферу нянавісці і страху.

На жаль, негатыўны досвед выкарыстання армій ботаў запазычылі сабе і ўкраінскія палітыкі. Што не дзіўна, бо такі інструмент часцяком выкарыстоўваецца ў многіх краінах для мадэрацыі ўнутрыпалітычнага інтэрнэт-асяроддзя, у прыватнасці ў самой Расіі, Беларусі, Кітаі, Паўночнай Карэі, шэрагу арабскіх краін, а таксама ў Германіі, але не немцамі ва ўласных інтарэсах, а вельмі часта незразумелымі карыстальнікамі ў інтарэсах Расіі і Пуціна.

## SMS як альтэрнатыва скінутым з паветра ўлёткам

У Першую, Другую сусветныя войны, падчас вайны ў В'етнаме і нават падчас іракскай кампаніі вельмі папулярным метадам стварэння панікі на варожых тэрыторыях былі скінутыя на гарады ўлёткі. Улёткі выкарыстоўваліся як інструмент прапаганды, вярбоўкі, маніпуляцыі, каб здацца ў палон і да таго падобнае. У гісторыі войнаў мноства выпадкаў, калі ўлёткі, скінутыя з самалёта або паветранага шара, маглі нанесці большы ўдар, чым скінутыя бомбы.

Здавалася б, тэлефонныя паведамленні, больш вядомыя як SMS (short message service), сыходзяць у мінулае з-за развіцця розных праграм у тэлефонах, мэсэнджараў і сацыяльных сетак. Ніхто і ўявіць не мог бы, што звычайнае тэкставае паведамленне можа стаць інструментам ваеннай прапаганды і запалохвання ў XXI стагоддзі. Аднак, як сведчыць гісторыя і аналіз ваенных дзеянняў, інструмент данясення мэсэджу вельмі часта не мае значэння, бо больш важным з'яўляецца сама інфармацыя, якую трэба данесці.

Як сведчыць аналіз дзейнасці пракрамлёўскіх прапагандыстаў на акупаванай тэрыторыі Данбаса, SMS-прапаганда атрымала свой небывалы росквіт, замяніўшы раскідванне ўлётак

з борта самалётаў над варожай тэрыторыяй. SMS-спам набыў новыя сэнсы, формы і праявы. Украінскія салдаты, добраахвотнікі і мірнае насельніцтва з прыфрантавой зоны на працягу ўсяго перыяду тэрарыстычнай агрэсіі атрымлівалі SMS-паведамленні з пагрозамі, заклікамі і маніпуляцыямі. Галоўнай задачай была дэстабілізацыя сітуацыі, сеянне недаверу да органаў украінскай улады і сумневаў адносна правільнасці абароны акупаваных тэрыторый, заклікі пераходзіць на прарасійскі бок, дыверсіі, а самае галоўнае — падрыў баявога духу ўкраінскіх абаронцаў.

Па расказах удзельнікаў баявых дзеянняў, SMS прыходзілі не пастаянна і не спантанна. Даты рассылкі падбіралі пад дрэннае надвор’е, пасля цяжкіх баёў, падчас перыядаў незадаволенасці палітычнай сітуацыяй ва Украіне, так узмацняючы хвалю здрады, каб як мага глыбей увесці ў дэпрэсію салдат і мясцовае насельніцтва.

Слабая інфармацыйная палітыка з боку Украіны, а вельмі часта і поўная бяздзейнасць у прыфрантавой зоне былі галоўным козырам прарасійскіх прапагандыстаў, якія па усіх магчымых каналах спрабавалі ціснуць на свядомасць украінскіх грамадзян.

SMS-спам рассылаўся з рандомных нумароў тэлефонаў, якія вельмі часта выкарыстоўваліся разава, а затым утылізаваліся. Такія рассылкі рабіліся з дапамогай спецыяльных прылад, якія дасылалі паведамленні на актыўных абанентаў на асобна ўзятай тэрыторыі.

Эфект быў умоўны, бо калі ў вайскоўцаў маніпулятыўны SMS-спам выклікаў толькі смех, то для часткі цывільнага насельніцтва, якое не атрымлівала аб’ектыўнай інфармацыі і знаходзілася пад уплывам прапаганды расійскіх ТБ-каналаў, гэтыя рассылкі маглі стаць падставай для фармавання прарасійскіх пазіцый.

Тэхналогія гэтая далёка не новая, проста набыла абноўлены фармат. Як піша Георгій Пачапцоў у «Сучасных інфармацыйных войнах», у час Першай сусветнай вайны штодня падымалася ў паветра каля 2 тысяч паветраных шароў з прапагандысцкімі ўлёткамі. Гэта давала магчымасць распаўсюдзіць за адну такую хвалю каля 2 мільёнаў улётак. У кастрычніку 1918 года

на тэрыторыю Германіі было скінута каля 5 мільёнаў улётак. І гэта не адзіная сучасная вайна, дзе выкарыстоўваліся паведамленні на паперы для запалохвання чужога насельніцтва ці падсілкоўвання патрыятызму ўласнага.

В'етнамская, Чачэнская і Персідская войны таксама мелі досвед інфармацыйнага масавага ўплыву, і колькасць і якасць улётак толькі ўзрасталі. Да іх распрацоўкі далучаліся спецыялісты па рэкламе, PR і псіхолагі, што давала максімальныя вынікі масавага ўздзеяння на насельніцтва.

Таму выкарыстанне прарасійскімі баевікамі SMS-рассылак нельга лічыць інавацыяй, як і астатнія дзеянні, бо большасць з напрацовак засталася ў спадчыну ад Савецкага Саюза, частка з якіх была проста мадыфікаваная пад патрэбы часу.

### Праблема мабільных апаратараў

Падчас канфлікту была выкрытая праблема не толькі магчымасці запалохвання насельніцтва ці падрыву духу вайскоўцаў праз SMS, але і маштабныя праблемы з мабільнай сувяззю і адсутнасць надзейнага мабільнага аператара.

Украіна не была падрыхтаваная да акупацыі сваіх тэрыторый і нападу ворага ні ў ваенным сэнсе, ні ў плане абароны камунікацый і каналаў сувязі. Яркім пацвярджэннем гэтаму сталі добраахвотніцкія батальёны, арганізаваныя не ўладай або ваенкаматамі, а самавольна і самастойна створаныя актыўнымі маладымі людзьмі на платформе патрыятызму і жадання абараняць сваю дзяржаву. На першых этапах каналамі сувязі ў іх былі неабароненыя лініі мабільных тэлефонаў.

І гэта пры тым, што галоўнымі гульцамі, амаль манапалістамі рынку мабільных тэхналогій былі і дагэтуль з'яўляюцца расійскія кампаніі, актывы краіны агрэсара. Натуральна, што структуры і формы ўласнасці змененыя праз афшорныя і траставыя інструменты так, што і расійскімі іх назваць цяжка. Але канчатковым бенефіцыярам усё роўна застаюцца залежныя ад Крамля алігархі, якія ў абмен на прэферэнцыі гатовыя падыгрываць нават у такія крытычныя моманты, як вайна ці акупацыя тэрыторыі.

Гэты факт даказаў, што Расія была зацікаўлена ў каналах сувязі ва Украіне задоўга да пачатку канфлікту, з-за чаго выкупляла ва ўкраінскіх і нарвежскіх уладальнікаў акцыі мабільных аператараў. Да таго ж, дыскрэдытаваныя паходжаннем сваіх акцыянераў аператары не плануюць сыходзіць з украінскага рынку, змяняючы назвы, праводзячы рэбрэндынг і замятаючы сляды ў структурах уласнасці.

Ва Украіне нават прынялі спецыяльны закон аб забароне карыстання мабільнай сувяззю ў зоне АТА з ваеннай мэтай. Найвышэйшае ваеннае і палітычнае кіраўніцтва разумела, што неабароненая сувязь можа стаць ледзь ці не самай фатальнай прычынай пройгрышу, паколькі гарантаваць прыватнасць і надзейнасць расійскіх аператараў ніхто не мог. Што, уласна, і стала падставай да прыняцця закона.

# РАЗДЗЕЛ III. СУПРАЦЬСТАЯННЕ

У папярэдніх раздзелах кнігі гаворка ішла аб імперыі, метадах інфармацыйных маніпуляцый, прапагандзе і спробе заваяваць свайго найбліжэйшага суседа або навязаць свету міф аб суперсіле і гіперважнасці Масквы. А ў гэтым раздзеле хацелася б пагаварыць пра грамадзян, пра подзвіг звычайных украінцаў, якія ў крытычны момант пачалі шукаць шляхі выратавання і абароны сваёй дзяржавы.

Цяпер амаль усе ўкраінцы згаджаюцца, што перамога ў супрацьстаянні прарасійскім тэрарыстам — рэфармаваная, мадэрнізаваная і самадастатковая Украіна. Гэта найлепшы інструмент вяртання людзей і захопленых тэрыторый. Бо нішто не можа матываваць лепш, як прыналежнасць да велічнага і прыгожага, асабліва калі гэта *твая* краіна.

На жаль, палітыкі робяць усё магчымае, каб такога варыянту развіцця падзей не было. Гаворка ідзе пра ўкраінскіх палітыкаў, якія займаюць высокія пасады. Надзвычайная карумпаванасць і прага нажывы вельмі часта становяцца на шляху агульнанацыянальных інтарэсаў і паспяховага развіцця нашай дзяржавы. На жаль, слабыя палітычныя эліты заўсёды былі ахілесавай пятой Украіны.

У той жа час я хацеў бы звярнуць увагу не на палітычны клас, як яго калісьці ахрысціў былы прэм’ер-міністр А. Яцанюк, а на звычайных людзей, украінцаў, валанцёраў, добраахвотнікаў, вайскоўцаў, журналістаў, на плячах якіх і ляжыць увесь груз становішча, менавіта ім мы абавязаны нашымі перамогамі. На жаль, наступіць час — і подзвігі большасці з іх забудуць, а тыя, хто адседжваўся ў кабінетах і вылежваўся на пляжах за мяжой, будуць строіць з сябе пераможцаў і міратворцаў, распавядаючы, як яны змагаліся за мір, былі супраць вайны і кровапраліцця, усёй сваёй сутнасцю змагаючыся за дабрабыт Украіны. Але будзем шчырымі: мір немагчымы без моцнай пазіцыі і магутнай абароны краіны, якая падверглася агрэсіі суседа. Інакш гэта — зняволенне, захоп і палон.

Пачнём з таго, што ўкраінцам пастаянна навязвалі міф аб няздольнасці супрацьстаяць магчымай вайсковай агрэсіі РФ. Часта гучалі фразы, што наш абаронны комплекс састарэў, нас могуць захапіць за лічаныя гадзіны, што ў нас ёсць вытворчасць зброі, але мы настолькі бедныя і няшчасныя, што не можам сабе дазволіць ёю карыстацца. І наогул, мы не здольныя да незалежнага існавання. Такія размовы ішлі ў сітуацыі, калі расійцы кантралявалі ўкраінскія палітычныя эліты, якія пасля распаду Савецкага Саюза так і не змаглі стаць незалежнымі.

Склалася даволі парадаксальная сітуацыя, калі насельніцтва ўжо стала незалежным ад рускіх міфаў і маскоўскага палону, а ўлада — яшчэ не. Чыноўнікі самага высокага ўзроўню, палітыкі, ваенныя і кіраўнікі спецслужбаў усё яшчэ былі залежныя ад Масквы, якую многія называлі сталіцай і ездзілі туды на гутаркі ў выпадку кар'ернага росту. Многія наогул былі непрыхаванымі расійскімі агентамі, якіх нямала засталося тут пасля распаду СССР. Многія з іх мелі не толькі расійскае паходжанне, але і расійскае грамадзянства. Дарэчы, у Беларусі і па гэты дзень існуе падобная сістэма.

Уласна, гэта магчыма з некалькіх прычын, але самыя галоўныя з іх — карумпаванасць нацыянальных эліт, залежнасць эканомікі ад расійскіх энергарэсурсаў і своечасова не выкананая люстрацыя чыноўнікаў. Таксама можна вылучыць шантаж настроямі прарасійскага насельніцтва на тэрыторыях амаль усіх былых савецкіх рэспублік, якое калісьці прадумана рассялілі па ўсёй тэрыторыі Саюза, а цяпер імі спрытна маніпулююць праз пракрамлёўскія СМІ і ідэалагічныя праекты накшталт «рускага свету», «настальгіі па СССР» і шэрагу штучна створаных, але прафесійна апрацаваных міфаў.

Аднак практыка сведчыць пра іншае. Грамадзяне перайгралі імперыю. Замест таго, каб узяць Украіну за лічаныя хвіліны, Пуцін аказаўся здольным толькі на акупацыю некалькіх раёнаў Данецкай і Луганскай абласцей. Бо агрэсар спадзяваўся, што з-за разваленай арміі і праз адсутнасць «чыноўніцкага класа», пра які пісаў у дакладной К. Малафееў, рэакцыі на яго дзеянні не будзе. Але атрымаў моцны адпор грамадзянскай супольнасці і патрыятычна настроеных людзей. Не займаючыся палітычны-

мі гульнямі і не ўяўляючы сабе ўсю геапалітычную сітуацыю, украінцы пайшлі вызваляць і абараняць сваю краіну. Гэтага не чакаў ніхто: ні ўкраінскія, ні расійскія палітыкі, ні тым больш — тэрарысты з сепаратыстамі. Спрацаваў інстынкт самазахавання дзяржавы і нацыі, генетычная рэакцыя на наступ ворага, закладзены гістарычны досвед. Але спрацаваў ён не ў палітычнага класа, фінансавых эліт і чыноўнікаў, а ў звычайных украінцаў, якія не ўцякалі чартарамі за мяжу, не выводзілі рахункі ў афшор, не перастрахоўвалі сябе, спрабуючы дамовіцца з баевікамі. Праўда, і сярод палітыкаў і алігархаў аказаліся людзі з выразнай праўкраінскай пазіцыяй. І гэта толькі ўзмацніла хвалю патрыятызму і спрыяла веры ў правільнасць дзеянняў.

Усе дзеянні, звязаныя з процідзеяннем крамлёўскай агрэсіі, павінны быць асіметрычнымі. Гэта значыць, нельга выстаўляць супраць расійскай арміі такую ж армію. Па-першае, гэта каштуе дзясяткі мільярдаў долараў, па-другое, РФ адразу ж пачне шантажаваць ядзернай зброяй. Гэтак жа нельга супрацьстаяць прапагандзе на ТБ сваёй прапагандай, як і нельга скупляць чужыя нацыянальныя эліты, імкнучыся да іх лаяльнасці нашай палітыцы.

Адказы Крамлю павінны быць больш эфектыўнымі і нечаканымі. Напрыклад, валанцёрская сетка, якая ўтварылася ў падтрымку добраахвотніцкіх батальёнаў. Ці ўласна самі добраахвотніцкія батальёны, створаныя як альтэрнатыва небаяздольнай арміі. Стварэнне незалежных медыяцэнтраў, якія будуць падтрымліваць незалежныя СМІ ў процівагу праўладнаму пулу.

Далей прывяду некалькі кейсаў, якія дапамаглі Украіне выстаяць перад расійскай акупацыяй, страціўшы значна менш, чым было запланавана Пуціным або ў цэлым магло быць страчана. Але варта памятаць, што гэта не гатовыя прыклады вырашэння любых сітуацый, а, відавочна, кірунак думкі і згаданая асіметрычнасць у процівагу агрэсіі, імперыялізму і жаданню захапіць тэрыторыі суседа.

## Рэакцыя Украіны на расійскую прапаганду

Расія актывізуе ўсе віды камунікацыі, не грэбуючы ні старымі, ні новымі формамі. Ад газет, радыё, радыёсувязі, улётак —

да прапаганды і выкліку панічных настрояў праз інтэрнэт, ТБ, распаўсюджванне бясплатных друкаваных носьбітаў і нават SMS-рассылкі. Кожная з формаў атрымала новыя і крэатыўныя інструменты прапаганды і навядзення панікі ў залежнасці ад таго, на якую мэтавую аўдыторыю накіраваны кантэнт. Аднак рэакцыя на агрэсію Пуціна на тэрыторыі Украіны была вельмі правільнай — мірны пратэст. Украінцаў не ўдалося запалохаць. Затое ў народзе шырыліся здзеклівыя лозунгі пра расійскага прэзідэнта, насмешкі, абагульняліся яго заганы і дэманстравалася яго чалавечая слабасць. Адбыўся байкот расійскіх тавараў, былі створаныя валанцёрскія сеткі і батальёны абароны, якія сталі паўнавартаснымі суб’ектамі абароны ўкраінскай незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці.

Каманды расійскіх прапагандыстаў спрабавалі зламаць гэты дух праз страшныя навіны, статыстыку па смерцях, мініраванне публічных устаноў, кінатэатраў, тэатраў і вакзалаў. Але пачуццё страху і панікі не прыходзіла. Краіна жыла ў рэжыме вайны, не адмаўляючыся ад пастаяннай працы, сям’і і насмешак з ворагаў. Сталі вельмі актуальнымі майданаўскія лозунгі кшталту «Героі не паміраюць, паміраюць ворагі». Бо імя кожнага загінулага героя ўзвышалі і шанавалі. Нярэдкімі былі выпадкі, калі маладыя людзі, якія не пайшлі на фронт, але заставаліся працаваць на сваіх месцах, бралі публічныя абавязацельствы дапамагаць сем’ям загінулых. Краіна жыла ў нябачных, але вельмі адчувальных абдымках адзін аднаго, калі дапамога і адвага сталі звычайнымі праявамі чалавечнасці.

Улічваючы гэта, прапаную пра кожны з кейсаў процідзеяння расійскай прапагандзе і вайсковай агрэсіі распавесці асобна.

## Добраахвотніцкія батальёны як своечасовая альтэрнатыва арміі

Ці не найлепшы прыклад процідзеяння расійскай гібрыднай агрэсіі паказалі нарвежскія кінематаграфісты, якія знялі выдатны палітычны, вельмі актуальны фільм «Акупаваныя». У сюжэце РФ здзяйсняе «ціхую акупацыю» мірнай Нарвегіі праз жаданне апошняй рэвалюцыйна змяніць энергетычны рынак.

Фільм, акрамя мастацкай, акцёрскай і эстэтычнай, мае вельмі вялікую асветніцкую каштоўнасць. Гэта як наглядны інструктаж. Мастацкая рэальнасць дазваляе людзям зарыентавацца і зразумець магчымыя сцэнарыі развіцця падзей. Да таго ж, дэтальна паказаныя ўнутраныя палітычныя кулуары, асаблівасці падпольнай паўстанцкай арміі, роля журналістаў, спецслужбаў і адстаўных вайскоўцаў.

На жаль, у 2014 годзе, калі Расія анексавала Крым, ніхто не раіў нам, як паступіць, і ніхто нікому не падказваў. У кіраўніцтва маладой дэмакратычнай краіны не было падобнага досведу. Украінскія палітыкі былі ў паніцы і не маглі вызначыцца паміж дзвюма процілегласцямі: асабісты рэйтынг або выратаванне краіны.

Як пасля стала вядома са стэнаграмы пасяджэння Рады нацыянальнай бяспекі і абароны, апублікаванай праз год пасля анексіі, у палітычных вярхах Украіны панаваў хаос, прасочвалася неразуменне сітуацыі. Абранага народам прэзідэнта яшчэ не было, выканаўца абавязкаў намінальна мог прымаць рашэнні, але зразумела, што не ў поўную сілу. З-за гэтага на пасяджэнне РНБА былі запрошаны і лідары Майдану, і сілавікі, і нават адстаўныя генералы. Краіна была ў пошуку рашэнняў. Але, як звычайна бывае, рашэнне прымаюць не ў кабінетах, а на вуліцы. Уласна, гэта і было прадэманстравана ў той час падзеямі Рэвалюцыі годнасці.

Перш за ўсё варта заўважыць, што ніхто — ад украінскіх грамадзян да кіраўнікоў наймацнейшых краін свету — не спадзяваўся, што Пуцін усё ж наважыцца на анексію часткі тэрыторыі і далучэнне яе да складу РФ. Ва ўсіх сітуацыя «анексіі» асацыявалася з Садамам Хусэйнам, які таксама спрабаваў захапіць у стылі мачызму частку Кувейта. І ўсе былі перакананыя ў тым, што Пуцін разумее ўвесь трагізм вынікаў такога ўчынку. Як аказалася, не разумеў.

Украінцы ўсвядомілі, што не атрымаюць ніякай дапамогі звонку для абароны Крыма. Уласная армія, якую на працягу дзясяткаў гадоў падточвала карупцыя, якую давялі да недзеяздольнасці пры кіраўніцтве расійскіх вайскоўцаў і антыдзяржаўнай палітыцы В. Януковіча, не змагла абараніць паўвостраў.

Гэта лёгка праглынулі палітыкі, але не змаглі дапусціць патрыёты. Менавіта таму, калі паўстала расійская тэрарыстычная пагроза на Данбасе, ва Украіне пачаў фармавацца дабравольніцкі рух. Спантанны, патрыятычны і ад таго не менш прафесійны. У ім аб'ядналіся адстаўныя вайскоўцы, спартсмены, футбольныя фанаты, паспяховыя бізнэсмены, грамадзяне, якія мелі праблемы з законам, міратворцы і мноства іншых сацыяльных груп, у якіх было абвостранае пачуццё справядлівасці і жаданне абараніць краіну.

Нікога з іх раней нельга было лічыць патэнцыйнай сілай для абароны дзяржавы, але ўсе разам яны надзейна спрацавалі ў патрэбны момант, стаўшы добраахвотнікамі ў наваствораных батальёнах — так званых дабрабатах. Па сутнасці, гэта была рэакцыя насельніцтва на няздольнасць арміі трымаць абарону. Ахоўная рэакцыя народнага арганізма на пагрозу адчужэння тэрыторый. Уласна, яна з'явілася праз негатыўны досвед Крыма, калі войска і палітыкі не працавалі належным чынам. Праз гэта актыўная частка насельніцтва вырашыла ўзяць сітуацыю пад свой кантроль. Людзі сталі надзейным тылам і альтэрнатывай арміі, прынялі ўдар на сябе, пакуль абноўленае ваеннае кіраўніцтва вычышчала шэрагі арміі ад рускіх агентаў і рабіла эфектыўным базавы ўзровень арміі.

У сацыяльных сетках, СМІ і на ТБ стракацелі шаўроны раней нікому невядомых арганізацый, якія на той час сталі галоўнымі абаронцамі Айчыны: «Азоў», «Данбас», «Крыўбас», «Дняпро», «Айдар», «Кіеў», «Свіцязь» і іншыя. Распаўсюджаным стала валанцёрства і пошук рэсурсаў для батальёнаў. Ахвяравалі ўсе, хто што мог. Хтосьці аддаваў старыя рэчы, хтосьці — ежу, хтосьці — транспарт, а хтосьці ішоў валанцёрам рамантаваць ваенную тэхніку. Батальёны атрымлівалі дапамогу не толькі ад украінскага народа, але і нават ад іншых краін: медыкаменты, транспарт, форму, грашовыя сродкі і таму падобнае.

Дапамагалі амаль усе — ад студэнтаў і пенсіянераў да заможных бізнэсменаў, палітыкаў і нават алігархаў, якія хацелі абараніць свае актывы ў асобна ўзятым рэгіёне. Мегапапулярным стаў лозунг «Прадаў ролс-ройс, пайшоў на фронт» Вячаслава Канстанціноўскага, што сімвалізаваў наступнае: праблема

тэрытарыяльнай цэласнасці — гэта пагроза для ўсіх сацыяльных груп. У той час, як расійская прапаганда пераконвала ў адваротным: маўляў, самыя багатыя ўцякуць, не жадаючы абараняць Украіну, якую яны быццам бы расцэньвалі толькі як спосаб нажывы. Мэсэдж крамлёўскіх медыйшчыкаў быў абвергнуты.

Украіна таксама атрымала велізарны імпульс ад актыўнага далучэння аднаго з найбагацейшых украінцаў да абароны краіны. 2 сакавіка 2014 года ўказам в. а. прэзідэнта Ігар Каламойскі быў прызначаны кіраўніком Днепрапятроўскай абласной дзяржадміністрацыі. Выконваючы свае асноўныя службовыя абавязкі губернатара, ён таксама ўдала і ўмела выкарыстаў свае актывы: тэлевізійны канал, футбольны клуб, банк і наваствораныя добраахвотніцкія батальёны «Дняпро-1» і «Дняпро-2» для абароны рэгіёну і ўсходняга фронту, не даўшы магчымасці ворагу захапіць адзін з самых магутных прамысловых рэгіёнаў Украіны.

Металіст Каламойскі прапанаваў здаваць сепаратыстаў, зброю і ваенную тэхніку за ўзнагароджанне — за вялікія і вельмі часта нерэальныя для тэрарыстаў сродкі. Гэта нанесла ўдар па прарасійскіх эмісарах, якія за грошы агітавалі далучацца да тэрарыстычных арганізацый ДНР і ЛНР.

Улівaліся ў вызваленчую барацьбу і палітыкі. Дарэчы, адным з першых быў парламентарый Алег Ляшко, які ахвяраваў мільён са сваёй прэзідэнцкай выбарчай кампаніі ў полк «Азоў», браў удзел у вызваленні Марыупаля, выкрадаў сепаратыстаў і быў ініцыятарам стварэння шэрагу батальёнаў.

Аднак пасля было прынята ваенна-палітычнае рашэнне: батальёны павінны стаць часткай арміі, каб пазбегнуць спекуляцый і ўзмацніць ваенны патэнцыял краіны як адзінае цэлае. Армія атрымала фінансаванне, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, кансультацыі вайсковых інструктараў з Канады, краін Балтыі, Польшчы і некаторых чальцоў НАТО. Армію аснасцілі і рэфармавалі падчас ваенных дзеянняў, што значна ўмацавала вайсковую моц Украіны.

## Уздым духу праз інфармацыйныя акцыі

Ішоў трэці месяц расійскай агрэсіі ва Украіне, мабілізаваная краіна адпраўляла гуманітарную дапамогу на фронт, палітыкі вялі выбарчую кампанію, валанцёры спалі ў рэжыме адзін раз на тыдзень, а грамадзяне аддавалі апошняе, каб падтрымаць украінскі фронт. Дзіўнае адчуванне пагрозы ў мірным Кіеве не давала спакою, краіна жыла ў рэжыме вырашэння дзяржаўных пытанняў, вайны і выбараў. Людзі ганарыліся сваімі камбатамі, добраахвотнікамі і валанцёрамі, перажывалі за гераічных жаўнераў Узброеных сілаў Украіны і ўчарашніх актывістаў Майдану, якія на той час ужо былі загартаванымі байцамі на лініі фронту.

Раніцай 21 жніўня 2014 года краіну ўскалыхнула навіна: украінскі хлопец размаляваў зорку на маскоўскім хмарачосе ў колеры ўкраінскага сцяга і паспяхова вярнуўся ў Кіеў.

Учынак руфера ўскалыхнуў медыяпрастору. У тагачаснай сітуацыі вельмі важнае значэнне набываў інфармацыйны складнік. Адчувалася патрэба ў рэзанансных інфармацыйных падзеях і медыянагодах. Такой падзеяй стаў учынак актывіста Майдану і валанцёра АТА, 26-гадовага Грыгорыя, больш вядомага як Mustang Wanted, які размаляваў зорку на даху сталінскага шматпавярховіка, што на Кацельніцкай набярэжнай у самым цэнтры Масквы. Стапрацэнтная дыверсія ў тыле ворага, ідэалагічны ўдар, запал уздыму для ўсёй краіны, найбольш распаўсюджаная навіна на постсавецкай прасторы — краіна патанула ў эмоцыях. У той дзень не было іншых тэм, акрамя абмеркавання подзвігу Мустанга, яго зорка стала сімвалам дзяржавы, заззяла на мільёнах аватарак, у таймлайнах і пастах.

(*) *Я, Грыгорый (ён жа Mustang Wanted), грамадзянін Украіны... Я і ёсць тым самым чалавекам, які ў парыве шчырых патрыятычных пачуццяў забраўся на дах вышыннага дома на Кацельніцкай набярэжнай і размаляваў зорку на ёй у колеры нашага роднага ўкраінскага сцяга,* — напісаў руфер на сваёй старонцы ў Facebook.

Пасля прыезду яго сустракалі прыхільнікі, палітыкі, актывісты і проста неабыякавыя патрыёты. Міністры дарылі яму зброю, каналы — эфіры, а публіка дарыла апладысменты. Вось так, падтрымаўшы краіну ў патрэбны момант, Мустанг стаў зоркай сваёй

краіны. Тыповы прыклад героя гібрыднай вайны: упарты, шчыры, неабыякавы і патрыятычны. Ніякім чынам не карыслівы, хоць і прадаў відэа прапагандысцкаму каналу LifeNews за 5 тысяч у. а., дзякуючы чаму стаў яшчэ больш папулярным, бо грошы сабе не пакінуў, а ахвяраваў добраахвотніцкаму батальёну «Данбас». А сам далучыўся да батальёна «Азоў» і працягнуў сваё служэнне краіне ў гарачым пункце, акупаваным пуцінскімі тэрарыстамі.

У самой Маскве, ды і ў Расіі агулам, учынак Мустанга парадзіў паніку: зорку перамалявалі ў першапачатковы колер за лічаныя гадзіны, арыштавалі паўдзясятка маладых людзей, якія на той час знаходзіліся каля будынка на Кацельніцкай. Да таго ж, у Маскве пачалі затрымліваць грамадзян з украінскай сімволікай, украінскімі сцягамі і нацыянальнымі сімваламі. У прыватнасці, у жніўні арыштавалі паэта Алега Ільіна, які прыйшоў на святкаванне Дня расійскага сцяга ў галаўным уборы з жоўта-блакітным надпісам «Украіна».

Рэвалюцыя годнасці 2014 года, перамога нашых байцоў і супраціў расійскай акупацыі на Данбасе далі Украіне новых герояў: валанцёраў, добраахвотнікаў, медыкаў і журналістаў. Людзей сціплых і смелых, самаадданых і гатовых як да самаахвяравання, так і да штодзённых учынкаў і актыўнасцяў у падтрымку воінаў АТА, збору сродкаў, арганізацыі сустрэч на вакзалах салдат, якія вяртаюцца з фронту.

Напрыклад, мой добры сябар, блогер Аляксандр Барабошка-Крус, часта крэатывіць розныя інтэрнэт-акцыі, каб дапамагчы пацярпелым ад вайны, збіраючы сродкі і падаючы станоўчы прыклад іншым грамадзянам. Адной з такіх актыўнасцяў стала акцыя, калі блогер прапанаваў украінскім брэндам адзення, што ён будзе насіць іх вырабы на працягу месяца за асобную плату. Усе атрыманыя сродкі ён ахвяраваў сям'і ўкраінскага героя, які загінуў, абараняючы ўсход Украіны. Іншы выпадак, калі адзін мала вядомы ў шырокіх колах айцішнік паабяцаў у сацыяльнай сетцы, што будзе выплачваць заробак сям'і загінулага воіна ў памеры, які той атрымліваў яшчэ да пачатку вайны.

Ці яшчэ адзін выпадак, калі мой даўні і добры сябар Андрэй Лазавой, будучы ўжо вядомым палітыкам, спрабаваў у афлайне максімальна выкарыстоўваць свае магчымасці: прыцягваў біз-

нэсменаў да валанцёрства, збіраў сродкі і ахвяраваў іх асабіста, адправіў на фронт не адну машыну, баявыя камплекты і мноства медыкаментаў.

Магчыма, гэтыя прыклады адрозніваюцца ад першага маштабам, але яны зараджаюць блізкіх рабіць звычайныя справы і ўспрымаць вайну не толькі як разавы подзвіг, а хутчэй як штодзённы клопат пра краіну і суграмадзян.

## Стварэнне валанцёрскага руху

*У цёмныя часы добра відаць светлых людзей.*
*Рэмарк*

Адзін салдат сказаў, што вайна да яго прыйшла тады, калі ён забіў першага ворага. Праўда ў тым, што вайну мы бачым толькі ў тыя моманты, калі яна пачынае тычыцца нас саміх ці нашых блізкіх, а да таго моманту гэта толькі інфармацыйны шум, дрэнныя навіны, магчымае спачуванне і актыўнасць на паўсілы.

Мой сябар і аднакласнік Аляксандр Сасоўскі праявіў актыўнае жаданне абараняць Радзіму і з’явіўся ў ваенкамат адразу пасля юбілейнай 10-гадовай сустрэчы выпускнікоў у нашай роднай школе на Валыні. Спачатку была падрыхтоўка, але калі Сашко трапіў на перадавую, ён быў размеркаваны ў брыгаду, якая сутыкнулася з пэўнымі матэрыяльнымі недахопамі ў ваенным і харчовым забеспячэнні.

На шчасце, у Кіеве заўсёды было шмат валанцёраў і проста свядомых грамадзян, гатовых дапамагчы воінам на ўсходзе Украіны. Варта было проста напісаць у Facebook або патэлефанаваць з просьбай да каго-небудзь з сяброў — і адразу збіралі патрэбную суму або патрэбны набор. Тады ў горадзе была нейкая дзіўная атмасфера: сумесь страху і натхнення, уздыму. Усе хацелі быць карыснымі Айчыне, таму валанцёрская актыўнасць здавалася натуральна лёгкай. Праз сацыяльныя сеткі можна было вельмі хутка атрымаць уседарожнік для фронту або некалькі сотняў кілаграмаў ежы. Больш праблем было з дастаўкай на фронт, чым са зборам у самім Кіеве.

Так я сустрэў Сяргея Лістапада, заўзятага валанцёра і вострага на язык карыстальніка Facebook, заснавальніка і кіраўніка

фонду «Грамадзяне будучыні». Ён самааддана дапамагаў арміі, добраахвотнікам і мірнаму насельніцтву. Пасля мы пазнаёміліся з яго сябрамі і калегамі Сяргеем Маргуновым, Аляксандрам Шуляком і Наталляй Мешчараковай. Вельмі шчырыя і самаадданыя людзі, знаёмства з якімі напаўняе гонарам за краіну і ўпэўненасцю ў перамозе.

Самымі актыўнымі ў валанцёрскай дзейнасці былі «Крылы Фенікса», «Валанцёрскі дэсант», «Вяртайся жывым», «Армія SOS» і «Дапамажы фронту». Валанцёры тварылі цуды, стаўшы надзейным тылавым дадаткам для войска і добраахвотніцкіх батальёнаў, спрыяючы мабілізацыі мірнага насельніцтва на збор сродкаў і ахвяраванняў. Яны працавалі настолькі самааддана і прафесійна, што гэта заўважылі не толькі вайскоўцы і насельніцтва, але і палітыкі.

Паводле тагачасных даследаванняў, украінцы хацелі, каб вобраз валанцёра быў прадстаўлены ва ўладзе. І для гэтага былі ўсе падставы, бо валанцёры ў экстрэмальны час з нічога стварылі эфектыўную сістэму. Таму і нядзіўна, што быў грамадскі запыт, а ўзровень даверу да валанцёраў быў адным з самых высокіх у краіне і саступаў толькі царкве, але дакладна апярэджваў усе наяўныя дзяржаўныя інстытуты. Таму многіх валанцёраў і добраахвотнікаў запрашалі ў палітычныя партыі на парламенцкіх і мясцовых выбарах, што стала палітычным трэндам.

Увогуле, валанцёрскі рух перыяду расійскай агрэсіі можна расцэньваць як адну з эпахальных старонак нашай гісторыі, бо ў падтрымку добраахвотніцкіх батальёнаў выступілі тысячы неабыякавых грамадзян Украіны. Яны збіралі сродкі, адшуквалі самую неабходную амуніцыю, транспарт, зброю і прадукты харчавання. Эфектыўнасць працы ўкраінскіх валанцёраў уражвае. Гэтыя людзі маглі ў сціслыя тэрміны знайсці патрэбнае абсталяванне за акіянам, сабраць грошы, дамовіцца з авіялініямі пра бясплатную дастаўку і за лічаныя гадзіны пераправіць усё на фронт.

Праца валанцёраў не была эмацыйным парывам, які скончыўся за тыдзень, месяц ці год. Большасць з іх працуе ўжо на працягу двух гадоў, некаторыя пайшлі ў войска кантрактнікамі або працягнулі сваю актыўнасць у дабрачынных фондах. Кантын-

гент валанцёраў быў вельмі разнастайным — ад офісных работнікаў, банкіраў, высокапастаўленых юрыстаў да актывістаў розных партый, НДА і проста неабыякавых людзей.

Валанцёры ў цэлым змаглі сабраць і эфектыўна выкарыстоўваць на войска некалькі соцень мільёнаў грыўняў, даючы справаздачу за кожную сабраную і выдаткаваную грыўню. Гэта не толькі стала рэальнай дапамогай вайскоўцам і добраахвотнікам у зоне антытэрарыстычнай аперацыі, але і падало прыклад дзяржаўным органам, як эфектыўна выкарыстоўваць рэсурсы. Пасля гэта паўплывала на рэфармаванне сістэмы дзяржзакупак і фарміраванне новай парадыгмы каштоўнасцяў, носьбітамі якой спрабавалі быць і самі вайскоўцы.

Калі абагульніць вобраз актыўнага ўкраінскага валанцёра, то гэта перш за ўсё паспяховы чалавек з досведам работы, часта высокааплатнай, з вышэйшай адукацыяй (часам нават за мяжой), з актыўным жаданнем дапамагчы і быць карысным.

Ва Украіне ў складзе СССР не было традыцый валанцёрства. Бо складана назваць валанцёрствам, напрыклад, суботнікі праз тое, што туды звычайна заганялі сілай. І нават патугі апошніх гадоў стварыць моцны валанцёрскі рух не мелі вынікаў. Але насуперак трагічным падзеям 2014 года валанцёры, дабрабаты сталі здабыткам нацыі. Ніхто не мог сабе ўявіць такой колькасці самаадданых грамадзян, пакуль не ўзнікла надзённай патрэбы ў іх з боку ўкраінскага насельніцтва. На шчасце для апошняга, такія людзі праявілі сябе сапраўднымі героямі, бо нішто не магло так аб’яднаць нацыю, як барацьба супраць агульнага ворага. Можна нават сказаць, што валанцёрства было складнікам феномену добраахвотніцкага руху, бо менавіта валанцёры актыўна спрыялі матэрыяльнаму забеспячэнню і падтрымцы ўкраінскай арміі.

У працэсе супрацьстаяння стала зразумела, што валанцёрства — гэта не толькі фінансавая падтрымка, гэта перш за ўсё карпатлівая праца. Бо нямала валанцёраў пакідалі сваю работу дзеля таго, каб вазіць дапамогу ў зону баявых дзеянняў, ішлі на фронт добраахвотнікамі, медыкамі, змагаліся з кантрабандай. У той жа час было і інфармацыйнае валанцёрства, хакерства і стварэнне цэлых праектаў, якія дапамагаюць у інфармацыйным супрацьстаянні ворагу.

## Хакеры і свабодныя інфармацыйныя платформы

Украіна — дзяржава, багатая на IT-спецыялістаў, якія не толькі працуюць у такіх найбуйнейшых кампаніях свету, як Google, Facebook, Uber, але і ствараюць уласныя праекты, напрыклад WhatsApp і шмат іншых. У цэлым канкурэнтаздольнасць украінскіх айцішнікаў — на высокім сусветным узроўні. І самае галоўнае — ім не адмовіш у патрыятызме. Яны не толькі валанцёраць у хакерскіх групах, але і вельмі часта ахвяруюць немалыя сродкі на войска, дапамагаюць сем'ям загінулых і фінансава дапамагаюць лячэнню параненых байцоў.

Falcons Flame, Trinity і RUH8, аб'яднаныя ў кіберальянс, і некаторыя іншыя групы неабыякавых актывістаў бяруць удзел у актыўным супрацьстаянні расійскай прапагандзе і ваеннай агрэсіі, час ад часу арганізуючы акцыі па ўзломе варожых інфармацыйных рэсурсаў, даказваючы прысутнасць і выкрываючы злачынную дзейнасць расійскіх войскаў, у прыватнасці спецназу, на акупаванай тэрыторыі Украіны. Айцішнікі апублічваюць анкеты баевікоў, якія падавалі заяўкі на сайтах непрызнаных тэрарыстычных рэспублік. Гучны прыклад — узлом сайта ці не самага галоўнага рупара расійскай прапаганды, Першага канала. Менавіта тады былі агучаны дадзеныя супрацоўнікаў і найбольш актыўных прапагандыстаў.

Міністэрства інфармацыйнай палітыкі Украіны, больш вядомае ў народзе як Мінстэць, стварыла ўласныя інфармацыйныя войскі, да якіх было вельмі многа пытанняў на пачатку іх працы. Часткова гэта было звязана з асобай міністра, набліжанага да прэзідэнта кумаўскімі сувязямі і гадамі працы на канале гаранта, часткова — з тым, што грамадства мела пэўныя сумневы, як будзе працаваць інфармацыйная армія. Аднак калі ўляглася інфармацыйная валтузня, адмысловыя войскі занялі сваё месца ў інфармацыйным процідзеянні Расіі. Цяпер яны выкрываюць фэйкі, абвяргаюць маніпуляцыі і перакладаюць медыйныя матэрыялы. Але і лідарамі ўкраінскай кіберпрасторы іх таксама назваць складана[21].

Як паказвае практыка, грамадскія сеткі і аб'яднанні валанцёраў больш дзейсныя і больш эфектыўныя, чым дзяржаўныя

[21] http://i-army.org/category/antifake/

ўтварэнні, дзякуючы матывацыі, сучаснаму менеджменту, адсутнасці руціны і іерархіі. Вынікі такой дзейнасці лепш распаўсюджваюцца ў СМІ і сацыяльных сетках, маюць лепшую падтрымку міжнароднай супольнасці і мясцовага насельніцтва.

У той жа час магчымыя розныя варыянты ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва, калі не толькі кіберактывісты, але і інфармацыйныя валанцёры могуць супрацоўнічаць з дзяржавай або грамадскімі фондамі. Гэта будзе даваць вынік у будучыні. Уласна, адным з такіх праектаў можна назваць Украінскі крызісны медыяцэнтр, створаны ў сакавіку 2014 года сумеснымі намаганнямі экспертаў-міжнароднікаў, журналістаў, медыясупольнасці і міжнароднага фонду «Адраджэнне», які аказаў значную падтрымку. Самі арганізатары на сайце цэнтра пішуць: «Задача цэнтра — падаваць сусветнай супольнасці аб'ектыўную інфармацыю пра падзеі ва Украіне, выклікі і пагрозы нацыянальнай бяспецы, пра ваенную, эканамічную, энергетычную і гуманітарную сферы». Арганізатары інфармацыйнай платформы ў кругласутачным рэжыме (24/7) даюць доступ і магчымасці СМІ з усяго свету атрымаць аб'ектыўную інфармацыю пра падзеі ва Украіне[22].

Для барацьбы супраць прапаганды вельмі важнымі з'яўляюцца наяўнасць свабодных медыя і доступ да іх не толькі высокіх службовых асоб, бізнэсменаў або лідараў грамадства, але і звычайных людзей, кожны з якіх патэнцыйна можа стаць медыяперсонай, ньюзмейкерам або відавочцам падзей. Бо падчас вайны або рэвалюцыі кожны чалавек, што знаходзіцца ў гушчы падзей, мае неймаверныя перспектывы атрымаць доступ да эксклюзіўнай інфармацыі. Таму асвятленне такога тыпу падзей павінна быць максімальна простым, незаангажаваным і адкрытым. Менавіта таму і з'явіўся ўкраінскі крызісны медыяцэнтр, які з першых дзён рэвалюцыйных падзей заняў асаблівае месца ва ўкраінскім медыяасяродку, стаў платформай для правядзення прэс-канферэнцый, месцам для важных заяў і медыяактыўнасці. Падчас вайны тут праводзіліся брыфінгі і штодзённыя справаздачы аб стане спраў, дзеяннях ворага і актыўнасці ўкраінскага войска.

---

[22] http://uacrisis.org/ru/about

## OSINT і грамадзянская медыяактыўнасць

OSINT — *open source intelligence* — разведка па адкрытых крыніцах, адна з разведвальных дысцыплін. Прадугледжвае пошук, выбар і збор інфармацыі, атрыманай з агульнадаступных крыніц, і яе аналіз. У супольнасці разведчыкаў тэрмін «адкрыты» паказвае на агульнадаступнасць крыніцы (у адрозненне ад сакрэтных крыніц і крыніц з абмежаваным выкарыстаннем), ён не звязаны з паняццямі *open source* або *public intelligence*.

Па сцверджаннях аналітыка ЦРУ Шэрмана Кента, апублікаваных у 1947 годзе, палітыкі атрымліваюць з адкрытых крыніц да 80% інфармацыі, неабходнай ім для прыняцця рашэнняў у мірны час. Пазней былы кіраўнік разведвальнага ўпраўлення Міністэрства абароны ЗША (1976–1977), генерал-лейтэнант Самуэль Вілсан адзначаў, што «90% разведвальных даных атрымліваюць з адкрытых крыніц і толькі 10% — за кошт працы агентуры».

Ад пачатку ўкраіна-расійскай вайны некалькі валанцёрскіх груп пачалі працаваць па методыцы OSINT. У прыватнасці, значных поспехаў дасягнуў сайт InformNapalm і цэнтр «Міратворац», які актыўна выкарыстоўвае гэтую разведку ў сваіх аперацыях і для напаўнення базы даных прарасійскіх тэрарыстаў[23].

Сам прынцып OSINT з'яўляецца надзвычай важным і адначасова простым метадам атрымання патрэбнай інфармацыі, што вельмі важна ў супрацьстаянні ва ўмовах гібрыднай вайны. Самае большае, чаго патрабуе OSINT, — гэта людскія выдаткі, але гэты метад можа даваць нечакана паспяховыя вынікі. Публічную разведку могуць ажыццяўляць як валанцёры маладога ўзросту з высокім узроўнем навыкаў валодання інтэрнэтам, так і дасведчаныя вайскоўцы ў адстаўцы, якім у атрыманні выніку дапамагае набыты ваенны досвед.

Упершыню з дзейнасцю OSINT я меў справу, калі рыхтаваўся да візіту ў Маскву ў 2015 годзе на канал ТВЦ для ўдзелу ў пракрамлёўскім палітычным шоу. Тады я звярнуў увагу, што вельмі вялікая колькасць патрэбнай інфармацыі ёсць на валанцёрскіх сайтах, якія праводзяць публічную разведку і збор до-

[23] https://uk.wikipedia.org/wiki/OSINT

казаў расійскай агрэсіі на тэрыторыі Украіны. Інфармацыю з іх я, уласна, і вырашыў выкарыстаць, каб сабраць максімум інфармацыі для годнага ўдзелу ў тэлеперадачы, каб процідзейнічаць магчымым інфармацыйным нападам і проста жадаючы адстаяць сваю праўкраінскую пазіцыю.

Я максімальна выкарыстаў дадзеныя з OSINT-сайтаў Inform-Napalm і «Міратворац», якія збіралі і публікавалі кантэнт з сацыяльных сетак, звесткі электронных карт, фотаздымкі расійскіх салдат на тэрыторыі Украіны.

Бандфармаванні публікавалі сэлфі на фоне расійскіх танкаў у акупаваным Данецку, хоць, паводле Мінскіх дамоўленасцей, ні РФ, ні падкантрольныя ёй тэрарысты не мелі права трымаць там такую тэхніку. Я раздрукаваў фота і таемна пранёс іх у студыю, дзе пачаў дэманстраваць ужо на камеры. Выразаць з тэлевізійнай карцінкі было б складана і спрачацца супраць прыведзеных фактаў таксама было цяжка.

Такім чынам, дзякуючы рэсурсам OSINT я змог прынамсі данесці да расійскага гледача інфармацыю аб прысутнасці расійскіх тэрміновых вайскоўцаў на Данбасе і выкарыстанні імі цяжкай тэхнікі, што з іх боку было абуральным парушэннем Мінскіх дамоўленасцей.

Гэта адзін з прыкладаў таго, як правільна выкарыстоўваць магчымасці OSINT, прымяняючы іх для шырокай аўдыторыі. Хоць звычайна рэзанансныя адкрыцці валанцёрскіх сайтаў, якія праводзяць публічную разведку і самастойна набываюць папулярнасць праз перадрукі ў СМІ і рэпосты ў сацыяльных сетках, становяцца ці не самымі галоўнымі крыніцамі інфармацыі для стужак навін і не толькі. Напрыклад, расследаванне Bellingcat у дачыненні да збітага боінга МІ17 у 2015 годзе часткова ўваходзіць у афіцыйныя справаздачы ўрадаў краін.

Пра прыклады дзейнасці сеткавых і структурных арганізацый у стылі OSINT пагаворым ніжэй.

## InformNapalm

*(*) Мы (InformNapalm) — сеткавая структура, мы змагаемся за нашу Радзіму, на нашым баку — некалькі сотняў вельмі актыўных карыстальнікаў, якія выпрацавалі свае методыкі пошуку і праверкі інфармацыі.*

*Яны дзейнічаюць супраць нас, а мы дзейнічаем супраць іх.*

*Антон Паўлушка*

Супрацьстаяць расійскай агрэсіі можна і неабходна, але рабіць гэта трэба прафесійна і пажадана на розных мовах. Каб увесь свет даведаўся праўду з аб'ектыўных крыніц, варта не толькі паказваць рэальныя факты агрэсіі акупанта, але і рабіць гэта зразумелай для сусветных СМІ мовай.

Прыкладам такога супрацьстаяння з'яўляецца ўкраінскі валанцёрскі праект InformNapalm, які існуе амаль на 30 мовах. Валанцёры сайта, у прыватнасці, тлумачаць у электроннай форме самыя простыя, але прынцыпова важныя кейсы вайскоўцам: абыходжанне са зброяй, псіхалагічная бяспека, сродкі сувязі, стаўленне да алкаголю ў франтавой і прыфрантавой зонах, аспекты адаптацыі па вяртанні дадому.

Як пішуць самі заснавальнікі праекта, InformNapalm — праект рознабаковай накіраванасці. Яго ўдзельнікі з'яўляюцца валанцёрамі, асвятляюць падзеі неаб'яўленай вайны Расіі супраць Украіны, акупацыі Крыма і тэрарыстычнай дзейнасці расійскіх спецслужбаў, а таксама дзейнасць фанатычна настроеных баевікоў тэрарыстычных арганізацый «ДНР», «ЛНР», «Наваросіі» і інш.

На валанцёрскіх пачатках у каманду InformNapalm уваходзяць былыя вайскоўцы, журналісты, аналітыкі, перакладчыкі і актывісты. У мірным жыцці мы з'яўляемся прадстаўнікамі розных прафесій, але як толькі ва Украіну прыйшла вайна, мы ўсе сталі салдатамі інфармацыйнага фронту.

Сёй-той з удзельнікаў каманды не раз праходзіў ратацыю ў зоне АТА, многія жывуць на акупаванай тэрыторыі, хтосьці жыве за мяжой і дапамагае чым можа. Мы ўсе — звычайныя людзі, якія любяць Украіну і зычаць ёй свабоды і росквіту. Менавіта ад нас з вамі, а не ад палітыкаў, чыноўнікаў і алігархаў залежыць лёс Украіны».

Што да самога сайта *informnapalm.org*, то ён прысвечаны пытанням інфармацыйнага асвятлення расійскай агрэсіі. Сайт паказвае сапраўдны твар крамлёўскага фашызму, дзейнасць яго прыхвасняў. Там з'яўляюцца ўнікальныя аналітычныя артыкулы, а таксама матэрыялы, сабраныя падчас маніторынгу адкрытых крыніц інфармацыі, паведамленні ад інсайдараў і непасрэдных удзельнікаў падзей.

«Першымі да каманды далучыліся валанцёры з Крыма і Грузіі, затым — жыхары акупаванага Данбаса, свабоднай часткі Украіны і іншых краін свету. Хтосьці ў камандзе InformNapalm амаль кругласутачна праводзіць OSINT-расследаванні, хтосьці перакладае па пяць гадзін у суткі, хтосьці рэпосціць навіны ў сацсетках. Кожны валанцёр траціць на рэсурс столькі часу і сіл, колькі лічыць патрэбным. Некаторыя OSINT-даследчыкі, залучаныя ў праект, з'яўляюцца добра вядомымі экспертамі: напрыклад, Іраклій Камахідзэ з Грузіі, Антон Паўлушка з Германіі, Аль Гры з Ізраіля і іншыя. Усе валанцёры пазнаёміліся дзякуючы інтэрнэту, які, уласна, з'яўляецца галоўнай прасторай для іх працы.

З аналізу IP-адрасоў наведвальнікаў сайта ясна, што яго чытаюць у ЗША, ва ўрадавых структурах Швецыі, Германіі, Францыі, Балгарыі, Нідэрландаў, Канады, Славакіі, Эстоніі, Грузіі, Латвіі, у структурах НАТО. Час ад часу мы знаходзім спасылкі на працу праекта і ў заходніх СМІ, у прыватнасці The Guardian, Бі-Бі-Сі і гэтак далей», — распавёў у сваім інтэрв'ю газеце «Дзень» Раман Бурко, журналіст і заснавальнік праекта[24].

Сіла такіх арганізацый — у сеткавасці і ідэйнасці. Бо людзі, якія вырашылі супрацьстаяць агрэсару, робяць гэта шчыра і адважна, выдаткоўваючы свой час і таленты значна больш эфектыўна і рэзультатыўна, чым гэта робяць наёмныя работнікі на баку агрэсара.

## Bellingcat

Сваю выдатную эфектыўнасць аналізу звестак з адкрытых крыніц прадэманстравала арганізацыя Bellingcat, створаная Эліётам

[24] http://day.kyiv.ua/uk/article/media/vvichlyva-zbroya

Гігінсам (Eliot Higgins), брытанскім блогерам і журналістам, для даследаванняў ваенных канфліктаў у Сірыі, а пасля — расследавання трагедыі збітага боінга над украінскім Данбасам.

Над праектам працуе сам Гігінс і эксперты-валанцёры, якія аналізуюць карты, відэа- і фотакантэнт, які можна знайсці ў прасторах інтэрнэту. Запуск праекта і яго дзейнасць прафінансаваны праведзенай кампаніяй па зборы сродкаў на краўдфандынгавай платформе Kickstarter, што дазваляе ўдзельнікам быць незалежнымі і займацца выключна дзейнасцю, накіраванай на дасягненне пастаўленай мэты. А таксама не абмяжоўваць сябе афіцыйнымі пратаколамі, не пераймацца дыпламатычнасцю і палітычнай мэтазгоднасцю, чаго, на жаль, сабе не могуць дазволіць урады большасці краін — удзельніц канфлікту.

«Адным з найважнейшых праектаў Bellingcat з'яўляецца даследаванне крушэння рэйса Malaysia Airlines Flight 17. Група ўстанавіла, што зенітна-ракетны комплекс «Бук», з дапамогай якога быў збіты самалёт, належаў 53-й брыгадзе арміі РФ, якая базуецца ў горадзе Курск.

31 мая 2015 года група Bellingcat апублікавала даклад аб фальсіфікацыі расійскім Міністэрствам абароны спадарожнікавых фатаграфій, на якіх зафіксавана размяшчэнне ўкраінскіх ЗРК «Бук». Bellingcat таксама ўстанавіла факты абстрэлаў украінскіх войскаў з расійскай тэрыторыі, у прыватнасці, са ствольнай і рэактыўнай артылерыі — БМ-21 "Град"», — пазначана ва ўкраінскай версіі Вікіпедыі са спасылкай на англамоўную версію[25].

Увогуле, расследаванні з адкрытых крыніц, Bellingcat у прыватнасці, стварылі прэцэдэнт у інфармацыйным супрацьстаянні двух бакоў (Захаду і Расіі, напрыклад), калі важнай крыніцай інфармацыі становяцца незалежныя журналісты, OSINT-валанцёры і выпадковыя відавочцы. Гэта, уласна, узмацняе аб'ектыўнасць асвятлення сітуацыі або канфлікту ў цэлым.

Гаворка ідзе не толькі аб інфармацыйных маніпуляцыях і прапагандзе Расіі, але і аб хлусні і замоўчванні фактаў з боку ўрадаў іншых краін, у прыватнасці Украіны. Гэта прафесійны

[25] https://uk.wikipedia.org/wiki/Еліот_Гіґґінс

погляд грамадскасці, а не аднаго з бакоў канфлікту або асобнай дзяржавы.

Спектр расследаванняў і аналізу Bellingcat не абмежаваны толькі тэмамі збітага боінга або сірыйскага канфлікту, а прадугледжвае шэраг журналісцкіх расследаванняў сусветнай тэматыкі, тым самым задаючы перспектывы для дзейнасці арганізацыі.

## Stopfake.org

Яшчэ адзін праект, які быў створаны для супрацьдзеяння расійскай прапагандзе, якая на першых этапах крамлёўскай агрэсіі распаўсюдзілася амаль на ўсю ўкраінскую медыйную прастору. Але калі папярэднія два праекты больш датычацца OSINT, то праект Stopfake — са сферы грамадзянскай журналістыкі і медыяаналізу.

Каб эфектыўна супрацьстаяць агрэсару ў інфармацыйным полі, патрэбен быў праект або, інакш кажучы, група свядомых, патрыятычных, аб'ектыўных людзей з дастатковай прафесійнай падрыхтоўкай, палітычна дасведчаных, якія змаглі б правяраць факты ў медыяпрасторы, вызначаць іх сапраўднасць і выяўляць ілжывыя, фэйкавыя навіны.

Кантэнт, які прадукуе і архівуе Stopfake, хутка становіцца карысным і патрэбным не толькі для ўкраінскіх, але і — вельмі часта — для сусветных СМІ.

«Сайт для праверкі фактаў Stopfake.org быў запушчаны 2 сакавіка 2014 года. Ініцыятарамі яго стварэння сталі выкладчыкі, выпускнікі і студэнты Магілянскай школы журналістыкі і праграмы для журналістаў і рэдактараў Digital Future of Journalism. Да праекта далучыліся журналісты, рэдактары, праграмісты, перакладчыкі — усе, каму быў неабыякавы лёс Украіны і яе народа падчас акупацыі Крыма і вайны на Данбасе.

У самым пачатку галоўнай мэтай супольнасці была праверка і абвяржэнне сфабрыкаваных фактаў, ілжывай інфармацыі ў СМІ пра тое, што адбываецца ва Украіне. З часам праект ператварыўся ў інфармацыйны хаб, дзе аналізуецца крамлёўская прапаганда ва ўсіх аспектах і праявах.

Акрамя ўплыву прапаганды на Украіну, мы таксама спрабуем даследаваць метады ўплыву на іншыя краіны і рэгіёны — ад Сірыі і Турцыі да краін Еўрапейскага саюза і былога Савецкага Саюза.

Колькасць членаў нашай каманды пастаянна расце, да нас далучаюцца медыяспецыялісты, якія правяраюць, рэдагуюць, пераводзяць і распаўсюджваюць інфармацыю на пяці мовах: рускай, англійскай, іспанскай, румынскай і балгарскай. Мы таксама пачынаем выпускаць матэрыялы на французскай, італьянскай і галандскай мовах.

Наш кантэнт вы можаце праглядаць на сайце, увогуле ў інтэрнэце і на мясцовых тэлеканалах ва Украіне (канал Ukraine Today), слухаць падкасты і радыёпраграмы, а таксама звязацца з намі ў сацыяльных сетках.

Звяртаем вашу ўвагу, што праект Stopfake.org ніякім чынам не звязаны і не падтрымліваецца фінансава ўрадавымі арганізацыямі Украіны. Мы журналісцкая арганізацыя, галоўная мэта якой — верыфікацыя інфармацыі, узмацненне медыяпісьменнасці аўдыторыі і барацьба за дакладнае размежаванне паміж журналістыкай фактаў і прапагандай.

Мы дасягаем гэтага не толькі абвяржэннем асобных фэйкаў, але і праз стварэнне архіва прапаганды, аналіз гэтай інфармацыі, правядзенне трэнінгаў па верыфікацыі інфармацыі для зацікаўленых груп, праз удзел у канферэнцыях і семінарах.

Спачатку праект існаваў як валанцёрскі, потым мы працягнулі нашу дзейнасць дзякуючы краўдфандынгу — паступленням ахвяраванняў ад нашых чытачоў. Акрамя таго, наш праект у 2015 годзе фінансава падтрымалі міжнародны фонд «Адраджэнне», Нацыянальны фонд у падтрымку дэмакратыі, Міністэрства замежных спраў Чэхіі і пасольства Вялікабрытаніі ва Украіне, Sigrid Rausing Trust», — адзначаюць заснавальнікі і арганізатары медыйнага праекта.

Акрамя таго, што Stopfake выяўляе лжывыя навіны, самім прыкладам свайго існавання ён яшчэ і вядзе актыўную асветніцкую кампанію, прышчапляючы людзям навыкі выяўлення фальшывых і прапагандысцкіх навін.

Калі параўнаць украінскую аўдыторыю да пачатку канфлікту і праз два гады, то па многіх паказчыках гэта ўжо дзве роз-

ныя медыяаўдыторыі. Калі спачатку ўкраінцы былі схільныя на 100% верыць ТБ і друкаванай прэсе, то з часам пачалі правяраць факты, шукаць альтэрнатыўныя крыніцы, выяўляць паходжанне навіны і звяртаць увагу на рэпутацыю медыя. Гэта вялікае нацыянальнае дасягненне на шляху да перамогі ў гібрыднай вайне, бо медыяпісьменнасць насельніцтва ў сучасным свеце — адзін з важных кампанентаў пісьменнасці нацыі, што ўплывае на інфармацыйную бяспеку краіны ў цэлым.

Супрацьстаянне грамадскай журналістыкі машыне прапаганды, разведка з адкрытых крыніц, добраахвотніцкія батальёны супраць спецслужбаў і арміі агрэсара тэхнічна, можа, і прайгравалі, але ў іх прасочваліся доблесць, патрыятызм і адданасць справе. Бо вельмі важная акалічнасць, за што ваюе той ці іншы бок, і гэта лёгка можна высніць у эпоху інтэрнэту і свабодных медыя. Развеяўшы хлусню і прапаганду ў стылі Гебельса, якую, на жаль, да гэтага часу практыкуюць урады некаторых краін, можна сабраць войска з добраахвотнікаў і абараняць сваю дзяржаву і народ, не маючы мільярднага бюджэту. І гэта было даказана прыкладам Украіны, хоць і цаной вялікіх ахвяр. Але Украіна выстаяла, не страціла ні дзяржаўнасці, ні баявога духу.

Гэта прыклад супрацьстаяння двух розных падыходаў: вертыкальнага і гарызантальнага, дзяржаўнай машыны супраць грамадскага сектара і актыўных праслоек насельніцтва. У гэтым выпадку на агрэсара працуюць толькі тыя, хто атрымлівае заработную плату і баіцца звальнення або расстрэлу з боку сваіх кіраўнікоў. А з іншага боку, калі гаворка ідзе аб абароне роднай краіны ў выпадку знешняй агрэсіі, амаль усе становяцца салдатамі, валанцёрамі, выконваючы любую карысную для краіны працу. Бо на коне — бяспека дзяржавы і цэлага народа. Таму і самаадданасць тут на некалькі ўзроўняў вышэйшая, і салдаты не чакаюць зарплаты, а ахвяруюць апошняе на войска, зброю, дапамагаюць сем'ям загінулых пабрацімаў. І валанцёры гатовыя працаваць не пакладаючы рук, збіраючы сродкі, прадукты, шукаючы і купляючы патрэбную для салдат тэхніку, у тым ліку і ваенную.

## Тэлевізійнае супрацьстаянне

Паколькі я палітолаг па прафесіі, мне даводзіцца перыядычна даваць каментары друкаваным і інтэрнэт-медыя, выступаць на радыё і ТБ, з-за чаго ў коле маіх зносін амаль заўсёды знаходзяцца журналісты. Многія з іх пасля сталі маімі сябрамі. Некаторыя з іх робяць серыю перадач на канале ICTV з нацыянальным пакрыццём і шматмільённай аўдыторыяй: «Грамадзянская абарона» і «Антызомбі».

Сутнасць перадач у тым, што журналісты спрабуюць супрацьстаяць расійскай прапагандзе, абвяргаючы ўсе фэйкі, недакладную інфармацыю і адкрытую хлусню. Аб’ём работы немалы, але вынік уражвае. Няпоўны дзясятак самаадданых журналістаў, аператараў і рэдактараў выконвае працу, вельмі патрэбную для Украіны ў перыяд расійскай агрэсіі. Яны робяць тое, што павінна было б выконваць Міністэрства інфармацыйнай палітыкі, але, на шчасце, не выконвае, таму што тады наша палітыка нічым не адрознівалася б ад палітыкі Крамля. Тым больш журналісты робяць сваю справу ў дзясяткі разоў лепш, чым гэта маглі б рабіць чыноўнікі. Таму, уласна, канал выпускае дзве тэлеперадачы, якія з паўторамі маюць 5–6 пазіцый на тыдзень у розны час. Перадачы не толькі сталі папулярнымі ва Украіне, іх закупілі як кантэнт у некаторыя краіны Балтыі.

Аўтары пра свае праекты пішуць так: «Ваенныя і палітычныя таямніцы, якія так ці інакш датычацца Украіны, невядомыя да гэтага часу гістарычныя факты і падзеі сённяшняга дня раскрые гледачам інфармацыйна-публіцыстычная праграма «Грамадзянская абарона».

Прыхаваная вайна, таемныя агенты і тэрарыстычныя аперацыі — усё гэта адбываецца зусім побач. Эксперты праекта «Грамадзянская абарона» падзеляцца з гледачамі невядомымі вайсковымі і палітычнымі сакрэтамі, звернуць увагу на тое, над чым вы нават не задумваліся. Вайскоўцы і палітыкі, разведчыкі, супрацоўнікі спецслужбаў, навукоўцы — і гэта далёка не поўны пералік «інфарматараў» праграмы.

Сюжэты на тэмы гісторыі, ваеннай справы, найноўшых ваенных распрацовак навукі і тэхнікі, палітыкі і геапалітыкі дапамогуць гледачам знайсці адказы на ўсе надзённыя пытанні сён-

няшняга дня. Наша задача — расплюшчыць вочы грамадзянам на тое, што ад іх хаваюць, і развеяць міфы, якія навязваюць ворагі краіны».

Абедзве тэлепраграмы давалі антыпрапагандысцкі эфект, і прарасійскія крамлёўскія блогеры, боты і хейтары пачалі пагражаць экспертам у сацыяльных сетках і нават па тэлефоне, а таксама агрэсіўна каментаваць у Youtube-зваротах самі шоу. Асабіста я пачаў атрымліваць дзясяткі пагроз у расійскай сацыяльнай сетцы «Вконтакте» і на свой мабільны пасля, на мой погляд, удалых антыпрапагандысцкіх эфіраў. На іх я агучваў відавочныя факты пра лідараў баевікоў, сепаратыстаў і крамлёўскія вярхі, якія раскашуюць за кошт шараговых расіян і фінансуюць ваенныя дзеянні ва Украіне і Сірыі. Але так ці інакш, дзякуючы логіцы крамлёўскага procідзеяння, тэлеперадачы спрацавалі. Эфект і ўплыў ёсць, аўдыторыя рэагуе, выкрываючы прапагандысцкія кейсы, ваенныя злачынствы, марадзёрства і бясчынствы прарасійскіх тэрарыстаў.

Я часта пытаўся ў сябе: у чым сакрэт поспеху тэлеперадач? Чаму яны часам даюць лепшы эфект, чым журналісцкія расследаванні або класічная журналістыка? І адказ мне бачыцца такі, што шоу працуюць на патрыярхальную аўдыторыю, на электаральную масу насельніцтва, якое вагаецца і хоча ведаць толькі адзін варыянт вырашэння праблемы. З іншага боку, тэлеперадачы падаюць шмат фактаў і дэталяў, якія прапускаюць іншыя СМІ. Яны працуюць асіметрычна расійскай прапагандзе, хоць часам і карыстаюцца фарматам, папулярным на расійскім тэлебачанні. І гэта таксама дадае папулярнасці, бо ўкраінскі глядач — часты кліент расійскіх тэлеэфіраў, інтэрнэт-СМІ і сацыяльных сетак, паколькі належыць да некалі агульнай з рускімі медыяпрасторы.

Размаўляючы з калектывамі абодвух праектаў, я даведаўся шмат цікавага. Прывяду асобныя тэзісы-цытаты:

• «Грамадзянская абарона» была першай контрпрапагандысцкай праграмай ва Украіне. І гэта факт. Ідэя з’явілася пасля пачатку вайны і акупацыі тэрыторыі. Супраць нас пачалі весці інфармацыйную вайну, неабходна было неяк адказваць. У нас, у прынцыпе, усе свядомыя, многія журналісты маюць

роднасныя сувязі на ўсходзе Украіны і ў Крыме. Мы не былі абыякавымі. Нам хацелася паўплываць на сітуацыю. Вось мы і пайшлі на інфармацыйны фронт.

• Ведаем, што нават калі не на «ватнікаў», то па меншай меры на нашых байцоў гэта дзейнічае станоўча, уздымае іх дух. Многія знаёмыя з фронту тэлефануюць, кажуць, што ўсёй брыгадай глядзелі, дзесьці смяяліся, дзесьці «станавіліся відушчымі».

• Час ад часу тэлефануюць на канал, просяць злучыць з рэдакцыяй, крычаць, што мы ўсё хлусім і сумлення ў нас няма, што на Расеюшку паклёп узводзім. І гэта, уявіце, украінцы тэлефануюць. То-бок «ваты» ў нас яшчэ вельмі шмат.

• Афіцыйнай трансляцыі ў Расіі няма, але нас глядзяць на Youtube. Нават пісалі на скрыню канала нейкія гледачы з Далёкага Усходу Расіі, што добра было б паказваць расіянам рэальную сітуацыю ў краіне. У прынцыпе, разам з агрэсіўнымі каментарамі нямала і добрых.

• Нас глядзяць у розных пунктах свету, як і ў выпадку з Расіяй, праз Youtube. Дакладна ведаю, што глядзяць рускамоўныя ў Латвіі і Германіі. Часта знаёмыя з-за мяжы пішуць, што бачылі дзесьці ў сетцы праграму. Выпускі або сюжэты распаўсюджваюць у розных суполках— так інфармацыя даходзіць і за мяжу.

• Бывала, што нам тэлефанавалі знаёмыя байцы з перадавой, якія рэгулярна ўключалі «Грамадзянскую абарону» і «Антызомбі», і распавядалі, што раптоўна знікаў сігнал падчас трансляцыі праграмы.

• Шмат каментароў і пагроз у сацыяльных сетках, але яны не нацэлены на кагосьці канкрэтна. Нехта проста матам крые, нехта крычыць: «Пабойцеся Бога!» Але гэта ўсё боты, мы не рэагуем. Наадварот — іх раздражняе, значыць, добра працуем!»

## Байкатаванне тавараў і паслуг агрэсара

Эканамічнае супрацьстаянне з’яўляецца не менш важным аспектам агульнага супрацьстаяння. Хаця яно не наносіць такіх заўважных страт, як ваеннае або інфармацыйнае процідзеянне, аднак знясільвае ворага і часта адбівае жаданне далейшых агрэсіўных дзеянняў. Адным з інструментаў эканамічнага супраць-

стаяння з'яўляецца байкатаванне тавараў ворага. Гэты рычаг мае даўнюю гісторыю, бо ў мінулым яго часта выкарыстоўвалі бакі канфлікту для палітычных таргоў і з мэтай нанесці эканамічны ўдар па бізнэсе ворага і па краіне-суперніку ў цэлым.

Украіна пачала свой байкот расійскіх тавараў адразу пасля акупацыі тэрыторыі паўвострава Крым. Хоць гэтаму папярэднічала байкатаванне бізнэсу парламентарыяў і вядомых палітыкаў і бізнэсменаў ад прарасійскай Партыі рэгіёнаў, якое пачалося яшчэ ў канцы 2013 года паралельна з разгортваннем рэвалюцыйных падзей на Майдане. Неабходна было абмежаваць дзеянні кіруючай партыі, што падтрымлівала дыктатарскія амбіцыі Януковіча ў абмен на бізнэс-прэферэнцыі і магчымасць зарабляць мільённыя сродкі на дзяржаўным бюджэце. Байкатаванне тавараў Партыі рэгіёнаў стала яшчэ больш актыўным і катэгарычным пасля галасавання парламента за так званыя «дыктатарскія законы» 16 студзеня[26], накіраваныя на ўзмацненне рэжыму Януковіча і супраць мірна настроеных мітынгоўцаў.

Але, вяртаючыся да тэмы байкоту тавараў агрэсара, адзначым, што актывісты арганізавалі шэраг суполак у сацыяльных сетках, праводзілі работу ў інтэрнэце і на вуліцы, каб расійскі бізнэс паўплываў на свайго прэзідэнта і палітычную кіруючую эліту. На жаль, акрамя байкоту, акцыі процідзеяння расійскаму бізнэсу выйшлі далёка за межы мірнага пратэсту і набылі прыкметы гвалтоўнага супраціву. Ішоў другі год вайны, і на офісы расійскіх кампаній нападалі мітынгоўцы з вуліцы, разбуралі маёмасць і займаліся дробным марадзёрствам. З аднаго боку, гэта не ішло на карысць украінскаму супраціву, з другога — шмат у чым абмяжоўвала палітычныя свабоды многіх установаў і арганізацый, якія фінансаваліся РФ і дзейнічалі на тэрыторыі Украіны. Але такія гвалтоўныя акцыі былі адзінкавымі і арганізоўваліся ў асноўным пад пэўныя сімвалічныя даты.

[26] Законы 16 студзеня – шэраг законаў, накіраваных на абмежаванне канстытуцыйных свабод грамадзян, перавод дзейнасці апазіцыі ў незаконнае рэчышча і абмежаванне магчымасцяў пратэсту. За іх галасавалі з грубымі парушэннямі рэгламенту, яны так і не набылі легітымнасці. Законы, паводле задумы аўтараў, павінны былі зберагчы ад развалу пануючы рэжым Януковіча.

Байкот адчулі расійскія кампаніі і палітычнае кіраўніцтва. Бо гэта прывяло да перайменавання мабільных аператараў, куплі еўрапейскіх франшыз, да змены назваў брэндаў кампаній, якія гандлююць нафтапрадуктамі ў розніцу на тэрыторыі Украіны. Зачыняліся цэлыя сеткі расійскіх кафэ, спыняліся лаяльныя піяр-кампаніі «завуаляваных расійскіх брэндаў».

Але, на жаль, расійскі бізнэс замест таго, каб цывілізаваным і лабісцкім спосабам ціснуць на сваю ўладу, Крэмль і Пуціна, палічыў за лепшае паспрабаваць стварыць сабе ва Украіне імідж, не звязаны з расійскай агрэсіяй. Кампаніі рабілі выгляд, быццам не маюць ніякага дачынення ні да Расіі, ні да ваенных дзеянняў на ўсходзе і анексіі поўдня Украіны. Як паказала практыка, усе маніпуляцыі і спробы «замыліць вочы» грамадскасці вельмі лёгка выкрываюць журналісты і блогеры, а грошы, выдаткаваныя на рэбрэндынг, — гэта грошы на вецер.

Байкот даў свае вынікі, шэраг вядучых расійскіх кампаній правялі рэбрэндынг, думаючы, што змогуць падмануць 40 мільёнаў украінцаў. Хтосьці рабіў гэта больш спрытна, хтосьці не надта ўмела, але і ім удалося крыху знізіць актыўнасць байкоту расійскіх тавараў і з актыўнай фазы накіраваць у больш пасіўнае рэчышча.

Па падобнай схеме, але ўжо з прыцягненнем магчымасцяў парламента былі абмежаваны і расійскія серыялы, і кінапрадукцыя. Іх вытворцы не толькі зараблялі на пракаце ва Украіне, але і выконвалі моцную прапагандысцкую функцыю, за што і былі забароненыя ва ўкраінскай тэлевізійнай прасторы. З узмацненнем расійскай агрэсіі стала зразумела, што расійскі ўплыў не абмяжоўваецца толькі наяўнымі ва Украіне расійскімі банкамі, мабільнымі аператарамі, нафтавымі кампаніямі, рытэйлерамі адзення, фільмамі, навінавымі ці нават уласнымі СМІ. Расія абапіралася на прадуманую, глыбокую ідэалогію, умантаваную ва ўкраінскую свядомасць, з дапамогай якой яна навучылася ўмела маніпуляваць грамадствам. І з гэтым таксама трэба было змагацца.

## Дэкамунізацыя

*Усім нам падабаецца любавацца дзікімі драпежнымі звярамі, але не на вуліцах, а ў заапарку, з меркаванняў бяспекі.*

*З такіх жа меркаванняў з вуліц трэба прыбраць помнікі таталітарызму, якія не менш небяспечныя за драпежных звяроў.*

*Уладзімір Вятровіч*

Здабыццё незалежнасці Украінай не суправаджалася далейшымі крокамі, такімі як люстрацыя, пазбаўленне ўлады камуністычных чыноўнікаў і агентаў спецслужбаў. Не адбылася і дэкаланізацыя ад Савецкага Саюза, так званая дэкамунізацыя. Да таго ж, Украіна, як і большасць рэспублік СССР, карысталася спадчынай імперыі, інфраструктурай, рускай мовай і нават канстытуцыяй, ад якой Украіна часткова вызвалілася толькі ў 1996 годзе.

Украіне можа быць вельмі карысным досвед кейсаў і перамог у працэсе дэкамунізацыі, запазычаны з Польшчы і краін Балтыі, якія пасля разрыву сувязяў з сацлагерам увялі жорсткую нацыянальную палітыку, вяршэнства сваёй мовы, культуры і гісторыі. На жаль, нічога з гэтага не было зроблена ва Украіне ў перыяд незалежнасці, з-за чаго вызваленне з-пад ідэалагічнага прыгнёту працягваецца да гэтага часу.

А наш досвед, у сваю чаргу, можа быць надзвычай важным для Беларусі, Казахстана, Арменіі і многіх іншых постсавецкіх рэспублік, у выпадку калі (ці ў той час калі) яны абяруць шлях вольнага дэмакратычнага развіцця.

Вызваленне з путаў імперыі — вельмі балючы і цяжкі працэс, нават больш складаны, чым вызваленне Іспаніі ад ідэалогіі Франка, Італіі — ад Мусаліні і нават Германіі — ад Гітлера. Бо ва ўсіх гэтых выпадках ачышчэнне адбывалася ўжо без актыўнага супрацьдзеяння з боку зруйнаванага рэжыму. У выпадку заходнееўрапейскіх краін сілы дыктатуры ўжо былі зломленыя, што давала лепшыя шанцы на ідэалагічнае ачышчэнне краіны. Чаго не скажаш пра дэкамунізацыю ва Украіне, супраць якой выступае Масква, якая яшчэ ў 1991 годзе прызнала сябе правапераемніцай Савецкага Саюза. Менавіта таму любое імкненне былых рэспуб-

лік быць ідэалагічна незалежнымі Расія ўспрымае як асабістую крыўду і публічную аплявуху. А жаданне Украіны мець уласную палітыку — як здраду былога партнёра па сацлагеры.

З іншага боку, варта прызнаць і той факт, што некаторыя ўкраінскія палітычныя партыі ўзору 2014–2016 гадоў выкарыстоўваюць працэс дэкамунізацыі толькі як магчымасць атрымаць хуткі і танны піяр, актывізаваць свайго выбаршчыка і раззлаваць прарасійскага. Гэта выгадна нацыяналістычным партыям Украіны, прарасійскім партыям і расійскім СМІ, якія штораз маюць яркую карцінку для сваіх сюжэтаў. Палітычныя ігрышчы адбываліся дзеля таго, каб атрымаць электаральныя бонусы, а не завяршыць пачатае ў 1991 годзе вызваленне ад Савецкага Саюза.

Прарасійскія партыі ва Украіне, як, у прыватнасці, і прарасійскія сепаратысцкія і тэрарыстычныя групы на акупаваных тэрыторыях Данбаса і Луганскай вобласці, не маюць уласнай ідэалогіі, з-за чаго сваёй галоўнай ідэалагічнай зброяй яны абралі «настальгію па Савецкім Саюзе». Бо, не маючы магчымасці прапанаваць якасны сацыяльна-эканамічны пакет рэформаў або сучасную праграму, усе яны спекулююць на нібыта лепшых гадах Савецкага Саюза, тагачаснай наяўнасці працоўных месцаў і таннасці пэўных тавараў.

Дэкамунізацыя павінна была б адбывацца хутка і без дадатковых палітычных адхіленняў, але ва Украіне яна набірае значныя палітычныя абароты з-за супраціву Расіі і прарасійскіх сіл. Гэта абумовіла з’яўленне альтэрнатыўнай дэкамунізацыі, або так званай мяккай культурнай дэкамунізацыі, калі замест зносу помнікаў прапануюць іх дэмантаж і перамяшчэнне ў паркі і загарадныя зоны, або так званай народнай дэкамунізацыі, калі савецкія таталітарныя сімвалы перамалёўваюцца ў патрыятычныя жоўта-блакітныя колеры і набываюць новыя значэнні.

Так званы закон аб дэкамунізацыі («Аб асуджэнні камуністычнага і нацыянал-сацыялістычнага (нацысцкага) таталітарных рэжымаў ва Украіне і забароне прапаганды іх сімволікі») падняў немалы інфармацыйны шум у расійскіх СМІ. Маўляў, Украіна адмаўляецца ад свайго мінулага, губляе гістарычныя карані. Яшчэ шмат іншых глупстваў можна было пачуць і прачытаць ва ўкраінскіх і расійскіх СМІ.

Са слоў ініцыятараў гэтага працэсу, галоўным матывам прыняцця закона было жаданне захаваць помнікі, якія маюць культурную каштоўнасць, і вычысціць краіну ад прадметаў прапаганды і ідэалагізацыі камунізму. А на пытанне, чаму так кардынальна гэта робяць, адказ можна даць просты: камунізм таксама не ўкаранялі ў белых пальчатках. Але вынішчаюць яго цывілізавана, прымаючы законы і ладзячы публічную дыскусію.

Уласна, гісторыя дэкамунізацыі пачалася пасля Рэвалюцыі годнасці, калі актыўная частка насельніцтва пачала рашуча зносіць помнікі аднаму з ідэолагаў камунізму і архітэктараў таталітарнага рэжыму — Уладзіміру Ільічу Леніну, а дакладней — Уладзіміру Ульянаву. Найбольш актыўнымі ў зносе помнікаў Леніну былі Хмяльніцкая і Днепрапятроўская вобласці, менш актыўнымі — усходнія рэгіёны (праз ментальныя сувязі і палітычныя погляды) і заходняя Украіна, паколькі «ленінапад» адбыўся там яшчэ ў пачатку 90-х гадоў, калі Украіна набывала незалежнасць.

Каб не падкормліваць расійскія СМІ непатрэбным кантэнтам з вуліцы і не ствараць украінцам вобраз «вандалаў», быў прыняты закон, які павінен быў легітымізаваць сам працэс дэкамунізацыі, дэсаветызацыі і дэкаланізацыі Украіны, узаконіць пазбаўленне атрыбутаў імперскага і савецкага мінулага. А мінулае было няпростым, бо ў спадчыну ад Савецкага Саюза Украіна атрымала больш за 5 тысяч помнікаў Леніну, больш было толькі ў Расіі — 6 тысяч.

Маштабы «ленінізацыі» на метр квадратны або на адну асобу ўражваюць: такіх памераў была таталітарная прапаганда. Фактычна гэта — бомба запаволенага дзеяння, якая павінна была знішчыць культурны код нацыі, забіць генетычную памяць і навязаць культ камуністычнага ідала. Па стане на сярэдзіну 2016 года ва Украіне заставалася каля 500 помнікаў Леніну, і ўсе яны павінны быць прыбраныя з публічнай прасторы, як таго патрабуе закон. І таксама трэба прыбраць з публічнай прасторы ўсе помнікі, якія, акрамя эстэтычных рысаў, маюць прапагандысцкую камуністычную нагрузку. Гэтак жа, як з Германіі зніклі помнікі фашызму, а з Іспаніі і Італіі — манументы Франка і Мусаліні.

Закон аб дэкамунізацыі абавязвае пазбавіцца ад усіх атрыбутаў камунізму — пачынаючы ад назваў гарадоў, вуліц, абласных цэнтраў і заканчваючы гандлёвымі маркамі, назвамі газет і кампаній. Згодна з законам, з 24 ліпеня 2015 года ўсе кампартыі ва Украіне не могуць быць суб’ектамі выбарчага працэсу і ўдзельнічаць у выбарах. То-бок такія партыі з’яўляюцца забароненымі.

Што самае цікавае, бізнэс, які працаваў і працуе ва Украіне, вельмі лёгка і без лішняга шуму прыняў новы закон, замяніўшы ўсе неабходныя нормы, захаваўшы каштоўнасць брэндаў. Затое прарасійскія палітычныя лідары і пракамуністычныя змагары заўсёды раздзімалі праблемы, піярыліся на гэтым і стваралі сабе палітычныя рэйтынгі. Як сцвярджае першы дырэктар Украінскага інстытута нацыянальнай памяці, украінскі даследчык вызвольнага руху Уладзімір Вятровіч, узровень адказнасці камерцыйных кампаній вышэйшы, таму што гэта можа прывесці да страт, тады як у палітыцы ўсё наадварот: страты нікога не хвалююць.

Перайменаванне горада Камсамольска на Горышныя Плаўні нямала палітыкаў лічаць поспехам, меркаванне астатніх зусім супрацьлеглае. Але пакінем палітыкаў, не ўсе ва Украіне гэта разумеюць, больш за тое, не ўсе гэта разумеюць нават у самім гарадку. З іншага боку, маладая, ліберальная, адукаваная, праўкраінская, патрыятычна настроеная частка насельніцтва натхнёна ўспрыняла ўкраінізаваную назву былога горада Камсамольска.

Брэнд горада быў створаны без прыцягнення сродкаў з бюджэту, без дарагіх маркетолагаў, брэнд-менеджараў, дызайнераў і спецыялістаў па камунікацыях. Горад атрымаў лагатып, слоган, мільённую падтрымку. Нават былі арганізаваныя першыя экскурсіі на мясцовы горна-абагачальны камбінат. Але перашкодзіла неабдуманая палітыка мясцовых уладаў, пачаліся палітычныя дыскусіі, узніклі непаразуменні. Гэта не спрыяла разумнаму выкарыстанню інфармацыйнага капіталу, які атрымаў горад дзякуючы прыняццю закона аб дэкамунізацыі. Ва Украіне прасочваецца шмат кантраверсійных элементаў, у тым ліку і палітычных. Заўсёды варта быць гатовым да рэваншу прарасійскіх сілаў, якія ганебна беглі ў Расію, пакідаючы ва

Украіне велізарныя багацці, маёмасць і наседжаныя палітычныя пасады. Папярэдняе прарасійскае пакаленне сябе канчаткова дыскрэдытавала, аддаўшы краіну на з’ядзенне акупанту.

Падчас сустрэчы з Уладзімірам Вятровічам я дапытваўся, якія ж засцерагальнікі ўмантаваныя ў закон, каб не дапусціць нівеліравання здабытых перамог і перашкодзіць адкату назад у таталітарнае мінулае. Уладзімір сцвярджае, што юрыдычнага механізму ў законе няма. Бо ў сітуацыі іншага палітычнага курсу на месцы любога закона могуць прыняць іншы. Найбольш дзейсным засцерагальнікам ён лічыць людзей, змяненне свядомасці і жаданне навесці парадак у сваім доме. Ён не верыць, што можна адкаціцца назад, бо 2/3 прапаноў перайменаваць назвы вуліц і гарадоў — гэта прапановы мясцовых суполак, што і павінна стаць галоўным засцерагальнікам. Для ўзмацнення пазіцый актыўнай часткі насельніцтва, свядомых, дасведчаных грамадзян інстытут запусціў некалькі праектаў, мэта якіх — павялічыць колькасць свядомых украінцаў, якія ў будучыні будуць абараняць дасягненні ўкраінскай дзяржаўнасці. Перш за ўсё гэта выставы, якія павінны паказаць злачынную прыроду камуністычнага рэжыму, і музеі таталітарызму, адкрытыя паркі — музеі нацысцкай і камуністычнай акупацыі, фільмы, кнігі і да таго падобнае.

Ва Украінскім інстытуце нацыянальнай памяці працуе 30 чалавек. У Польшчы ў аналагічнай установе, напрыклад, колькасць працаўнікоў перавышае 2 тысячы. Таму інстытут працуе на самаахвярнасці... 

Працэс дэкамунізацыі і дэкаланізацыі ў нас з’яўляецца дэмакратычным, у адрозненне ад насаджэння камунізму пачатку мінулага стагоддзя, калі не было такога развіцця медыя, інтэрнэту і агульначалавечай камунікацыі. Але ў той жа час гэта дае светлыя перспектывы ўмацавання нацыянальнай свядомасці, вываду чужых ідэалагічных праблем з палітычнага дыскурсу і магчымасці спрыяць працэсу стварэння дзяржавы ва Украіне. І самае галоўнае: ачышчаная нацыянальная свядомасць больш

устойлівая да замежнага інфармацыйнага і ідэалагічнага ўздзеяння і цалкам можа супрацьстаяць каланіяльнай агрэсіі ворага.

## Пра важнасць дзяржаўнай самаідэнтыфікацыі насельніцтва і мясцовых эліт

Украіне, яе сябрам і партнёрам у будучыні варта рыхтавацца не да гібрыднай або інфармацыйнай вайны, а, відавочна, да вайны ведаў і культуры. Нават паняцце «інфармацыйнай вайны» цяпер з'яўляецца тэхнічна састарэлым з прычыны хуткага і дынамічнага развіцця інфармацыйных тэхналогій. Таму больш важным з'яўляецца інвеставанне ў культуру, грамадскі сектар, развіццё грамадзянскай свядомасці. Бо з досведу супрацьстаяння Украіны бачна, што найбольшыя страты дзяржава панесла там, дзе менш за ўсё клапацілася пра культуру і патрыятызм. Часткова можна пагадзіцца з украінскімі экспертамі, што інвеставаць у гэтыя сферы было немагчыма з-за палітычных перашкод на дзяржаўным і рэгіянальным узроўнях. Але гісторыя такіх апраўданняў не ўспрыме.

Мясцовая эліта Данбаса і Луганскай вобласці замест таго, каб выхоўваць украінскага грамадзяніна, накіроўвала сродкі і інфармацыйныя рэсурсы на фармаванне лакальнай самабытнасці, асаблівага «мясцовага этнасу». Гэта дазваляла маніпуляваць насельніцтвам у палітычных інтарэсах. Як сказаў адзін данецкі алігарх пасля шэрагуператрусаў і крымінальных спраў, лепш мець 10 мільёнаў выбаршчыкаў, чым 100 найлепшых адвакатаў у свеце.

Але ўкраінскія чыноўнікі не зразумелі самага важнага, калі думалі, што сталі «мясцовымі князямі» і гуляюць ва ўласную палітычную гульню ва Украіне, маніпулюючы падкантрольным рэгіёнам і навязваючы афіцыйнаму Кіеву ўласную волю. У рэшце рэшт аказалася, што гулялі не яны, а «гулялі» іх. І рабіла гэта спрытная Масква. А набытая нерухомасць у Лондане не гарантавала абарону з боку Вялікабрытаніі. Пуцін змог выкарыстаць рэгіянальныя асаблівасці Данбаса, падсілкоўваючы тэрарызм і сепаратызм, разгарнуўшы тэатр баявых дзеянняў на ўсходзе Украіны. Акрамя таго, ён таксама меў велізарныя амбіцыі

стварыць Наваросію, у якую павінны былі б увайсці паўднёва-ўсходнія вобласці нашай дзяржавы, адкрываючы Крамлю доступ у Крым і Прыднястроўе.

Аднак нечакана для Пуціна і яго атачэння праект «Наваросія» не адбыўся па шэрагу прычын, сярод якіх — і ваеннае процідзеянне Украіны, і міжнародная рэакцыя, і непрыманне сярод насельніцтва ідэй тэрарызму і сепаратызму. Украінцы ўсведамлялі небяспеку крамлёўскай вайсковай аферы, не паддаючыся на заклікі і лозунгі.

Хоць, па логіцы Пуціна, насельніцтва Херсонскай, Мікалаеўскай, Адэскай, Запарожскай, Днепрапятроўскай, Кіравааградскай і Сумскай абласцей павінна было б перайсці на бок сепаратыстаў і агрэсараў з-за сваёй рускамоўнасці, папярэдняй падтрымкі прарасійскай Партыі рэгіёнаў і вялікай колькасці этнічных рускіх.

Праект «Наваросія», які вельмі доўга разыгрывалі ў медыя, не адбыўся. Пацярпела правал і яго скарочаная форма «паўднёвы ўсход», а імперская агрэсія абмежавалася некалькімі раёнамі Данецкай і Луганскай абласцей. Асноўных прычын было некалькі. Па-першае, рэакцыя ўкраінскіх эліт, якія вырашылі не «класці яйкі ў розныя кошыкі», а заявіць сваю патрыятычную, праўкраінскую пазіцыю. І такіх эліт было шмат, у адрозненне ад Данбаса, дзе волевыяўленне рэгіёна было абумоўлена разлікамі алігархату. Па-другое, культурная матывацыя, самаідэнтыфікацыя ўкраінцаў, якая была мацнейшай за ідэнтыфікацыю рэгіянальную. Менавіта гэта стала адной з прычын правалу планаў Крамля.

Вось чаму можна прыйсці да высновы, што менавіта свядомы, адукаваны, патрыятычны грамадзянін з'яўляецца залогам міру і бяспекі краіны, гарантыяй яе росквіту і эканамічнага росту, палітычнай стабільнасці і дзейснасці дэмакратычных інстытутаў. А ўся палітычная моц важдзізму і дыктатуры з'яўляецца эфемернай і абумоўліваецца нежаданнем грамадзян браць адказнасць у свае рукі. Яна ў канчатковым выніку прыводзіць да расчаравання, войнаў і галечы.

Будзьце свабоднымі, свядомымі і адукаванымі. І тады ніхто не зможа вас скарыць.

## Аўтарскі слоўнік

*Важным элементам гібрыднай вайны Расіі супраць Украіны была інфармацыйная кампанія, у час якой з'явілася мноства новых слоў, прафесійных інфармацыйных тэрмінаў, многія з якіх набылі новае значэнне.*

**Анексія** — слова не новае, але набыло немалую папулярнасць пасля агрэсіўнага супрацьзаконнага захопу Расіяй украінскай тэрыторыі на паўвостраве Крым.

**Антымайдан** — штучна арганізаваныя пратэсныя хвалі, мерапрыемствы і аб'яднанні грамадзян, якія супрацьстаялі дэмакратычным рэвалюцыйным сілам у 2013—2014 гадах. Вельмі часта ўдзельнікі такіх акцый атрымлівалі грошы і іншае матэрыяльнае ўзнагароджанне.

**АТА** — антытэрарыстычная аперацыя, якая стартавала з пачаткам расійскай агрэсіі на тэрыторыі Украіны ў 2014 годзе. Уведзеная як альтэрнатыва ваеннаму становішчу, якое тады было вырашана не абвяшчаць праз канстытуцыйныя нормы, якія маглі спыніць палітычныя працэсы, у прыватнасці прэзідэнцкія выбары.

**Бот** — несапраўдны інтэрнэт-карыстальнік, які каментуе палітычныя і сацыяльныя навіны, распаўсюджвае паніку ў сацыяльных сетках, у каментарах, пад рэзананснымі публікацыямі ў інтэрнэт-СМІ. Бот мае несапраўднае імя, фота і асабістыя звесткі, пазіцыя заўсёды падладжаная пад заказчыка. Адзін наёмны работнік можа кіраваць некалькімі ботамі, часам гэтая лічба дасягае некалькіх дзясяткаў.

**Ватнік** — прадстаўнік пракрамлёўскіх поглядаў, які не думаючы ўспрымае інфармацыю з падкантрольных Крамлю СМІ, верыць ва ўсе фэйкавыя навіны. Паняцце паходзіць ад назвы вопраткі, якую называюць ватоўкай (па-руску — «ватник») з-за яе напаўнення.

**Дэкамунізацыя** — адыход ад савецкай ідэалогіі шляхам выкаранення з культуры, мовы, архітэктуры і этымалогіі рудыментаў камуністычнай ідэалогіі.

**Дабрабат** — скарот ад «добраахвотніцкі батальён».

**Кібарг** — аўтарамі тэрміна ў сучасным украінскім значэнні сталі расійскія журналісты, якія спрабавалі падаць у сваіх навінах расійскай аўдыторыі, што Данецкі аэрапорт імя Пракоф’ева абараняюць нібыта не ўкраінскія салдаты і добраахвотнікі, а робаты-кібаргі. Вобраз узнік па аналогіі з галівудскім фільмам, бо, маўляў, людзі не могуць так самаадданa змагацца.

**Камбат** — камандзір ваеннага батальёна.

**Крэмль** — архітэктурнае збудаванне на цэнтральнай плошчы Масквы, якое выкарыстоўвалася як месца жыхарства і дзейнасці першых асоб дзяржавы. У перыяд незалежнай Расіі набыў адмоўнае палітычнае значэнне як месца, дзе прымаюць аўтакратычныя, злачынныя, антынародныя (у дачыненні да іншых краін) рашэнні.

**Ленінапад** — маштабная хваля зносу помнікаў У. Леніну, якая ахапіла Украіну ў канцы 2013 — пачатку 2014 года. Падчас ленінападу было знесена больш за паўтары тысячы помнікаў і створана платформа для прыняцця закона аб дэкамунізацыі.

**Медыйныя гастралёры** — прафесійныя падстаўныя персанажы, якіх выкарыстоўваюць як нібыта відавочцаў падзей, ахвяр або пацярпелых. Эмацыйна транслююць патрэбную для палітычнага заказчыка інфармацыю, чым актыўна карысталася Масква падчас расійскай агрэсіі на тэрыторыі Украіны.

**Мінстэць** — народная назва Міністэрства інфармацыйнай палітыкі, створанага спецыяльна пад сябра і партнёра прэзідэнта, былога менеджара тэлевізійнага канала прэзідэнта — Юрыя Стэця. Міністэрства было створанае для супрацьстаяння расійскай прапагандзе, але так і не змагло наладзіць нармальную працу з журналістамі і медыясупольнасцю. Вельмі часта праводзяць аналогіі з Міністэрствам праўды з кнігі Оруэла «1984».

**Сепаратыст** — асоба, якая выступае за адлучэнне зямель ад законнага дзяржаўнага ўтварэння.

**Тэмнікі** — указанні прадстаўнікоў улады сродкам масавай інфармацыі, на якія падзеі звяртаць увагу, як іх асвятляць і якія акцэнты расставіць.

**Укропы/укры** — тэрмін уведзены прарасійскімі сіламі для абазначэння ўкраінскіх салдат. Алюзія на расліну. Набыў шырокую папулярнасць сярод украінцаў. Створана аднайменная партыя.

**Фэйк** — несапраўдная навіна, створаная з мэтай палітычнай маніпуляцыі. Паходзіць ад англ. *fake* — падробка.

**Хунта** — слова, якое атрымала распаўсюджанне ў прарасійскіх СМІ, у дадзеным кантэксце азначае «ўкраінскую ўладу, абраную пасля ўцёкаў Віктара Януковіча». Паводле задумы аўтараў тэрміна, ён павінен быў выклікаць аналогіі з «крывавымі хунтамі».

**OSINT** (ад англ. *open source intelligence*) — разведка па адкрытых крыніцах. Практыкуецца валанцёрамі і цэлымі арганізацыямі з мэтай збору патрэбнай інфармацыі з ваеннай і інфармацыйнай мэтай.

**Падзяка**

Асаблівая падзяка блізкім, сябрам, калектыву аналітычнага цэнтра «Палітыка» і ўсім, хто далучыўся да стварэння кнігі.

Ігару Папову, Вадзіму Карасёву, Аляксандру Сасоўскаму, Пятру Ахоціну, Уладзіміру Краўцанюку, Аляксандру Барабашку, Victor Vella, Алегу Лясному, Дзмітрыю Левусю, Уладзіміру Цыбульку, Анастасіі Ковач-Петрушэнка, Аляксандры Сервецкай, Таццяне Грабенік, Андрэю Лазавому, Ігару Давыдзюку, Ірыне і Антону Драбовічам, Дыяне Кучар.

Асобная падзяка тым, хто пагадзіўся на інтэрв'ю і падзяліўся ўласным досведам і інфармацыяй, у прыватнасці Ігару Салаўю, Юрыю Карыну, Алесі Яхно, Марту Саоніку, Mustang Wanted, Віктару Чарнішуку, Яраславу Пешаку, Уладзіміру Вятровічу і Дзянісу Богушу.

Усім, хто пакінуў водгукі.

Калектыву выдавецтва «Смолоскіп» і ўсім неабыякавым — дзякуй.

## Пра аўтара

**Мікола Давыдзюк** — PhD, палітолаг, дырэктар аналітычнага цэнтра «Палітыка», менеджар паспяховых выбарчых і PR-кампаній, палітычны кансультант. Міжнародны назіральнік за выбарамі.

Эксперт на вядучых украінскіх і міжнародных інфармацыйных ТБ-каналах і радыё. Вядзе аўтарскія калонкі ў друкаваных і інтэрнэт-СМІ.

Чытае адкрытыя лекцыі па паліталогіі, камунікацыях і праблемах сучаснай палітыкі. Заснавальнік Форуму новых палітычных лідараў.